ЗБОРНІК ПРАЦ
ВЫПУСКНІКОЎ-ПАЛІТОЛАГАЎ ЕГУ

# ПАЛІТЫКА І ГРАМАДСТВА Ў БЕЛАРУСІ

год 2016
(выпуск 1)

Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт

Konrad Adenauer Stiftung

УДК 32(476)(082)
П 14

**Палітыка і грамадства ў Беларусі. Зборнік прац выпускнікоў-палітолагаў ЕГУ. Год 2016, выпуск 1.**

**Навуковая рада**: Андрэй Сцяпанаў, PhD; Таццяна Чуліцкая, PhD; Уладзіслаў Іваноў; Вольфганг Зэндэр, PhD
**Рэдактура і карэктура:** Надзея Шакун
**Дызайн і вёрстка:** Ігар Назаранка
**Адказная за выпуск:** Кацярына Радзько

П 14 **Палітыка і грамадства ў Беларусі. Зборнік прац выпускнікоў-палітолагаў ЕГУ.**
Год 2016, выпуск 1. / Пад рэд. Іванова У., Сцяпанава А., Чуліцкай Т. –
Вільня: ЕГУ, 2016. – 61с.

ЄHU Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт

Konrad Adenauer Stiftung

Дадзеная публікацыя з'яўляецца сумесным праектам дэпартамента сацыяльных і палітычных навук Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта і Беларускага офіса Фонда Конрада Адэнаўэра. Публікацыя ажыццёўлена пры фінансавай падтрымцы Фонда Конрада Адэнаўэра. Поўную адказнасць за факты і погляды, прадстаўленыя ў публікацыі, нясуць аўтары тэкстаў. Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт і Фонд Конрада Адэнаўэра не нясуць адказнасці ні за інфармацыю, што змяшчаецца ў гэтай публікацыі, ні за яе далейшае выкарыстанне.

УДК 32(476)(082)

ISBN 978-9955-773-93-1 (электронная версія)
ISBN 978-9955-773-94-8 (друкаваная версія)

9 789955 773948

***Прадмова*** ........................................................................................................ *3*

***Герасіменка Аляксандр***

ПАЛІТЫЧНЫ ЎДЗЕЛ І ІНТЭРНЭТ-ПЛАТФОРМЫ: ЯК НОВЫЯ КАМУНІКАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ДАПАМАГАЮЦЬ БЕЛАРУСКІМ ГРАМАДСКІМ АКТЫВІСТАМ ........................................................................ *4*

***Шапуцька Таццяна***

ПАЛІТЫЧНАЯ МІФАТВОРЧАСЦЬ У БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД 1994–2010 ГГ.: ДЫСКУРС КІРУЮЧАЙ ЭЛІТЫ ........................................ *14*

***Гайдук Вольга***

ПАЛІТЫЧНЫЯ СВЯТЫ ЯК СПОСАБ ФАРМІРАВАННЯ ЎЯЎЛЕННЯЎ АБ НАЦЫІ І ДЗЯРЖАВЕ Ў БЕЛАРУСІ, 1996–2014 ГГ. ...................................... *27*

***Масланава Дар'я***

ГРАМАДЗЯНСКАЯ І ПАЛІТЫЧНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ СТУДЭНТАЎ: АНАЛІЗ НА ПРЫКЛАДЗЕ СТУДЭНТАЎ ЕГУ ..................................................... *40*

***Марціновіч Ганна***

ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ УЗРОЎНЮ ГЕНДАРНАЙ РОЎНАСЦІ ФРАНЦЫІ, ЛІТВЫ І БЕЛАРУСІ ................................................................................... *50*

# ПРАДМОВА

З першым зборнікам прац маладых палітолагаў і паліталагіняў, якія навучаліся ў ЕГУ на праграме “Паліталогія і еўрапейскія даследаванні”, супрацоўнікі дэпартамента сацыяльных і палітычных навук разам з Фондам Конрада Адэнаўэра ажыццяўляюць даўнюю мару навукоўцаў ЕГУ і дзеляцца новымі крытычнымі даследаваннямі, якія назапасіліся ў архівах універсітэта. Вашай увазе прапануюцца даследаванні маладых спецыялістаў з галіны палітычнай сацыялогіі, палітычнай культуры і гендарнай паліталогіі, прысвечаныя Беларусі, у перапрацаванай версіі. Дзякуючы супрацы з Фондам Конрада Адэнаўэра спраўдзілася мара заўчасна сышоўшых ад нас  палітолагаў – С. Панькоўскага, С. Навумавай і В. Чарнова, а таксама тых, хто працягвае іх справу цяпер на дэпартаменце сацыяльных і палітычных навук. Мы з задавальненнем і гонарам дзелімся навуковымі здабыткамі нашага дэпартамента.

Мэтай такой супрацы з’яўляецца папулярызацыя паліталагічных даследаванняў аб Беларусі і адначасова дэмаргіналізацыя паліталогіі ЕГУ, беларускай незалежнай палітычнай навукі наогул. Тым больш, што ў ЕГУ насуперак праблемам і крызісам сфармаваўся свой акадэмічны падыход, з’явілася новае кола даследнікаў і выкладнікаў палітычнай навукі, якія, працуючы ў Вільні, маюць магчымасць заставацца крытычнымі, займацца markdown рознабаковым аналізам палітычнага і, што вельмі важна, выкладаць палітычную навуку без лішніх ідэалагізмаў.

Іншы важны вектар – гэта накіраванасць палітычнай навукі ЕГУ на беларускую тэму. Доказам гэтага якраз і з’яўляюцца прапанаваныя ў зборніку артыкулы, прысвечаныя малавядомым і часта маргінальным тэмам палітычнага ва ўмовах Беларусі.

Спадзяемся, дадзеная спроба пазнаёміць чытача з навінкамі паліталагічнай думкі Беларусі і палітычнага аналізу ператворыцца ў добрую і працяглую традыцыю.

У гэтым жаданні ЕГУ і Фонда Конрада Адэнаўэра наблізіць даследчую частку да практычнай і паспрыяць кансалідацыі і дэмакратызацыі Беларусі праз навуковы, інтэлектуальны, адкрыты да дэбатаў і роздуму канал супадаюць.

Зборнік прызначаны перадусім для еўрапейскіх і беларускіх палітыкаў, актывістаў, палітолагаў, а таксама для ўсіх тых, хто цікавіцца альтэрнатыўнай ведай аб Беларусі.

# ПАЛІТЫЧНЫ ЎДЗЕЛ І ІНТЭРНЭТ-ПЛАТФОРМЫ: ЯК НОВЫЯ КАМУНІКАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ДАПАМАГАЮЦЬ БЕЛАРУСКІМ ГРАМАДСКІМ АКТЫВІСТАМ

***Аляксандр Герасіменка*** дактарант Даследчага інстытута камунікацый і медый (CAMRI), універсітэт Уэстмінстэр (Вялікабрытанія). Атрымаў ступень магістра еўрапейскіх даследаванняў у Орхускім універсітэце (Данія) і ступень бакалаўра паліталогіі і еўрапейскіх даследаванняў у Еўрапейскім гуманітарным універсітэце (Літва). Цяпер вывучае выкарыстанне альтэрнатыўных сацыяльных медыяплатформаў грамадскімі актывістамі Усходняй Еўропы, а таксама кансультуе беларускія НДА. Сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў.

***Анатацыя.*** Артыкул грунтуецца на даследаванні практык удзелу ў палітыцы з выкарыстаннем інтэрнэт-платформаў, такіх, як сацыяльныя сеткі ці вэб-сайты, беларускімі грамадскімі і палітычнымі актывістамі. З распаўсюдам інтэрнэту пэўныя надзеі на павелічэнне магчымасцяў палітычнага ўдзелу ў Беларусі і ў іншых краінах пачалі ўскладацца на новыя сродкі камунікацыі. Сацыяльныя сеткі і іншыя падобныя платформы прыцягнулі ўвагу сваімі магчымасцямі спрыяць грамадскім кампаніям ва ўмовах абмежаваных палітычных свабод і медыясферы. Даследаванне грунтуецца на якасным кейс-вывучэнні сямі грамадскіх кампаній і ініцыятыў, якія былі праведзены ў 2011-2013 гг. у Беларусі. Дадзеныя для даследавання былі атрыманыя праз інтэрв'ю з лідарамі кампаній. З матэрыялу вынікае, што беларускія актывісты, з ліку тых, хто актыўна спрабаваў выкарыстоўваць інтэрнэт-платформы як сродкі прыцягнення грамадзян у палітыку, сапраўды пашырылі свае магчымасці. Яны дзейнічалі ў кантэксце сусветных лічбавых практык. Аднак асаблівасці беларускай палітычнай і медыйнай сістэмаў: кантроль за дзейнасцю і пераслед палітычных суб'ектаў, цэнзура ў інтэрнэце і іншыя фактары – не дазволілі інтэрнэт-актывістам з Беларусі цалкам выкарыстаць патэнцыял электронных платформаў. Акрамя гэтага, пытанні публічнай палітыкі, да якіх актывісты маглі апеляваць у Беларусі, былі абмежаваныя пэўнымі рамкамі.

***Ключавыя словы:*** *Беларусь, палітычны ўдзел, недэмакратычны рэжым, інтэрнэт, анлайн актывізм, грамадзянская супольнасць.*

## УВОДЗІНЫ

Палітыка гэтаксама, як і многія іншыя галіны жыцця, адчувае моцны ўплыў новых тэхналогій. Жазэ ван Дэйк (Jose van Dijck) і іншыя даследчыкі ў галіне сацыяльных навук нават кажуць, што цяпер мы жывем у супольнасці, якую можна акрэсліць як "грамадства платформаў" (van Dijck, Poell 2015). Інтэрнэт-платформы, як, напрыклад, Фэйсбук ці ВК, цяпер займаюць у нашым жыцці хіба не столькі ж месца, колькі іншыя папулярныя віды медыя. Платформы трансфармуюць нас, нашы грамадскія інстытуты і тое, як мы з гэтымі інстытутамі ўзаемадзейнічаем. І такія трансфармацыі адбываюцца ў самых розных галінах ад стварэння адукацыйнага кантэнту да аховы нашага здароўя і жыцця.

Таксама як і многія іншыя з'явы жыцця, інтэрнэт мае сваю гісторыю. Ван Дэйк і Поел (van Dijck, Poell 2015: 2) падзяляюць яе на два перыяды: да платформаў і пасля іх. Гэты артыкул грунтуецца на даследаванні, якое закранае перыяд 2011-2013 гадоў той час, калі Беларусь следам за ўсім светам толькі-толькі пачала ператварацца ў грамадства платформаў. Гэта пераўтварэнне суправаджалася таксама і спадзевамі на тое, што такія інструменты, як Фэйсбук, могуць прынесці значныя змены ў палітычныя працэсы. Даследчыкі і актывісты спадзяваліся, што платформы змогуць дадаць троху святла ў "цёмнае царства" палітычных магчымасцяў, якія адкрываліся перад звычайнымі грамадзянамі і палітычнымі актывістамі ў такіх недэмакратычных краінах, як Беларусь. У гэты пачатковы перыяд станаўлення грамадства платформаў у Беларусі палітычныя і грамадскія актывісты марылі калі не пра Арабскую вясну ў Беларусі, то хаця б пра магчымасць прагучаць і быць пачутымі ўладамі. Жаданне быць пачутымі тычылася самых розных тэмаў і пытанняў: ад правоў студэнтаў да цэнаў на бензін. У сваім даследаванні я паспрабаваў закрануць некалькі з гэтых тэмаў, каб зразумець, ці могуць інтэрнэт-платформы сапраўды пашырыць магчымасці для палітычнага ўдзелу ў Беларусі.

Такім чынам, аб'ектам даследавання стаў палітычны ўдзел грамадзян з выкарыстаннем інтэрнэт-платформаў ва ўмовах недэмакратычных краін на прыкладзе Беларусі. Палітычны ўдзел вызначаецца як "дзеянні грамадзян, накіраваныя на спробы ўплыву на палітыку" (Anduiza et al 2012: 5). Я разглядаў палітычны ўдзел у межах шырэйшага паняцця прыцягнення грамадзян у палітыку (political engagement). Прадметам даследавання сталі практыкі выкарыстання інтэрнэт-платформаў грамадзянамі, якія спрабуюць уплываць на палітыку ў перыяд 2011-2013 гадоў, калі інтэрнэт-платформы толькі пачалі станавіцца істотнымі інструментамі прыцягнення грамадзян у палітыку.

## КІБЕР-АПТЫМІСТЫ СУПРАЦЬ КІБЕР-ПЕСІМІСТАЎ: ХТО ПЕРАМОГ?

Дэбаты вакол таго, ці здольны інтэрнэт паўплываць хоць на што-небудзь у справе зменаў у недэмакратычных краінах, пачаліся даўно. Найбольш цікавы перыяд гэтых дэбатаў прыпаў на час паміж "Твітар-рэвалюцыяй" у Іране ў 2009 годзе (тыя пратэсты, аднак, зазналі адносна невялікі ўплыў Твітара (Morozov 2011)) і Арабскай вясной, пік якой прыйшоўся на 2011 год (Tufekci 2011). Гэтак акадэмічныя даследаванні падзяліліся на два лагеры: кібер-аптымістаў і кібер-песімістаў. Калі кібер-аптымісты шукалі і знаходзілі ў новых медыяплатформах

патэнцыял для дэмакратызацыі самых розных грамадстваў і палітычных сістэм (Shirky 2010), то песімісты адстойвалі ідэю нязначнасці ўплыву сацыяльных платформаў на палітычныя пратэсты і актывізм (Gladwell 2010; Morozov 2011).

Цяпер першапачатковыя дэбаты паміж кібер-аптымістамі і кібер-песімістамі лічацца надта спрошчанымі і агульнымі. Адносіны ж паміж палітычнымі інстытутамі, актарамі і інтэрнэт-платформамі болей складаныя, чым тое падавалася да Арабскай вясны (Fuchs 2014; Gunitsky 2015). Зараз дэбаты адносна прыцягнення грамадзян у палітыку больш засяроджаныя на дэталях удзелу. Даследчыкаў турбуюць, напрыклад, пытанні: як новыя тэхналогіі змяняюць палітычны ўдзел, ці могуць яны зрабіць закрытыя аўтарытарныя сістэмы больш адкрытымі; ці раз'ядноўваюць альбо наадварот аб'ядноўваюць яны людзей; як новыя тэхналогіі змяняюць стратэгіі і тактыкі палітычных актывістаў (Bennett and Segerberg 2013; Gunitsky 2015).

Аднак Арабская вясна не толькі прадэманстравала складанасці ў абагульненні ўплыву інтэрнэт-практык у палітыцы, але таксама і натхніла актывістаў у іншых краінах. У прыватнасці, рух Occupy быў натхнёны практыкамі акупавання грамадскіх месцаў палітычнымі актывістамі Егіпта (Bennett and Segerberg 2013). У час эканамічнага крызісу ў многіх развітых краінах свету антыэлітысцкія групы, якія былі аб'яднаныя агульным брэндам руху Occupy, арганізавалі сотні пратэстаў у самых розных гарадах Еўропы
і Амерыкі. Рух таксама даў магчымасць Бенету і Сегерберг (Bennett, Segerberg: 2013) больш уважліва прасачыць за характарыстыкамі інтэрнэт-актывізму. Актывізм, як сцвярджаюць гэтыя даследчыкі, змяніў характар таго, што раней мы называлі калектыўным дзеяннем (супольныя акцыі, пратэсты ці флэш-мобы, арганізаваныя грамадскімі рухамі). Цяпер рухі, якія могуць лёгка і спантанна ўзнікаць у інтэрнэце, не патрабуюць фармальнага сяброўства, не навязваюць адзінай ідэалогіі і ўвогуле лёгка знаходзяць супольную мову з патэнцыйнымі ўдзельнікамі гэтых рухаў. Пры гэтым самі патэнцыйныя ўдзельнікі ўсё болей карыстаюцца надзвычай персаніфікаванымі сацыяльнымі платформамі. Персаналізацыя разам з ростам магчымасцяў для спантаннага ўзнікнення розных пратэстных фармацый дазваляе казаць не пра "калектыўныя", але пра "злучаныя дзеянні" (connective actions). Злучаныя дзеянні – гэта больш просты, але пры гэтым і больш хаатычны метад уцягнення ў палітыку, паколькі яны не патрабуюць значных арганізацыйных намаганняў, а таксама абавязковага прыняцця адзінай версіі рэальнасці ўсімі ўдзельнікамі.

Гэты артыкул тычыцца найперш магчымасцяў для палітычнага ўдзелу ў Беларусі. Таму надалей я засяроджуся на гэтай краіне.

## ЛІЧБАВЫ ПАДЗЕЛ, ПАЛІТЫЧНЫ КАНТЭКСТ І МЕДЫЯСІСТЭМА БЕЛАРУСІ

Беларускую рэчаіснасць звычайна аналізаваць цяжэй хаця б праз тое, што большасць тэорый, якія імкнуцца патлумачыць сацыяльныя працэсы і маглі б быць карыснымі для аналізу Беларусі, цяпер ствараюцца і правяраюцца ў больш-менш трывалых дэмакратыях. Аднак катэгорыі, якія часта з'яўляюцца ключавымі для цікавых тэорый, часам проста неактуальныя для беларускага кантэксту. Напрыклад, вялікую ўвагу даследчыкаў дэмакратычных сістэм прыцягвалі магчымасці дэліберацыўнага ўдзелу альбо дыскусій і абмеркаванняў. Чакалася, што пашырэнне дыскусій у інтэрнэце, распаўсюд анлайн-петыцый і развіццё "электроннага ўраду"

дазволіць кожнаму грамадзяніну мець патэнцыйны ўплыў на прыняцце рашэнняў. Значыць, і грамадства стане больш дэмакратычным (Carpini et al 2004: 318; Halpern, Gibbs 2013: 1160). Аднак даследаванні, якія факусаваліся на дэліберагыўным удзеле, базаваліся на кейсах заходніх дэмакратый і звычайна тэарэтычна дапускалі тое, што дзяржава зацікаўленая ў дэмакратызацыі (Carpini et al 2004). Тое самае адбываецца і з тэорыямі пра новае "грамадства платформаў" і "лічбавы ўдзел" – большасць з іх створаныя і пратэставаныя на Захадзе.

Выхадам з гэтай сітуацыі часам можа стаць зварот да параўнаўчых даследаванняў. Так, Андуіца, Джэнсэн і Джорба (Anduiza et al 2012) па выніках даследаванняў 15 кейсаў па ўсім свеце вылучылі тры кантэкстуальныя асаблівасці, што могуць уплываць на лічбавыя практыкі ўдзелу ў палітыцы. Гэтыя асаблівасці ці пераменныя могуць быць карыснымі і для маёй спробы зразумець, як інтэрнэт уплывае на палітыку ў Беларусі. Гэта лічбавы падзел, палітычны кантэкст і стан медыясістэмы. Далей я звярнуся да гэтых пераменных, разгледзеўшы іх як у тэарэтычнай перспектыве, так і на прыкладзе Беларусі.

Пад лічбавым падзелам цяпер можна разумець розныя з'явы. У перыяд, які я разглядаю ў даследаванні, больш актуальным было разуменне лічбавага падзелу як абмежавання доступу да інтэрнэту. Іншымі словамі, даследчыкі імкнуліся прасачыць, што адбываецца ў тых грамадствах і супольнасцях, дзе адносна невялікая частка насельніцтва мае доступ у інтэрнэт. У 2013 годзе троху болей за палову насельніцтва Беларусі карысталася інтэрнэтам (International Telecommunications Union (Geneva) 2014). Гэта нагадвала ўзровень многіх краін Лацінскай Амерыкі, але дэманстравала значнае адставанне ад краін Цэнтральнай і Заходняй Еўропы.

Пад палітычным кантэкстам Андуіца, Джэнсэн і Джорба разумеюць набор фактараў. Гэта, напрыклад, абмежаванні і кантроль у інтэрнэце. Інтэрнэт-цэнзура ў Беларусі знаходзілася ў 2011-2013 гг. на высокім, але не на крытычным узроўні. Freedom House (2012) называла беларускія ўлады "ворагам інтэрнэту" ў шэрагу такіх краін, як Егіпет часоў прэзідэнта Мубарака ці Кітай. Апошняя краіна вылучалася вышэйшым за беларускі ўзроўнем кантролю за інтэрнэтам, парушэннем правоў карыстальнікаў і іншых абмежаванняў. У той жа час, нават у Кітаі ёсць нямала прыкладаў выкарыстання актывістамі інтэрнэту для палітычнага ўдзелу з розным парадкам дня (Yang 2011). Такім чынам, слабейшы кантроль за інтэрнэтам у Беларусі дазваляў спадзявацца на распаўсюд практык інтэрнэт-актывізму і лічбавага ўдзелу паводле прыкладу названых недэмакратычных краін.

І, нарэшце, трэці кампанент, што ўплывае на ўзровень палітычнага ўдзелу, – стан медыяасяродка. Калі медыясістэма не вылучаецца асаблівай незалежнасцю ад дзяржаўнага рэгулявання і адпаведных структур, давер да традыцыйных медыяканалаў – газет ці тэлебачання – можа зніжацца. Да прыкладу, такі стан медыяасяродка быў характэрны для Егіпта ці Пакістана да 2011 года (Anduiza et al. 2012: 247). У такіх выпадках узровень даверу да лічбавых каналаў атрымання інфармацыі можа расці (Anduiza et al. 2012: 247). Аднак беларуская медыясістэма знаходзілася ў спецыфічным, дэфармаваным стане. Давер беларусаў да дзяржаўных СМІ за апошнія два гады, паводле НІСЭПД, не перавышаў узроўню 39%, а пасля пратэстаў крызіснага лета 2011 года, якія былі арганізаваны праз сацыяльныя сеткі, апынуўся на мінімальным узроўні 25% (Независимый институт социально-экономических и политических исследований 2013). Адносна невысокі быў давер і да недзяржаўных медый. Іншымі словамі, медыяасяродак Беларусі, з аднаго боку, не спрыяў распаўсюду любых альтэрнатыўных да дзяржаўнага пунктаў погляду, а з іншага, захоўваў патэнцыял

для з'яўлення новых актараў. Далей я разгледжу тое, як гэтую сітуацыю паспрабавалі выкарыстаць беларускія інтэрнэт-актывісты.

## МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ

Каб прасачыць за практыкамі і стратэгіямі тых, хто спрабаваў улываць на палітычны працэс у Беларусі з выкарыстаннем інтэрнэт-платформаў, я звярнуўся да якаснага падыходу ў зборы дадзеных і зрабіў дзевяць інтэрв'ю паводле метаду напаўфармалізаванага інтэрв'ю [4]. Я апытаў сем беларускіх грамадскіх актывістаў, што з'ўляліся арганізатарамі публічных грамадскіх кампаній у інтэрнэце ў 2011-2013 гг., у межах якіх высоўваліся патрабаванні, накіраваныя на пытанні публічнай палітыкі. Таксама былі праведзены два экспертныя інтэрв'ю з прадстаўнікамі электронных платформаў, якія часта выкарыстоўваліся як сродкі мабілізацыі, распаўсюду інфармацыі і аналізу у многіх вывучаных грамадскіх кампаніях. У межах інтэрв'ю мяне найбольш цікавілі пытанні абмежавання доступу да інтэрнэту грамадзян (лічбавы падзел); палітычны кантэкст: чаканая рэакцыя палітычнай сістэмы, абмежаванні дзейнасці актывістаў у Беларусі; стан медыяасяродка: структура аўдыторыі кампаніі, ступень яе даверу да медый. Таксама былі разгледжаныя агульныя вынікі дзейнасці ініцыятывы/ кампаніі.

Выбарка кампаній і, адпаведна, іх прадстаўнікоў, ажыццяўлялася таксама праз кансультацыі з некалькімі экспертамі ў галіне з мэтай агледзець найбольш заўважныя ў публічнай прасторы кампаніі апошніх гадоў.

У выніку для аналізу былі абраныя наступныя грамадскія ініцыятывы і кампаніі:

| **Назва грамадскай ініцыятывы/ кампаніі** | **Асноўныя мэты кампаніі (што вывучалася ў межах даследавання)** | **Асноўныя вынікі** |
|---|---|---|
| Грамадская кампанія "У Беларусь і Еўропу – БЕЗ ВІЗЫ!" | Прыцягненне ўвагі грамадскасці да пытання візавага рэжыму, у якасці прамежкавай мэты – спрашчэнне працэдуры атрымання візы. | Пытанне візаў гучыць у публічным полі пастаянна, аднак значных інстытуцыйных зрухаў з боку беларускіх уладаў няма |
| Кампанія за ўнясенне зменаў у Правілы вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання грамадскай арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны" | Не прымаць распрацаваныя на той момант змены ў Правілах вядзення паляўнічай гаспадаркі; унесці ў Правілы іншыя змены (напрыклад, адмовіцца ад вызначэння "шкодныя віды", забараніць сезоннае паляванне на некаторыя віды птушак) | Міністэрствам лясной гаспадаркі распрацаваныя змены ў заканадаўстве, якія прадугледжваюць задавальненне большасці патрабаванняў петыцыі |
| Грамадская кампанія "Комплекс БДУКМ будуем сумленна і празрыста!" | Аднаўленне будавання спартовага комплексу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, забеспячэнне празрыстага выдаткавання сродкаў на будоўлю | Будова аднавілася пасля сустрэчы кіраўніцтва ВНУ з ініцыятаркай збору подпісаў, а таксама пасля звароту яе ў Камітэт дзяржаўнага кантролю. КДК і ўніверсітэт выступілі з адмысловымі заявамі |
| Група "Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі" / Рух будучыні | Мабілізацыя грамадзян, найперш моладзі, на пратэстныя дзеянні ў "новым" фармаце, разняволенне публічнай сферы, акумуляцыя пратэстных настрояў, пазней было высунута патрабаванне адстаўкі прэзідэнта Лукашэнкі | Арганізацыя найбольш значных пратэстных акцый за 2011 год і агулам пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 года. Ускосны вынік – студэнты, найбольш актыўныя ўдзельнікі акцый, атрымалі бясплатны праезд у грамадскім транспарце |

***Табліца 1. Асноўная інфармацыя пра вывучаныя грамадскія ініцыятывы/кампаніі***

| Назва грамадскай ініцыятывы/ кампаніі | Асноўныя мэты кампаніі (што вывучалася ў межах даследавання) | Асноўныя вынікі |
|---|---|---|
| Анлайн-петыцыя “Дадайце беларускую мову ў меню інфакіёскаў” | Дадаць беларускую мову ў меню банкаматаў “Беларусбанка”; у будучыні пашырыць ужыванне беларускай мовы ў іншых сферах | Некалькі сустрэчаў з кіраўніцтвамі банкаў, каля 2,5 тыс. подпісаў сабрана |
| Грамадская кампанія “Патрабуем пачаць перамовы з ЕС аб спрашчэнні візавага рэжыму!” | Ціск на Адміністрацыю Прэзідэнта з мэтай размарожвання перамоваў паміж ЕС і Беларуссю аб спрашчэнні візавага рэжыму | Сабрана каля 10 тыс. электронных подпісаў |
| Кампанія “Стоп-бензін” (2011) | Зніжэнне цэнаў на паліва | Цэны на паліва вярнуліся да дакрызіснага ўзроўню, аднак пасля паступова падвышаліся |

***Крыніцы:** аўтарскі аналіз вэб-сайтаў, іншых інфармацыйных паведамленняў кампаній.*

Усе вывучаныя ініцыятывы/кампаніі ладзіліся па-за межамі інстытуцыялізаваных палітычных актараў, хаця ў некаторых выпадках рэспандэнты былі сябрамі палітычных арганізацый, не заўсёды афіцыйна зарэгістраваных.

Вывучаныя кампаніі моцна адрозніваліся паводле пытанняў, якія ўздымаліся ў іх межах. Аднак інтэрв’ю паказалі, што, як і палітычныя актары ў іншых краінах свету, беларускія групы і актывісты, якія спрабуюць праз грамадскія кампаніі ціснуць на ўлады, выкарыстоўваюць інтэрнэт-платформы. І часам гэта выкарыстанне ў спалучэнні з іншымі фактарамі дазваляе грамадзянам паспяхова ўплываць на палітычныя рашэнні. Так, з сямі разгледжаных кампаній тры дамагліся значнага поспеху.

## АНАЛІЗ СЯМІ ВЫПАДКАЎ

Як ўжо прыгадана вышэй, умовы для распаўсюду інтэрнэт-актывізму і ўцягвання шырэйшых колаў у дзейнасць розных грамадскіх кампаній і групаў інтарэсаў у аналізаваны перыяд у Беларусі склаліся дастатковыя, але далёка не ідэальныя. З аднаго боку, тэхнічныя ўмовы дазвалялі выйсці на значную аўдыторыю праз інтэрнэт. Але з іншага боку, яшчэ далёка не ўсе патэнцыйныя ўдзельнікі кампаній і акцый маглі далучыцца да зладжаных дзеянняў, бо яны проста не мелі доступу ў інтэрнэт ці не ведалі, як скарыстацца ўсімі магчымасцямі інтэрнэт-платформаў. Гэта адзначалі амаль усе лідары вывучаных кампаній. Хаця прадстаўнікі некаторых кампаній, што звярталіся не толькі да моладзі (напрыклад, “Ахова птушак Бацькаўшчыны” і “Стоп-бензін”), лічылі працу з аўдыторыяй без доступу ў інтэрнэт натуральнай часткай кампаніі. Большасці іншых актывістаў на падобныя дзеянні проста не хапала часу.

Характэрна, што менавіта доступ да таго, што мы называем традыцыйнымі медыямі – газет, ТБ і іншых сродкаў інфармавання, – аказаўся вельмі важны для беларускіх інтэрнэт-актывістаў. Як вынікае з даследавання, большасць актывістаў бачылі Фэйсбук, ВК і іншыя платформы толькі як першы крок да таго, каб выйсці на больш “сур’ёзны” ўзровень і атрымаць магчымасць распавесці сваю версію падзей, напрыклад, газеце. Пажадана, каб газета была дзяржаўнай – большасць актывістаў лічылі ўплыў дзяржаўных медый значна

мацнейшым за незалежныя. Напрыклад, актывіст, што стварыў анлайн-петыцыю "Дадайце беларускую мову ў меню інфакіёскаў" лічыў, што "колькасць подпісаў [у петыцыі] – не самае істотнае". Ён патлумачыў, што "імкнуўся найперш дамагчыся грамадскага рэзанансу, прыцягнуць увагу СМІ, людзей і грамадскасці" [5]. Выглядае, што "СМІ" ўзніклі ў гэтым сэнсавым шэрагу не проста так. Здольнасць інтэграваць традыцыйныя медыі ва ўласную інтэрнэт-кампанію ў Беларусі можа стацца істотным чыннікам яе поспеху. Гэтая выснова супадае з вынікамі даследаванняў у іншых краінах (Rojecki, Meraz 2016).

Аднак не толькі незалежныя медыі лічыліся параўнальна менш значнымі для беларускіх інтэрнэт-актывістаў. Традыцыйныя палітычныя актары, такія, як апазіцыйныя партыі, таксама не гралі значнай ролі ў вачах актывістаў згаданых кампаній. Нават наадварот: актывісты спрабавалі адмежавацца ад іх. "Я не хачу, каб маю петыцыю асацыявалі з апазіцыяй", тлумачыў лідар грамадскай кампаніі "Патрабуем пачаць перамовы з ЕС аб спрашчэнні візавага рэжыму!". Гэтаксама характэрна, што 3 з 7 апытаных актывістаў да пачатку сваіх кампаній ніяк не праяўлялі сябе ў якасці актыўных актараў публічнай палітыкі: "Ніколі подпісы не збіраў, толькі ставіў. Я ўвогуле такі законапаслухмяны грамадзянін. Пераходжу вуліцу на зялёнае святло", – прыгадваў аўтар анлайн-петыцыі "Дадайце беларускую мову ў меню інфакіёскаў" [5].

Беларускія інтэрнэт-актывісты, якія патрапілі ў фокус гэтага даследавання, лічылі законапаслухмянымі не толькі сябе. Яны ўспрымалі дзяржаўныя органы як тыя, што з большай увагай паставяцца ад іхніх патрабаванняў, калі гэтыя патрабаванні трапяць на сталы чыноўнікаў у пэўным выглядзе, пажадана акрэсленым законам. Гэтак актывісты пачалі надаваць вялікае значэнне індывідуальным зваротам грамадзян. Яны "добра стасуюцца з адміністратыўнымі (sic.) працэдурамі ў нашай краіне", – казаў прадстаўнік "Аховы птушак Бацькаўшчыны" [2]. У тым выпадку, калі электронныя подпісы цяжка было канвертаваць у подпісы пад індывідуальнымі зваротамі, актывісты выказвалі шкадаванне ("Дадайце беларускую мову ў меню інфакіёскаў"). Аднак і такія працэдуры часам не стасуюцца з іншымі сродкамі анлайн-мабілізацыі: на звароты грамадзянаў у Міністэрства замежных справаў, якія былі ініцыяваныя кампаніяй "У Беларусь і Еўропу – БЕЗ ВІЗЫ!", афіцыйныя адказы так і не прыйшлі.

Акрамя зваротаў і петыцый, беларускія інтэрнэт-актывісты надавалі ўвагу дыскусіям на сацыяльных інтэрнэт-платформах ВК альбо Фэйсбук, а тасама імэйл-рассылкам журналістам і прыхільнікам. "Найбольш эфектыўныя тыя сродкі, якія добра стасуюцца з адміністрацыйнымі працэдурамі ў нашай краіне, бо наша краіна вельмі адміністрацыйная, таму тыя звароты, якія ідуць у плыні адміністрацыйных працэдур, могуць быць больш уплывовымі. А петыцыя – не афіцыйны зварот, гэта проста ціск на чалавека", – лічыць адзін з актывістаў [2]. Характэрна, што звароты, нават дасланыя электронна, актывісты імкнуліся раздрукаваць і занесці асабіста ва ўстанову, якой яны тычыліся. Інакш кажучы, яны не імкнуліся карыстацца заканадаўчымі магчымасцямі дасылаць грамадскія звароты праз інтэрнэт (такія звароты мусілі б быць дасланыя індывідуальна – але падобнага закліку да грамадзянаў актывісты амаль не рабілі). Такую стратэгію можна звязаць з лічбавым падзелам – адсутнасцю доступу да інтэрнэту ў значнай колькасці грамадзян. Адсутнасць доступу ці немагчымасць карыстацца платформамі актывісты ўспрымалі пераважна як нешта натуральнае. Злучаныя дзеянні ў інтэрнэце, паводле актывістаў, мусілі рана ці позна прывесці да "афлайн-дзеянняў" – нечага,

што выйшла б за межы электроннай прасторы. Нават група “Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі” ставіла перад сабой мэту “афлайн” мабілізацыі калектыўнага дзеяння на рэальных плошчах рэальных гарадоў, падмацаванага дзеяннем злучаным. Але адносная няўдача даволі ўтапічных мэтаў гэтай групы прадэманстравала адну важную асаблівасць уцягнення ў палітыку сродкамі інтэрнэт-платформаў у Беларусі: далёка не ўсе пытанні могуць быць узнятыя і тым больш прасунутыя такім чынам.

Даследаванне дэманструе, што здольнасць беларускіх грамадскіх актывістаў уплываць на публічную палітыку і рэалізоўваць у яе межах уласныя мэты, шмат у чым залежыць ад існых сацыяльных і палітычных чыннікаў і найчасцей не ўваходзіць у сферу ўплыву актывістаў. Іншымі словамі, у беларускай палітычнай сістэме існуе шэраг пытанняў ці даменаў, у межах якіх на ўладу можна ціснуць з выкарыстаннем сацыяльных платформаў. А ёсць такія пытанні, у межах якіх ціск наўрад ці нешта прынясе. Сярод першых можна адзначыць экалагічныя пытанні, пытанні, якія ўздымаюцца невялікімі групамі (напрыклад, студэнтамі канкрэтнага ўніверсітэта) і звязаныя з матэрыяльнымі выгодамі, пытанні абароны правоў спажыўцоў і іншыя. Дамены, у межах якіх пад сумнеў можа быць пастаўленая легітымнасць рэжыму альбо некаторыя асноўныя прынцыпы знешняй і ўнутранай палітыкі, наўрад ці могуць адчуць моцны ўплыў з боку групаў інтарэсаў з невялікімі рэсурсамі. Сітуацыя, такім чынам, нагадвае прыклады іншых недэмакратычных палітычных сістэм, да прыкладу, кітайскую (Anduiza et al. 2012: 249; Hague, Harrop 2008: 172).

Але ёсць і адрозненні ад іншых недэмакратычных сістэм. Напрыклад, сеціўная цэнзура як інструмент ціску на актывістаў, прынамсі ў разгледжаных выпадках, ужываецца беларускімі ўладамі не так часта. Найчасцей ціск ці абмежаванні тычыліся не сеціўнай цэнзуры, а фізічнага ўздзеяння на актывістаў.

Што да цэнзуры, то актывісты называлі такія яе праявы, як:

- спробы ўздзеяння на дыскусіі ў інтэрнэце праз абразы;
- беспадстаўныя абвінавачанні і распаўсюд фактаў, якія выстаўлялі актывістаў у негатыўным святле (т.зв. “сеціўныя тролі”);
- часовае абмежаванне доступу да пэўных сайтаў і старонак у сацыяльных сетках;
- спробы атрымання (выкрадання) доступу да старонак і сайтаў.

У некаторых выпадках (група “Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі”, кампанія “Стоп-бензін”) для таго, каб пазбегнуць пераследу ў сеціве, актывістам даводзілася прыкладаць дадатковыя намаганні і траціць рэсурсы. Аднак у большасці выпадкаў актывісты не сутыкаліся з абмежаваннямі з боку ўлады, якія б яны адзначылі як надзвычайныя.

## ВЫСНОВЫ

Даследаванне прадэманстравала, што, як і ў іншых краінах свету, беларускія актывісты, якія спрабуюць праз грамадскія кампаніі ціснуць на ўлады, могуць паспяхова карыстацца інтэрнэт-платформамі. Інтэрнэт-платформы, такія, як электронныя петыцыі, сацыяльныя медыі, вэб-сайты, сапраўды могуць пашырыць магчымасці палітычнага ўдзелу ў недэмакратычных краінах і ўцягваць у палітыку большую колькасць удзельнікаў. Актывісты нават з невялікімі рэсурсамі могуць ладзіць вялікія і заўважныя кампаніі, злучаць людзей анлайн і нават часткова дамагацца сваіх мэтаў.

Выглядае, што беларускія інтэрнэт-актывісты гэтаксама, як і іх "калегі" ад ЗША да Кітая, аказаліся здольнымі карыстацца выгодамі распаўсюду грамадства платформаў і пашыраць магчымасці для злучаных дзеянняў праз інтэрнэт. Група "Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі", таксама як і рух Occupy, натхнялася прыкладам Арабскай вясны, здолеўшы аб'яднаць праз злучанае дзеянне грамадзян з адрознымі ідэалогіямі і персанальным парадкам дня. Менш радыкальныя групы, такія, як прадстаўнікі "Аховы птушак Бацькаўшчыны", імкнуліся камунікаваць не толькі з падлучанымі да інтэрнэту карыстальнікамі, але і людзьмі з "афлайну", пры гэтым захоўваючы асноўны фокус кампаніі на інтэрнэце. Акрамя гэтага, таксама як і ў іншых краінах, традыцыйныя медыі найчасцей разглядаліся актывістамі ў якасці вельмі важнай часткі камунікацыйнай стратэгіі грамадскіх кампаній, нягледзячы на існыя абмежаванні ў медыясістэме. Гэтыя прыклады кажуць пра тое, што беларускія інтэрнэт-актывісты дзейнічаюць у кантэксце сусветных трэндаў. Аднак беларускія актывісты, што выкарыстоўваюць інтэрнэт-платформы, сутыкаюцца прыкладна з такімі ж самымі перашкодамі і выклікамі, што агулам характэрныя для недэмакратычных рэжымаў. Гэтыя перашкоды былі звязаныя з характарам беларускага палітычнага кантэксту, які праяўляўся ў адносна моцным кантролі за інтэрнэтам і ў абмежаванні дзейнасці палітычных суб'ектаў. Палітычны пераслед перацякае за актывістамі ў інтэрнэт. А традыцыйныя медыі, найперш дзяржаўныя, усё яшчэ захоўваюць значны ўплыў, што адбіваецца на магчымасцях актывістаў ахапіць шырэйшую аўдыторыю. Акрамя гэтага, інтэрнэт-цэнзура і лічбавы падзел ускладняюць доступ да інфармацыі для патэнцыйных карыстальнікаў платформаў.

Верагодна, адно з найбольш сур'ёзных абмежаванняў на дзейнасць інтэрнэт-актывістаў у Беларусі звязана з тэмамі, якія могуць уздымацца ў межах іх кампаній. Грамадскія кампаніі, што закранаюць экалагічныя пытанні ці праблемы невялікіх, менш абароненых групаў насельніцтва, могуць быць адвакатаваныя пераважна без перашкодаў і маюць шансы быць асветленымі дзяржаўнымі традыцыйнымі медыямі, а пасля нават быць вырашанымі. Але з пытаннямі, што тычацца дзяржаўнага ладу ці знешняй палітыкі, усё складаней. Некаторыя актывісты, напрыклад з кампаніі "У Беларусь і Еўропу – БЕЗ ВІЗЫ!" ці групы "Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі", спрабавалі ўздымаць падобныя пытанні, аднак поспеху яны дамагліся зусім нязначнага. Выглядае, што інтэрнэт-актывізм, які накіраваны на вырашэнне падобных пытанняў, мае менш шансаў на поспех у беларускай палітычнай сістэме.

## КРЫНІЦЫ

*1. Независимый институт социально-экономических и политических исследований (2013) Оппозиционный авитаминоз. Даступна па спасылцы: http://www.old.iiseps.org/03-13.html (Дата звароту: 15 сакавіка 2016 г.).*

*2. Anduiza E., Jensen J., Jorba L. (eds.) (2012) Digital Media and Political Engagement Worldwide: A Comparative Study. Communication, Society, and Politics, New York: Cambridge University Press.*

*3. Bennett L., Segerberg A. (2013) The Logic of Connective Action: Digital Media and the Personalization of Contentious Politics, New York, NY: Cambridge University Press.*

*4. Carpini M., Cook F., Jacob L. (2004) Public deliberation, discursive participation, and citizen engagement: A review of the empirical literature. Annual Review of Political Science, no. 7: 315-344.*

*5. Gladwell M. (2010) Small Change. The New Yorker, October 4.*

*6. Gunitsky S. (2015) Corrupting the Cyber-Commons: Social Media as a Tool of Autocratic Stability. Perspectives on Politics 13 (01): 42–54.*

*7. Freedom House (2012) Freedom on the Net 2011. A Global Assessment of Internet and Digital Media Freedom. Даступна па спасылцы: http://www.freedomhouse.org/report/freedom-net/freedom-net-2011 (Дата звароту: 15 сакавіка 2016 г.).*

*8. Fuchs C. (2014) Social Media: A Critical Introduction. SAGE Publications: London.*

*9. Hague R., Harrop M. (2008) Political Science, fifth edition. New York: Palgrave MacMillan.*

*10. Halpern D., Gibbs J. (2013) Social media as a catalyst for online deliberation? Exploring the affordances of Facebook and YouTube for political expression. Computers in Human Behavior, vol. 29: 1159–1168.*

*11. Herasimenka A. (2015) Digital activists and communication technologies during the Euromaidan protests in Ukraine, Master thesis, Aarhus: Aarhus University.*

*12. International Telecommunications Union (Geneva) (2014) Percentage of Individuals using the Internet 2000-2013. Даступна па спасылцы: https://www.google.co.uk/url?sa=t&rct=j&q=&esrc=s&source=web&cd=1&cad=rja&uact=8&ved=0ahUKEwiY1M-x78jLAhWsJJoKHTR2Bp4QFggdMAA&url=http%3A%2F%2Fwww.itu.int%2Fen%2FITU-D%2FStatistics%2FDocuments%2Fstatistics%2F2013%2FIndividuals_Internet_2000-2012.xls&usg=AFQjCNEblMHo-xiFshzx4wKHsI4WkPCosQ&sig2=WYpKG70kVrO6Ch78LGe0xA. (Дата звароту: 15 сакавіка 2016 г.).*

*13. Morozov E. (2011) The Net Delusion: The Dark Side of Internet Freedom, New York, NY: Public Affairs.*

*14. Rojecki A., Meraz S.(2016) Rumors and Factitious Informational Blends: The Role of the Web in Speculative Politics.New Media & Society 18 (1): 25–43.*

*15. Shirky C. (2010) The Political Power of Social Media. Foreign Affairs, October 12.*

*16. Tufekci Z. (2011) New Media and the People-Powered Uprisings. MIT Technology Review. August 30.*

*17. van Dijck, J. Poell T. (2015). Social Media and the Transformation of Public Space.Social Media + Society 1 (2).*

*18. Yang G. (2009) The power of the internet in China: Citizen activism online. New York: Columbia University Press.*

# ПАЛІТЫЧНАЯ МІФАТВОРЧАСЦЬ У БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД 1994-2010 ГГ.: ДЫСКУРС КІРУЮЧАЙ ЭЛІТЫ

***Таццяна Шапуцька*** выпускніца магістарскай праграмы “Публічная палітыка” і бакалаўрскай праграмы “Паліталогія і еўрапейскія даследаванні” Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта. Навуковыя інтарэсы — палітычная гісторыя Беларусі, палітычныя інстытуты Беларусі, палітычная міфатворчасць, медыя і палітычная камунікацыя. Працуе журналістам у незалежнай газеце “Новы Час”. Сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў.

***Анатацыя.*** Працэс палітычнай міфатворчасці суправаджае любую палітычную дзейнасць у незалежнасці ад таго, імкнецца актар да гэтага альбо не. Пашырэнне каналаў камунікацыі паспрыяла ўмацаванню ролі міфаў як спосабаў канструявання альбо рэканструявання сацыяльнай рэчаіснасці, інструментаў палітычнай барацьбы, у той час як дагэтуль міфы збольшага разглядаліся ў абмежаваным кантэксце сацыяльнай альбо псіхалагічнай навук. Асабліва важнае значэнне працэс палітычнай міфатворчасці займае ў недэмакратычных краінах, дзе міфы часта з’яўляюцца складнікамі ідэалагічнай барацьбы. Аб’ектам даследавання з’яўляецца працэс палітычнай міфатворчасці кіруючай эліты Беларусі ў 1994-2010 гг. Мэта даследавання — вызначыць змест і асаблівасці палітычных міфаў у перыяд 1994-2010 гг. Асноўных задач некалькі: прааналізаваць тэарэтычныя падыходы і канцэпцыі палітычнай міфатворчасці; даследаваць публічныя выступы прадстаўнікоў кіруючай эліты Беларусі; выявіць найбольш распаўсюджаныя палітычныя міфы ва ўладным дыскурсе. У працы былі выкарыстаны такія метады, як кантэнт-аналіз, структураванае інтэрв’ю ды аналіз другасных дадзеных. У выніку даследавання была зроблена выснова, што беларускія палітычныя міфы колькасна і якасна адаптуюцца да зменаў у палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферах, да трансфармацый у знешняй палітыцы дзяржавы. Сістэма палітычных міфаў Беларусі эклектычная і незавершаная, яна спалучае ў сабе сучасныя элементы і элементы савецкай мадэлі. Палітычныя міфы з’яўляюцца кан’юнктурнымі, на колькасным і якасным узроўнях адаптуюцца да трансфармацый у палітычнай і сацыяльна-эканaнамічнай сферах, да зменаў у знешнеэканамічнай палітыцы дзяржавы. Падчас аналізу было выяўлена 14 міфаў, частка з якіх прысутнічае ў публічным дыскурсе ўлады на працягу ўсяго перыяду 1994-2010 гг.: “Ворагі”, “Бацька народа”, “Нацыянальныя мовы”, “Вялікая Айчынная вайна”, “Саюз Расіі і Беларусі”. Такія міфы можна назваць дамінуючымі. Астатнія міфы, якія з’яўляюцца і знікаюць пад уплывам унутраных і знешніх чыннікаў, можна назваць кантэкстуальнымі. Асноўным публічным актарам палітычнага міфастварэння з’яўляецца беларускі прэзідэнт А.Г. Лукашэнка, выказванні якога характарызуюцца асаблівай семантычнаю афарбоўкаю. Артыкул можа быць карысны студэнтам, выкладчыкам паліталогіі, сацыялогіі, сацыяльнай псіхалогіі.

***Ключавыя словы:*** *палітычны міф, працэс міфатворчасці, кіруючая эліта, уладны дыскурс, ідэалогія.*

## УВОДЗІНЫ

Палітычная міфатворчасць з'яўляецца адной з неад'емных функцый палітычнай улады і адным з галоўных інструментаў палітыкаў, які дазваляе канструяваць, дэканструяваць і рэканструяваць сацыяльную рэальнасць; папулярызаваць ідэалогію уладароў; замацоўваць асабістую палітычную ўладу; ствараць гістарычны вобраз.

З пачатку ХХ ст., калі рэзка пашырыліся каналы распаўсюду інфармацыі, працэс стварэння палітычных міфаў пайшоў надзвычай імклівымі тэмпамі, а СМІ паступова пераўтварыліся ў пляцоўку змагання розных ідэалогій за свядомасць людзей. "Калі раней палітычныя міфы ўспрымаліся хутчэй празаічна, як фікцыі, прапаганда альбо звычайная хлусня, у апошнія некалькі гадоў яны разглядаюцца ў больш вытанчаным свеце. Яны прызнаныя ў якасці асноўных элементаў у стварэнні калектыўных ідэнтычнасцяў унутры дзяржаваў, асабліва камуністычных", — піша даследчык англійскага Універсітэта Портсмута Роберт Валінскі-Кехл (Walinski-Kiehl 2004: 43).

Слова "міф" у перакладзе са старажытнагрэчаскай мовы азначае "аповед". Доўгі час паняцце "міф" выкарыстоўвалася пераважна ў двух значэннях — міф-сакральнасць і міф-фальсіфікацыя. Гэтыя значэнні і цяпер з'яўляюцца найбольш папулярнымі разуменнямі паняцця "міф" у штодзённым жыцці. Пачынаючы з XVII ст., паняцце "міф" становіцца аб'ектам навуковых даследаванняў: шырокую вядомасць атрымалі канцэпцыі міфа Р. Барта, К. Мангейма, Г. Лебона, Х. Артэгі-і-Гасэта, К. Г. Юнга. Напрыканцы XIX ст. канцэпт "міф" пачынаюць даследаваць непасрэдна ў кантэксце палітычным.

Вывучэнне крыніц паказвае, што аб'ём тэарэтычнай інфармацыі несуадносна большы за аб'ём практычных даследаванняў, якія праводзяцца ў галіне палітычнай міфалогіі. Аналагічная сітуацыя характэрна і для Беларусі, дзе канцэпцыя дзяржаўнай ідэалогіі, а значыць, і палітычнага міфастварэння, мае асаблівае значэнне.

Дадзены артыкул — гэта спроба прааналізаваць працэс палітычнай міфатворчасці, які ажыццяўляла кіруючая эліта Беларусі ў перыяд з 1994 па 2010 гг.; выявіць асноўныя палітычныя міфы і асаблівасці палітычнага міфастварэння ў нашай краіне.

Спачатку варта звярнуцца да тэарэтычных канцэпцый.

## ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА АНАЛІЗУ «ПАЛІТЫЧНАГА МІФА»

Сярод класічных канцэпцый палітычнага міфа і міфастварэння асаблівую цікавасць уяўляюць ідэі Крыстафера Флада ды Эрнста Касірэра.

Англійскі навуковец Крыстафер Флад (Флад 2004) вызначае палітычны міф праз параўнанне з міфам сакральным. Асноўным адрозненнем сакральнага ("асвечанага") міфа ад міфа палітычнага з'яўляецца "ідэалагічнае маркіраванне" апошняга; адпаведна, нават у межах адной дзяржавы ідэалогіі, якія канфрантуюць між сабой, могуць прадукаваць супярэчлівыя палітычныя міфы наконт адных і тых жа з'яваў, працэсаў, гістарычных этапаў. Флад выказвае тры найважнейшыя ідэі: па-першае, любы тэкст палітыка міфалагічны; па-другое, палітычны міф — адна з формаў выражэння ідэалогіі, і "любы ідэалагічна маркіраваны аповед, прадстаўлены адпаведным чынам адпаведнай аўдыторыі пры адпаведных акалічнасцях",

можа стаць міфам (аднак часта міфалагізацыя палітычных выказванняў адбываецца адвольна, без жадання аўтараў). Па-трэцяе, у працэсе міфатворчасці няма анічога адмоўнага альбо экстраардынарнага; міфатворчасць, будучы неад'емным складнікам палітычнага працэсу, з'яўляецца адэкватнай практыкай палітычных актараў.

Нямецкі філосаф Эрнст Касірэр (Кассирер 2000) разглядае фарміраванне палітычных міфаў у Нямеччыне пасля Першай сусветнай вайны: цяжкае фінансавае становішча, высокі ўзровень інфляцыі і беспрацоўя, бясплённасць прававых сродкаў вырашэння праблемаў – усё гэта стварыла тую "ўрадлівую глебу, адкуль маглі ўзнікнуць і чэрпаць сілы палітычныя міфы". Касірэр прытрымліваецца распаўсюджанага меркавання пра "калектыўнае бессвядомае" ў міфах, але лічыць, што гэта тычыцца толькі міфаў, якія існавалі да пачатку XX ст. — у гэты перыяд працэс палітычнай міфатворчасці мяняецца карэнным чынам: "Новыя палітычныя міфы не ўзнікаюць спантанна, яны не з'яўляюцца дзікім плодам неўтаймоўнага ўяўлення. Наадварот, яны ўяўляюць сабой штучныя творы, створаныя ўмелымі і спрытнымі "майстрамі". Нашаму XX ст. — вялікай эпосе тэхнічнай цывілізацыі - наканавана было стварыць і новую тэхніку міфа, паколькі міфы могуць ствараццa сапраўды гэтак жа і ў адпаведнасці з тымі ж правіламі, як і любая іншая сучасная зброя, як кулямёты або самалёты".

Падобна Барту (Барт 1994), Касірэр надае ўвагу моўным трансфармацыям, якія адбыліся паралельна з фарміраваннем новых палітычных міфаў. Падзяляючы моўныя функцыі на семантычную (апісанне з'яваў) і магічную (імкненне змяніць прыроду рэчаў), ён канстатуе, што з пачатку XX ст. магічная функцыя пачала дамінаваць над семантычнай. Звыклыя словы надзяляюцца новым значэннем з мэтаю выклікаць у індывідаў пэўныя эмоцыі і заахвоціць іх на нейкія дзеянні. Палітычная міфатворчасць заўсёды падмацоўваецца рытуальнымі практыкамі, якія ўмацоўваюць эфект слова. Найбольшая колькасць аднастайных публічных рытуалаў характэрна для таталітарных дзяржаў, дзе прыватнае жыццё індывідаў мінімізавана.

Сучасныя распрацоўкі тэорыі палітычнага міфу заслугоўваюць не меншай увагі за класічныя канцэпцыі.

Навуковец Роберт Валінскі-Кехл (Walinski-Kiehl 2004) аналізуе палітычную міфалогію ў Германскай дэмакратычнай рэспубліцы (ГДР). Ён вызначае палітычныя міфы, як "спрошчаныя гістарычныя аповеды, што перадаюць інфармацыю пра паходжанне, значэнне ды палітычны лёс рэжымаў" (Walinski-Kiehl 2004:43). Па сканчэнні Другой сусветнай вайны кіраўніцтва ГДР сутыкнулася з ідэалагічнай праблемай: нядаўна пануючы ў Нямеччыне нацызм быў варожы камунізму, які мусіў стаць новай дзяржаўнай ідэалогіяй. Адзіным спосабам легітымізаваць новаўтвораную Усходненямецкую марксісцкую дзяржаву і забяспечыць яе рэвалюцыйнай спадчынай была міфалагізацыя мінулага. Камуністычныя ідэолагі сфакусаваліся на адной гістарычнай падзеі — Сялянскай вайне 1525 г., якая трактавалася як першая спроба нямецкага народа трансфармаваць грамадскі лад. Нягледзячы на тое, што сялянскі бунт скончыўся няўдала, паўстанне ГДР як самастойнай дзяржавы падавалася кіраўніцтвам краіны як рэалізацыя рэвалюцыйных ідэалаў сярэднявечных сялянаў. Паступова ГДР стала ўяўляцца як першая сацыялістычная форма на нямецкіх землях у супрацьвагу Заходняй Нямеччыне, якая падавалася як варожае, капіталістычнае, контррэвалюцыйнае ўтварэнне.

Цікавыя тэзісы датычна міфатворчасці ў перыяд самадзяржаўя ў Расіі (у прыватнасці, кіравання сям'і Раманавых) прыводзіць са спасылкай на даследаванне Рычарда Уортмана Міхаіл Далбілаў, прафесар гістарычнага дэпартамента Універсітэта штата Мэрылэнд.

Раманавы (у працы даследуюцца постаці Мікалая I і Аляксандра II) сутыкнуліся з неабходнасцю спалучыць "універсалісцкія прынцыпы шматнацыянальнай пятроўскай імперыі з новымі ідэямі нацыянальнай самабытнасці". (Dolbilov 2001: 773) Калі спачатку ў аснове імперскай міфалогіі ляжаць палітычныя і культурныя ідэалы Захаду, з цягам часу публічны дыскурс улады змяняецца ў бок агульных культурных ідыёмаў — напрыклад, вера ў Бога, падпарадкаванне, самаадмаўленне ды інш. Яскравым прыкладам палітычнага міфа, які стварылі Мікалай I і яго асяродак — гэта міф пра ўладу (адзін з самых папулярных тыпаў міфаў паводле класіфікацыі Флада): "Рашучы кіраўнік, моцны духам, узнікае амаль што з ніадкуль, цудоўным чынам з'яўляецца ў самы драматычны момант бяды і смела бярэ на сябе абавязак выкараніць беспарадак" (Dolbilov 2001:779). (Мікалай I пачаў сваё кіраванне з падаўлення паўстання дзекабрыстаў). Архетыпічнай асновай кіравання Аляксандра II быў другі міф — пра бацькоўскую любоў імператара да сваіх падданых (практычным вынікам гэтай любові стала правядзенне рэформаў і адмена прыгоннага права) і пра ўсенародную любоў да ўладара.

Зусім іншы шлях фармавання і функцыянавання палітычных міфаў апісваюць канадскія вучоныя Джасцін Мэсі і Стэфані Русэль (Massiea, Roussel 2008:67) у супольным даследаванні міфаў знешняй палітыкі Канады. Калі большасць тэарэтычных канцэпцый схіляюцца да паступовага ўзнікнення міфаў, што пасля рэалізуюцца ў палітычных практыках, то Мэсі і Русэль наадварот выводзяць фарміраванне міфаў з практычнай палітычнай дзейнасці — у прыватнасці, са знешняй палітыкі краіны. Так, неагрэсіўная знешнепалітычная дзейнасць, адсутнасць ініцыятывы ў правакаванні буйных сусветных канфліктаў, актыўны ўдзел у міратворчых місіях — усё гэта прывяло да ўзнікнення агульнага меркавання канадцаў, што іх "нацыянальны" характар схільны да практыкі міратворчай дзейнасці. Нягледзячы на тое, што Канада ўдзельнічала ў дзвюх сусветных войнах, у Карэйскай вайне (на баку ЗША), сучасны курс міжнароднай палітыкі гэтай дзяржавы прывёў да фарміравання яе станоўча-мірнага вобразу ў міжнародных стасунках і ва ўяўленні ўласных грамадзянаў.

Пры далейшым аналізе мы будзем зыходзіць з таго, што беларускія палітычныя міфы, якія прадукуюцца кіруючай элітай краіны, маюць у падмурку асноўныя пастулаты дзяржаўнай ідэалогіі, адначасова складаючы і трансфармуючы іх. Адпаведна, у разуменні палітычнага міфа будзем адштурхоўвацца ад азначэння, дадзенага Крыстаферам Фладам: "Ідэалагічна маркіраваны аповед, які прэтэндуе на статус сапраўднага ўяўлення пра падзеі мінулага, цяперашняга і будучыні, і якое ўспрымаецца сацыяльнай групай як слушнае ў асноўных рысах" (Флад 2004).

## ЗМЕСТ БЕЛАРУСКІХ ПАЛІТЫЧНЫХ МІФАЎ

Якасны кантэнт-аналіз публічных выступаў беларускіх чыноўнікаў праводзіўся на аснове матэрыялаў трох найбуйнейшых дзяржаўных агульнарэспубліканскіх газет: "СБ — Беларусь сегодня", "Рэспубліка", "Звязда" і сайтаў дзяржаўных установаў. За прыведзены шаснаццацігадовы перыяд у названых СМІ і на вэб-сайтах выйшла каля 1500 унікальных матэрыялаў, якія можна даследаваць на прадмет палітычных міфаў. Аўтарам пераважнай большасці публічных выступаў і праграмных твораў з'яўляецца А. Лукашэнка.

Колькасць матэрыялаў з публічнымі выступамі іншых прадстаўнікоў кіруючай эліты ў разы меншая. Гэта абумоўлена, па-першае, спецыфікай канфігурацыі ўлады ў Беларусі; па-другое, закрытасцю дзяржаўнай сістэмы; па-трэцяе, слабым развіццём культуры публічных

выступаў чыноўнікаў; па-чацвёртае, гістарычным перыядам; па-пятае, індывідуальнымі асаблівасцямі публічных асобаў. Напрыклад, у перыяд, калі Канстытуцыйным Судом кіраваў Рыгор Васілевіч, гэты інстытут прадукаваў значна больш публічнай інфармацыі (што зараз з'яўляецца прадметам нашага аналізу), чым у перыяд кіравання Пятра Міклашэвіча, які з'яўляецца больш закрытай для прэсы і публікі асобай.

Праведзены кантэнт-аналіз дазваляе вызначыць наступныя палітычныя міфы за 1994-2010 г. (у канцы артыкула міфы размеркаваныя ў выглядзе дыяграм паводле тыпу і перыядаў найбольшай актуалізацыі):

1. ВОРАГІ

**Сутнасць міфа:** Беларусь сутыкаецца з вялікай колькасцю ўнутраных (палітычная апазіцыя) і вонкавых (ліберальныя сілы ЗША і Еўропы) ворагаў, чыя асноўная мэта — збіць краіну з абранага ўнікальнага шляху развіцця, прывесці яе да эканамічнага разбурэння, выклікаць ідэалагічны крызіс.

**Цытаты для прыкладу** (тут і далей – цытаты падаюцца на мове арыгінала, каб адлюстраваць іх яскравую семантычную афарбоўку):

"Недавно Комитет госбезопасности, Служба безопасности разоблачили 72 организации — целую систему в нашей стране. Сотни миллионов долларов, мобильные телефоны, компьютеры, заготовленные протоколы фальсификации выборов. 19-го числа они выйдут с этими протоколами, которые сегодня уже заготовлены, объявят победителем кого-то из этих «отморозков» и скажут: «Фальсифицировала власть выборы»" [12].

"Украина формирует лагеря: мы, мол, оттуда вам подкинем революционеров. Поляки работают в западной части, в том числе и через церковь католическую, но не очень-то получается" [18].

2. БАЦЬКА НАРОДА

**Сутнасць міфа:** Прэзідэнт краіны выконвае бацькоўскую ролю ў дачыненні да грамадзянаў краіны. Першасная задача прэзідэнта – абараніць сваіх "дзяцей" ад ворагаў, аддана працаваць дзеля іх дабрабыту і рэалізацыі іх жаданняў, дапамагчы грамадзянам-"дзецям", якія не заўсёды ў стане самастойна абраць найлепшую стратэгію дзейнасці, зрабіць правільны выбар. Польская даследчыца Анна Бжазоўска (Brzozowska 2003) заўважае, што гэты міф (у яе тэрміналогіі — "Father") трактуецца як праўдзівы не толькі "прапрэзідэнцкай" часткаю грамадства, але і дэмакратычнай супольнасцю. Аднак калі першыя ўспрымаюць сябе "добрымі, але слабымі дзецьмі", што патрабуюць бяспекі і абароны ад знешніх негатыўных уздзеянняў, то другія — "дэмакраты" — адасабляюцца ад нацыі-"дзіцяці", якая паводзіць сябе дрэнна і патрабуе сур'ёзнага кантролю.

**Цытаты для прыкладу:**

"На моих плечах они [ансамбль "Песняры"] только во время перемен и выстояли" [13].

3. ПАНСЛАВІЗМ

**Сутнасць міфа:** Беларусь, Расія і Украіна складаюць адзіную ўсходнеславянскую цывілізацыю, аб'яднаныя супольнай гісторыяй, рускай (не расійскай) мовай, праваслаўнай верай. Дасягненне дабрабыту і найвышэйшага ўзроўню развіцця Беларусі магчыма толькі ў складзе ўсходнеславянскай цывілізацыі.

**Цытата для прыкладу:**

"Окунувшись в атмосферу фестиваля, отчетливо понимаешь: славянское единство

есть. Люди всем сердцем хотят жить в одной семье – мирно, дружно и благополучно. […] Именно в этом истина. Осознание глубины наших корней, непоколебимости идеалов единения дает силы продолжать движение вперед, добиваться того, чтобы стремления наших народов восторжествовали, несмотря ни на какие преграды. […] Мы просто тогда спасали самое дорогое, что было впитано нами с молоком матери, – славянское братство” [9].

4. РАСПАД СССР

**Сутнасць міфа:** Белавежскае пагадненне прывяло да велізарнай катастрофы XX ст. — распаду СССР. Гэтая падзея выклікала шэраг адмоўных наступстваў для Беларусі: глыбокі эканамічны крызіс, узнясце пазіцый нацыяналістаў, рэзкае аслабленне выканаўчай улады, крах дзяржаўнай ідэалогіі.

**Цытата для прыкладу:**

“Что касается политического аспекта, я должен абсолютно ясно сказать, что после распада СССР у нас практически не было развитых государственных институтов, того, что лежит в основе любого государства. У нас не было нормально функционирующего правительства, не было самостоятельной и независимой внешней политики, собственной денежной системы, не было своей экономической политики” [14].

5. БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

**Сутнасць міфа:** Пасля распаду СССР Беларусь здолела спрадукаваць унікальны шлях сацыяльна-палітычнага і эканамічнага развіцця краіны. Знаходзячыся паміж заходняй і ўсходняй цывілізацыямі, Беларусь стала іх аб’ядноўчым звяном. У аснове “беларускага шляху” ляжыць стабільнасць і дабрабыт краіны, строгія маральныя прынцыпы, нацыянальныя традыцыі. Важнай характарыстыкай унікальнага беларускага шляху з’яўляецца г.зв. “месійнасць”: у XX ст. Беларусь была пакліканая выратаваць Еўропу ад нацызму; цяпер Беларусь ратуе еўрапейскія краіны ад наркагандлю, наплыву нелегальных эмігрантаў і гандлю людзьмі.

**Цытата для прыкладу:**

“Социальное государство должно видеть и преодолевать недостатки рынка: эгоизм, индивидуальную замкнутость, снижение планки духовных ценностей” [7].

6. БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ (ДВАІСТЫ МІФ)

**Сутнасць міфа:** 1. Крыніцай беларускай дзяржаўнасці з’яўляюцца Полацкае княства, Тураўскае княства і Вялікае Княства Літоўскае. У названыя перыяды адбылося зараджэнне беларускага этнасу і беларускай мовы. Названыя перыяды з’яўляюцца “залатымі перыядамі” Беларусі, часам дзяржаўнага і культурнага росквіту.

**Цытата для прыкладу:**

“Мы говорим, что мы независимое государство. Мы его создали! Мы заняли свое место в международных отношениях. И это не сегодня началось. Нам не надо присваивать это достижение. Это было. К этому шли давно. Вы знаете еще со времен Киевской Руси, полоцких, туровских земель, Великого княжества Литовского. Каждое время по крупицам, по кирпичику складывало то, что сегодня есть” [16].

2. Крыніцай беларускай дзяржаўнасці з’яўляецца БССР. Формы дзяржаўнасці, якія раней існавалі на беларускіх землях, былі непаўнавартаснымі; беларускі народ у іх не быў прадстаўлены як асобны этнас, а ўспрымаўся як частка балтаў альбо палякаў. Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя, як і Вялікая Айчынная вайна, сталі ключавым этапам у працэсе станаўлення беларускай нацыі.

**Цытата для прыкладу:**

“Благодаря победе Великого Октября свершилась мечта многих поколений белорусов – мы обрели независимое государство, открытое для друзей” [19].

7. ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА

**Сутнасць міфа:** Беларускі народ (супольна з рускім і ўкраінскім народамі) адыгралі дамінуючую ролю ў барацьбе з нацызмам. Памяць пра народны гераізм пакладзена ў аснову беларускай дзяржаўнай ідэалогіі. Беларусь павінна жорстка рэагаваць на любыя спробы альтэрнатыўнага трактавання падзей Вялікай Айчыннай вайны (у прыватнасці, партызанскага і падпольнага руху), якія могуць пахіснуць нацыянальную ідэю.

**Цытата для прыкладу:**

“Поэтому в основе идеологии у нас тоже лежит Великая Отечественная война и подвиг. Мы так это трактуем. Одно из достоинств нашего народа, советского народа, в том числе белорусского, — то, что мы спасли цивилизацию от уничтожения. Коричневая чума и нацизм — это полный крах цивилизации. Это величайшее наше достояние, которое у нас пытаются в последнее время отнять” [20].

8. ПРАВАСЛАЎНАЯ ЦАРКВА

**Сутнасць міфа:** Праваслаўнае веравызнанне з’яўляецца гістарычным падмуркам беларускай веры, асноваю славянскага адзінства. Праваслаўная царква павінна быць саюзніцай дзяржавы, уплываць на фарміраванне дзяржаўнай ідэалогіі і быць каналам яе распаўсюду сярод вернікаў.

**Цытата для прыкладу:**

“Мы никогда не отделяли себя от Церкви, ведь государство и Церковь решают одну и ту же задачу. […] Мы всегда опирались на идеи Церкви, выработанные тысячелетиями, по сути, выбрали ее главным идеологом белорусской государственности, и мы в этом не ошиблись” [11].

9. НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МОВЫ

**Сутнасць міфа:** У Беларусі руская і беларуская мова раўназначныя, а таму руская мова таксама павінна мець стасус “нацыянальнай” мовы. Так гістарычна склалася, што беларусы ўдзельнічалі ў фарміраванні сучаснай рускай мовы, таму не маюць права адмаўляцца ад яе. Існуе адрозненне рускай мовы (якая цяпер выкарыстоўваецца ў Беларусі і ва Украіне) і расійскай мовы, якая распаўсюджаная ў далёкіх рэгіёнах РФ. Да таго ж, руская мова ў Беларусі – гэта мова культуры і штодзённых стасункаў, а беларуская мова – мова сталага вясковага пакалення, мала ўжываная і слаба распрацаваная.

**Цытата для прыкладу:**

“У нас наших два родных языка — русский и белорусский. Если вы считаете, что русский язык — это язык россиян, я с вами никогда не соглашусь. Мы немало прожили вместе с вами — от империи до Советского Союза. Мы вложили душу в этот язык” [22].

10. САЮЗ РАСІІ І БЕЛАРУСІ

**Сутнасць міфа:** Саюзная дзяржава з’яўляецца прататыпам будучага адноўленага СССР. Пачынаючы з частковай перадачы дзяржаўных функцый на наднацыянальны ўзровень, у выніку інтэграцыйнага працэсу Саюзная дзяржава павінна стаць моцным утварэннем з адзінай валютай і агульнай Канстытуцыяй. На дадзены момант працэс інтэграцыі замаруджаны, бо адсутнічае адзінае разуменне статусу асобных дзяржаваў у гэтым саюзе.

**Цытата для прыкладу:**

"Если бы мы видели, что российское государство хочет построить с Беларусью Союзное государство на принципах равноправия, то сегодня можно было бы в этом направлении работать более активно и смело. Но посмотрим правде в глаза. Что нам предлагают? Стать Н-ской губернией Российской Федерации" [15].

11. ВЫКАНАЎЧАЯ ЎЛАДА

**Сутнасць міфа:** Асноўнай галіной улады ў Беларусі з'яўляецца выканаўчая. Для краіны пераходнага перыяду недапушчальны г.зв. прынцып балансу ўлады, бо гэта выкліча палітычную нестабільнасць, анархію. Яскравым пацверджаннем гэтага стала дзейнасць Вярхоўнага Савета ў 1994-1996 гг.

**Цытата для прыкладу:**

"Только конституционная реформа создаст у нас нормальную рабочую обстановку, при которой можно будет спокойно жить и решать проблемы. Если мы не внесём изменения в конституцию, то политические авантюристы будут постоянно держать народ и страну в напряжении, ожидая удобного момента для захвата власти" [17].

12. НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ СІМВАЛЫ

**Сутнасць міфа:** Беларускімі нацыянальнымі сімваламі з'яўляюцца зацверджаныя рэферэндумам 1995 года чырвона-зялёны сцяг з белым арнаментам і дзяржаўны герб, у аснову якога пакладзены герб БССР. Сімвалы, якія мелі стасус "дзяржаўных" у перыяд 1991-1995 гг., і цяпер выкарыстоўваюцца дэмакратычна настроенай часткаю грамадства, але бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня" з'яўляюцца варожымі для беларускай дзяржавы. Бел-чырвона-белы сцяг ("Пагоня" ў меншай ступені) быў заплямлены падчас Другой сусветнай вайны, бо атрымаў прызнанне з боку нямецкіх акупантаў. Адпаведна тыя сацыяльныя групы, якія выкарыстоўваюць гэтую сімволіку, падтрымоўваюць фашыстаў і з'яўляюцца ворагамі беларускага народа.

**Цытата для прыкладу:**

"Под гербом "Погоня" и бело-красно-белым флагом прислужники фашистских оккупантов из специального батальона "Дальвитц" и штурмовой бригады "Белорутения" расстреливали и вешали борцов за освобождение Беларуси" [8].

13. СУВЕРЭНІТЭТ

**Сутнасць міфа:** Пасля распаду СССР Беларусь раптоўна атрымала суверэнітэт, які цяпер з'яўляецца вялікай каштоўнасцю беларускага народа.

**Цытата для прыкладу:**

"Суверенитет и независимость не продаются ни за какой природный газ, ни за какую нефть. Это слишком дорогая вещь, чтобы ею торговать. […] Суверенитет и независимость – это святое, так же как постулаты, которые проповедует Христианство" [10].

14. ЧАРНОБЫЛЬ

**Сутнасць міфа:** Беларусь стала ахвяраю некампетэнтных дзеянняў палітычнага кіраўніцтва УССР і РСФСР па ліквідацыі выбуху на Чарнобыльскай АЭС у 1986 г. Аднак вынікі Чарно-быльскай трагедыі значна перабольшваюцца палітычнымі апанентамі і недзяржаўнымі СМІ; беларуская дзяржава здолела ліквідаваць абсалютную большасць негатыўных наступстваў.

**Цытата для прыкладу:**

“Не секрет, что прорабатывается вопрос о возможном строительстве в Беларуси собственной атомной электростанции. […] Понятно, что для белорусского народа, пострадавшего от чернобыльской трагедии, эта тема связана с психологическими волнениями. […] В условиях отсутствия своих энергоресурсов и, как следствие, обременительной зависимости от других стран вопрос о создании собственной ядерной энергетики становится одной из гарантий национальной безопасности страны и обеспечения ее энергией. И не надо, еще раз подчеркиваю, на этом вопросе набивать себе политический капитал” [21].

## АСАБЛІВАСЦІ І СПЕЦЫФІКА ПАЛІТЫЧНАГА МІФАЎТВАРЭННЯ

Палітолаг Алесь Лагвінец адзначае, што беларускі публічны дыскурс мае ўласны стыль, які спалучае ў сабе савецкія канцылярызмы і сучасныя тэндэнцыі. Асноўнымі рысамі гэтага стылю з’яўляецца папулізм, эклектызм (адно публічнае выказванне можа змяшчаць у сабе супрацьлеглыя тэзісы), а таксама стагнацыя (будучы выхаванымі ў савецкіх традыцыях, абсалютная большасць чыноўнікаў, якія цяпер фарміруюць публічны дыскурс, няздольныя ствараць новыя канцэпты). Па меркаванні А. Лагвінца, немагчыма вызначыць адзіны механізм трансфармацыі публічнага выказвання палітыка ў палітычны міф: па-першае, міфы могуць ствараца штучна – шляхам актыўнай прапаганды праз СМІ ды іншыя каналы перадачы інфармацыі; па-другое, адмаўленне зместу нейкіх выказванняў пры адсутнасці дастатковых контраргументаў правакуе замацаванне ва ўспрыняцці індывідаў гэтых тэзісаў як праўдзівых; па-трэцяе, пэўныя выказванні становяцца міфамі ірацыянальным чынам, калі яны закранаюць глыбінныя эмоцыі індывідаў. У выпадку Беларусі такімі калектыўнымі эмоцыямі з’яўляюцца страх, асэнсаванне неабходнасці падпарадкавання ўладзе і адчуванне камфорту.

Беларускі сацыёлаг Алег Манаеў выказвае блізкае меркаване пра эклектызм беларускага публічнага дыскурсу (праўда, у іншым значэнні – як спалучэнне ў беларускай незавершанай мадэлі розных элементаў іншых сфарміраваных сістэм), і вызначае другую важную характарыстыку дыскурсу — яго цякучасць ды няўстойлівасць (напрыклад, тыя элементы структурнага ды культурна-ментальнага ўзроўню, якія былі дамінуючымі ў 1990-х гг., цяпер адыходзяць на задні план). Найбольшую колькасць элементаў (у самых розных сферах – права, эканоміка, канцэпты справядлівасці, сілы ды інш.), хоць і не ўсе, беларуская мадэль запазычыла з савецкай сістэмы, аднак паступова адбываецца мадэрнізацыя масавай свядомасці беларускага соцыума (найперш, у сферы эканамічных уяўленняў).

Змест міфаў, а таксама іх з’яўленне альбо знікненне з палітычнага дыскурсу у вялікай ступені абумоўлена актуальнымі палітычнымі працэсамі. Прывядзем некалькі прыкладаў. Так, у 1994-1995 гг. у цэнтры ўвагі знаходзяцца міфы “Нацыянальныя сімвалы” і “Нацыянальныя мовы”, што можна растлумачыць падрыхтоўкай да правядзення агульнарэспубліканскага рэферэндума па змене дзяржаўных сімвалаў і наданні рускай мове статусу дзяржаўнай. Што цікава, названыя міфы збольшага выяўляюцца не ў публічных прамовах А. Лукашэнкі (як у наступныя гістарычныя перыяды), а праз публічныя дыскусіі парламенцкіх фракцый-апанентаў.

З 2004 г. пачынае рэзка распрацоўвацца міф “Бацька народа”, пік папулярызацыі гэтага персаніфікаванага міфа прыпадае на 2005-2006 г. Відавочна, прычына такой дынамікі

палягае ў рэферэндуме 2004 г., паводле вынікаў якога Аляксандр Лукашэнка атрымаў права балатавацца на трэці тэрмін, а таксама ў прэзідэнцкіх выбарах 2006 г.

У 2007 г. раптоўна ўзнікае міф "Чарнобыль", які абгрунтоўвае неабходнасць будаўніцтва новай АЭС дзеля гарантавання нацыянальнай бяспекі краіны. Пасля вывучэння грамадскай рэакцыі (і адсутнасці масавай адмоўнай рэакцыі) палітычнае рашэнне наконт будаўніцтва АЭС было прынятае, і гэты міф гэтак жа раптоўна знік з публічнага дыскурсу кіруючай эліты.

**У падсумаванне нашага сціслага аналізу прывядзем некалькі высноваў:**

Па-першае, вызначаныя палітычныя міфы ("Ворагі", "Бацька народа", "Панславізм", "Распад СССР", "Беларускі шлях", "Беларуская дзяржаўнасць", "Вялікая Айчынная вайна", "Праваслаўная царква", "Нацыянальныя мовы", "Саюз Расіі і Беларусі", "Выканаўчая ўлада", "Нацыянальныя сімвалы", "Суверэнітэт", "Чарнобыль") адпавядаюць асноўным міжнародным характарыстыкам палітычнай міфалогіі – напрыклад, агульны міф пра "залаты век" дзяржавы раскрываецца ў апісаным намі міфе "Беларуская дзяржаўнасць".

Па-другое, палітычныя міфы з'яўляюцца кан'юнктурнымі, яны на колькасным і якасным узроўнях адаптуюцца да трансфармацый у палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферах, да зменаў у знешнеэканамічнай палітыцы дзяржавы. Частка міфаў прысутнічае ў публічным дыскурсе ўлады на працягу ўсяго перыяду 1994-2010 гг. ("Ворагі", "Бацька народа", "Нацыянальныя мовы", "Вялікая Айчынная вайна", "Саюз Расіі і Беларусі") — такія міфы можна назваць дамінуючымі; астатнія міфы, якія з'яўляюцца і знікаюць пад уплывам унутраных і знешніх чыннікаў, можна назваць кантэкстуальнымі. У цэнтры ўвагі пераважнай большасці міфаў публічнага дыскурсу знаходзяцца канцэпты "краіна", "дзяржава", "народ", персаналізаваны міф толькі адзін ("Бацька народа").

Па-трэцяе, асноўным публічным актарам палітычнага міфастварэння з'яўляецца беларускі прэзідэнт А. Лукашэнка, іншыя актары з'яўляюцца дапаможнымі. Выказванні А. Лукашэнкі, якія былі ў фокусе нашага аналізу, характарызуюцца асаблівай семантычнай афарбоўкай у адрозненне ад выказванняў дапаможных актараў, якія альбо паводле свайго статусу (напрыклад, дыпламаты з МЗС), альбо праз індывідуальныя асаблівасці не могуць сабе дазволіць такія яскравыя выступы.

Па-чацвёртае, характэрнай асаблівасцю беларускай палітычнай міфатворчасці з'яўляецца нізкі ўзровень рэінкарнацыі продкаў (назіраецца толькі ў міфе "Вялікая Айчынная вайна"). Нават такія постаці мінулага, як Ленін альбо Сталін, якія часта атрымоўваюць станоўчую ацэнку з боку прадстаўнікоў кіруючай эліты, застаюцца па-за межамі беларускай міфатворчасці, у тым ліку, міфа "Распад СССР". Гэтая асаблівасць характэрная толькі для ўладнага дыскурсу, палітычныя апаненты ўлады актыўна выкарыстоўваюць механізм рэінкарнацыі для прадукавання ўласных міфаў (напрыклад, постаці К. Каліноўскага альбо М. Вітушкі).

Па-пятае, нягледзячы на тое, што палітычныя міфы з'яўляюцца спосабамі канструявання і трансфармацыі рэальнасці, пераацэньваць іх магчымасці няварта: сучасныя палітычныя міфы прадукуюцца "масавым чалавекам" і для "масавага чалавека" (азначэнні Х. Артэгі-і Гасэта і А. Манаева) у той час, як вельмі часта асноўным актарам пераменаў выступае актыўная меншасць.

***Агульныя міфы:*** "Ворагі", "Бацька народу", "Нацыянальныя мовы", "Вялікая Айчынная вайна", "Саюз Расіі і Беларусі".

***Кантэкстуальныя міфы:*** “Панславізм”, “Выканаўчая ўлада”, “Чарнобыль”, “Распад СССР”, “Беларуская дзяржаўнасць”, “Нацыянальныя сімвалы”, “Праваслаўная царква”, “Суверэнітэт”, “Беларускі шлях”.

**Структура палітычнай міфатворчасці за перыяд 1994-2010 гг.**




**Размеркаванне кантэкстуальных міфаў**




## КРЫНІЦЫ

*1. Кассирер Э. (2000) Технологии современных политических мифов. Даступна па спасылцы: [http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/Polit/Hrestom/61.php](http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/Polit/Hrestom/61.php) (Дата звароту: 03 сакавіка 2014 г.).*

*2. Флад К. (2004) Политический миф. Теоретическое исследование. Даступна па спасылцы: [http://iknigi.net/avtor-kristofer-flad/49367-politicheskiy-mif-teoreticheskoe-issledovanie-kristofer-flad.html](http://iknigi.net/avtor-kristofer-flad/49367-politicheskiy-mif-teoreticheskoe-issledovanie-kristofer-flad.html) (Дата звароту: 01 сакавіка 2014 г.).*

*3. Brzozovska A. (2003) Symbols, Myths, and Metaphors: the Discursive Battle over the “True” Belarusian Narrative. Даступна па спасылцы: [http://issuu.com/slovojournal/docs/merged_document](http://issuu.com/slovojournal/docs/merged_document) (Дата звароту: 10 мая 2014 г.).*

*4. Dolbilov M. (2001) "The Political Mythology of Autocracy: Scenarios of Power and the Role of the Autocrat", Kritika: Explorations in Russian and Eurasian History, N°4, Vol. 2: pp. 773-795.*

*5. Massiea J., Roussel S. (2008) "Au service de l'unité : Le rôle des mythes en politique étrangère canadienne", Canadian Foreign Policy Journal, N°2, Vol. 14: pp. 67-93.*

*6. Walinski-Kiehl R. (2004) "Reformation History and Political Mythology in the German Democratic Republic, 1949-89", European History Quarterly January, N°1, vol. 34: pp. 43-67.*

**Перыядычныя выданні і сайты**

*7. Василевич Г. (2000) Становление социального государства. Даступна па спасылцы: http://www.law.bsu.by/pub/26/Vasilevich51.doc (Дата звароту: 20 красавіка 2014 г.).*

*8. "Восстановите справедливость" (1995). СБ – Беларусь сегодня, №57-58 (19118-19119): с.2.*

*9. "Выступление А.Г. Лукашенко на открытии международного фестиваля искусств "Славянский базар" в Витебске" (2010) Даступна па спасылцы: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/aleksandr-lukashenko-vystupil-na-otkrytii-xix-mezhdunarodnogo-festivalja-iskusstv-slavjanskij-bazar-v-vitebske-5059/ (Дата звароту: 02 мая 2014 г.).*

*10. "Глава государства высоко оценил патриотизм церкви" (2007) Даступна па спасылцы: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/glava-gosudarstva-vysoko-otsenil-patriotizm-tserkvi-2560/ (Дата звароту: 15 мая 2014 г.).*

*11. "Государство и церковь решают одну и ту же задачу" (2007) Даступна па спасылцы: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/gosudarstvo-i-tserkov-reshajut-odnu-i-tu-zhe-zadachu-2745/ (Дата звароту: 16 мая 2014 г.).*

*12. "Доклад Президента Республики Беларусь А.Г.Лукашенко на третьем Всебелорусском народном собрании" (2006) Даступна па спасылцы: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/doklad-prezidenta-respubliki-belarus-aglukashenko-na-tretjem-vsebelorusskom-narodnom-sobranii-5863/ (Дата звароту: 10 мая 2014 г.).*

*13. "Интервью А.Г. Лукашенко российскому телеканалу "ТВ ЦЕНТР" (2005) Даступна па спасылцы: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/intervjju-rossijskomu-telekanalu-tv-tsentr-5921/ (Дата звароту: 03 красавіка 2014 г.).*

*14. "Интервью А.Г. Лукашенко международному агентству "PM Communications". (2003) Даступна па спасылцы: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/intervjju-prezidenta-respubliki-belarus-aleksandra-lukashenko-mezhdunarodnomu-agentstvu-pm-communications-5905/ (Дата звароту: 02 красавіка 2014 г.).*

*15. "Интервью Президента Беларуси А.Лукашенко главному редактору "Российской газеты" (2005) Даступна па спасылцы: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/intervjju-prezidenta-belarusi-alukashenko-glavnomu-redaktoru-rossijskoj-gazety-5924/ (Дата звароту: 10 красавіка 2014 г.).*

*16. "Интервью руководителям основных средств массовой информации" (2008) Даступна па спасылцы: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/intervjju-rukovoditeljam-osnovnyx-sredstv-massovoj-informatsii-5937/ (Дата звароту: 06 мая 2014 г.).*

*17. "Наше будущее в наших руках" (1996) СБ – Беларусь сегодня, №206 (19516): с.1.*

*18. "Обращение Президента Республики Беларусь А. Лукашенко с посланием белорускому народу и Национальному Собранию" (2005) Даступна па спасылцы: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/obraschenie-prezidenta-respubliki-belarus-a-lukashenko-s-poslaniem-belorusskomu-narodu-i-natsionalnomu-5848/ (Дата звароту: 15 мая 2014 г.).*

*19. "Поздравление с Днём Октябрьской революции" (2007) Даступна па спасылцы: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/pozdravlenie-s-dnem-oktjabrskoj-revoljutsii-6028/ (Дата звароту: 16 мая 2014 г.).*

*20. "Пресс-конференция Президента Республики Беларусь Александра Лукашенко средствам*

*массовой информации регионов России” (2003) Даступна па спасылцы: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/press-konferentsija-prezidenta-respubliki-belarus-aleksandra-lukashenko-sredstvam-massovoj-informatsii-5911/ (Дата звароту: 01 красавіка 2014 г.).*

*21. “Послание Президента Республики Беларусь А.Г. Лукашенко белорусскому народу и Национальному собранию Республики Беларусь: “Независимая Беларусь — наш достойный и надежный дом” (2007) Даступна па спасылцы: http://www.sb.by/post/58081/ (Дата звароту: 15 мая 2014 г.).*

*22. “Стенограмма пресс-конференции для представителей российских региональных СМИ” (2006) Даступна па спасылцы: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/stenogramma-press-konferentsii-dlja-predstavitelej-rossijskix-regionalnyx-smi-5927/ (Дата звароту: 04 мая 2014 г.).*

# ПАЛІТЫЧНЫЯ СВЯТЫ ЯК СПОСАБ ФАРМІРАВАННЯ ЎЯЎЛЕННЯЎ ПРА НАЦЫЮ І ДЗЯРЖАВУ Ў БЕЛАРУСІ, 1996–2014 ГГ.

***Вольга Гайдук*** магістрантка праграмы "Публічная палітыка" Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (Літва). Атрымала ступень бакалаўра паліталогіі і еўрапейскіх даследаванняў у Еўрапейскім гуманітарным універсітэце (Літва). Зараз вывучае палітычныя святы і рытуалы як стратэгіі палітычных эліт у фарміраванні і замацаванні калектыўных уяўленняў рэканструкцыі гістарычнага мінулага ў цяперашнім часе.

***Анатацыя.*** Палітычныя святы з'яўляюцца важнымі інструментамі стварэння і кансалідацыі ўжо існуючых ўяўленняў аб нацыі і дзяржаве. Выкарыстоўваючы святы, палітычныя эліты "вынаходзяць" традыцыі, рэканструююць мінулае – і тым самым ствараюць пэўнае бачанне нацыі і дзяржавы. У Беларусі канфлікт паміж афіцыйным і апазіцыйным дыскурсам з'яўляецца галоўнай асаблівасцю, якая характарызуе фарміраванне гэтых уяўленняў і гістарычных наратываў, на якіх яны заснаваны. Гэта перашкаджае стварэнню агульнай нацыянальнай прасторы памяці. У той жа час, афіцыйныя ўяўленні, якія падтрымліваюцца з дапамогай важных інстытуцыйных і матэрыяльных рэсурсаў, паступова выцясняюць апазіцыйны гістарычны наратыў з публічнай прасторы і нацыянальнай памяці.

Гэтае даследаванне факусуецца на прыкладзе двух палітычных святаў: афіцыйнага Дня Незалежнасці і неафіцыйнага (апазіцыйнага) Дня Волі. У даследаванні аналізуецца эфектыўнасць стратэгій фарміравання ўяўленняў пра беларускую нацыю і дзяржаву праз палітычныя святы. Асноўныя мэты дадзенага даследавання: 1) паказаць на прыкладзе афіцыйных і неафіцыйных палітычных святаў, якім чынам адбывалася фарміраванне канкуруючых комплексаў уяўленняў пра беларускую нацыю ў Беларусі на працягу 1994-2014 гг.; параўнаць уяўленні пра беларускую нацыю і дзяржаву, а менавіта: як яны адлюстраваны ў двух палітычных святах: у Дні Незалежнасці і Дні Волі; 2) вызначыць, наколькі палітычныя святы з'яўляюцца эфектыўным інструментам замацавання пэўных уяўленняў пра нацыю і дзяржаву.

Выкарыстоўваючы такія метады, як тэарэтычны аналіз канцэпцый нацый, аналіз дыскурсу і кантэнт-аналіз публікацый у сродках масавай інфармацыі, пісьмовае апытанне і інтэрв'ю, было праведзена даследаванне і зроблена выснова, што існыя палітычныя святы і рытуалы спрыяюць размыванню ўяўленняў пра нацыю і дзяржаву і іх атаясамленню з палітычным рэжымам або проціпастаўленню палітычнаму рэжыму. Сапраўды, ствараючы дыскурс пра нацыю і дзяржаву, палітычныя эліты "вынаходзяць" традыцыі і рэканструююць мінулае, адштурхоўваючыся ад цяперашняга. З сярэдзіны 1990-х працэсы нацыянальнага будаўніцтва ў Беларусі вызначаюцца супрацьстаяннем паміж дзяржавай і палітычнай апазіцыяй, што выяўляецца ў канфлікце двух наратываў мінулага: вобразу нацыі, народжанай у Вялікай Айчыннай вайне, супрацьстаіць вобраз адраджэнскай нацыі, таксама як афіцыйнаму святу Дня Незалежнасці супрацьстаіць неафіцыйны Дзень Волі. Канфлікт рознай памяці, а таксама факусаванне палітычных святаў на палітычным супрацьстаянні і страце іх сувязі з мінулым робіць святы неэфектыўным інструментам мабілізацыі і кансалідацыі беларусаў на аснове агульных уяўленняў пра нацыю і дзяржаву. Акрамя таго, размыванне калектыўных уяўленняў пра нацыю і дзяржаву спрыяе падтрыманню недэмакратычнага рэжыму Беларусі

як палітычнага парадку "па змаўчанні", далейшай маргіналізацыі апазіцыі і выцяснення гістарычнай памяці, якая апынулася пад забаронай.

***Ключавыя словы:*** *палітычныя святы, нацыя, традыцыя, гістарычная памяць, калектыўныя ўяўленні, дыскурс.*

## УВОДЗІНЫ: АСАБЛІВАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ ЎЯЎЛЕННЯЎ ПРА БЕЛАРУСКУЮ НАЦЫЮ І ДЗЯРЖАВУ

Неабходнасць пераасэнсавання гісторыі асабліва востра паўстае ў палітычных супольнасцях, якія знаходзяцца ў працэсе трансфармацыі і якія ўсталі на шлях фарміравання суверэннай нацыянальнай дзяржавы. Пасля распаду Савецкага Саюза такая неабходнасць паўстала перад Беларуссю. Фарміраванне ладу беларускай нацыі ажыццяўлялася ў сітуацыі палітычнага расколу грамадства. Якім чынам адбывалася фарміраванне комплексаў уяўленняў пра беларускую нацыю і дзяржаву ва ўмовах існавання двух галоўных канкуруючых дыскурсаў? На якія інтэрпрэтацыі мінулага яны абапіраюцца і якім чынам інтэрпрэтуюць гісторыю для стварэння вобразу памятаючай нацыі? З дапамогай якіх інструментаў і з якім вынікам палітычныя эліты спрабуюць замацаваць комплексы ўяўленняў у публічнай прасторы?

Для таго, каб адказаць на дадзеныя пытанні намі быў праведзены аналіз комплексаў уяўленняў пра беларускую нацыю і дзяржаву шляхам параўнання двух святаў — Дня Незалежнасці і Дня Волі. Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь - гэта афіцыйнае свята, звязанае з беларускай дзяржаўнасцю, у якім найбольш поўна раскрываюцца калектыўныя ўяўленні пра нацыю і дзяржаву. Яно транслюецца кіруючай палітычнай элітай. Дзень Волі — гэта неафіцыйнае палітычнае свята, якое адзначаецца беларускай апазіцыяй, прысвечанае стварэнню Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918 г., прадстаўляе альтэрнатыўны (апазіцыйны) погляд на вобраз нацыі і дзяржавы.

У даследаванні мы абапіраемся ў асноўным на так званы "мадэрнісцкі падыход" у вызначэнні нацый, у рамках якога апошнія разглядаюцца як "сацыяльна-гістарычныя канструкты, якія склаліся ў выніку доўгіх намаганняў дзяржаў па пераплаўленні разнастайнага насельніцтва пэўнай тэрыторыі ў адносна аднастайную сацыяльна-культурную супольнасць" (Малахов 2004). Дадзены падыход, на наш погляд, найбольш адпавядае сітуацыі, калі маладыя дзяржавы, якія ўтварыліся ў выніку распаду буйных дзяржаў, такіх, як СССР, маюць патрэбу ў пераглядзе нацыянальных ідэй і межаў нацыі. Разуменне нацыі абапіраецца на канцэпцыі "ўяўнай супольнасці" Б.Андэрсана (Андерсон 2001) і "вынаходніцтва традыцыі" Э.Хабсбаўма (Hobsbawm 1983). Палітычныя святы разглядаюцца як інструменты "вобразу нацыі", якія фарміруюць пэўныя ўяўленні пра нацыю і дзяржаву, выкарыстоўваючы гістарычную памяць (Хальбвакс 2007; Хальбвакс 2005:2), як злучальнае звяно паміж мінулым і сучаснасцю нацыі. Памяць (Нора 2009) і традыцыя пераплятаюцца ў палітычных святах, ствараючы розныя вобразы нацыі і ўмоўна можна вызначыць два комплексы ўяўленняў пра нацыю: нацыя "народжаная" з Вялікай Айчыннай вайны (Goujon 2010) і спрадвечна беларуская суверэнная нацыя .

Палітычныя святы як вынайдзеныя традыцыі прыходзяць на месца ўжо існых рытуалаў і ўяўленняў, таму адной з задач з'яўляецца дамагчыся ад рытуалу эфекту сацыяльнай інтэграцыі, г.зн. забяспечыць удзел мас. Аднак, як настойвае С. Люкс (Lukes 1975), многія

даследчыкі надаюць занадта вялікую ўвагу інтэгратыўнасці функцыі палітычных святаў і рытуалаў, пакідаючы без належнай увагі калектыўныя ўяўленні і пачуцці іх удзельнікаў.

Афіцыйныя палітычныя святы і рытуалы, якія працуюць паслядоўна і сістэматычна на выгаду пэўнай групы, закліканы ўмацаваць існую традыцыю і ўяўленні пра нацыю, уключыўшы іх ва ўсе сферы жыцця дзяржавы праз сімвалы, лозунгі, гарадскую прастору, час, памятныя месцы.

Альтэрнатыўныя, неафіцыйныя святы, не валодаюць высокай інтэгратыўнай, аб’яднаўчай здольнасцю, не могуць забяспечыць існаванне дамінуючай традыцыі праз стварэнне калектыўных уяўленняў пра нацыю. Альтэрнатыўныя ўяўленні, зазнаючы крытыку з боку кіруючай эліты, паступова аказваюцца выцесненымі з культурнай памяці (Ассман 2004), стаўшы здабыткам асобнай групы людзей. Недэмакратычнасць рэжыму дазваляе выкарыстоўваць апарат прымусу і гвалту ў дачыненні да апазіцыйна настроеных груп, выклікаць страх у іншай часткі нацыі, у выніку чаго альтэрнатыўныя калектыўныя ўяўленні і гістарычная памяць (Ластовский 2009) аказваюцца або выцесненымі, або пад своеасаблівай забаронай. Афіцыйныя ўяўленні пра мінулае і звязаныя з імі ўяўленні пра нацыю, дзяржаву, палітычны парадак, хоць і аказваюць слабую кансалідуючую ролю, успрымаюцца як адзіна магчымыя і прымальныя большасцю.

Фарміраванне ўяўленняў пра беларускую нацыю адбывалася ў некалькі этапаў, звязаных са стварэннем суверэннай дзяржавы і новых палітычных інстытутаў. Умоўна можна вылучыць наступныя перыяды:

**1991-1994 гг.** адбываецца трансфармацыя палітычнага рэжыму, пераход ад будаўніцтва камунізму ў рамках СССР да будаўніцтва дэмакратычнай, суверэннай, прававой нацыяналь-най дзяржавы. Фарміраванне этнічнай беларускай нацыі, правядзенне палітыкі беларусізацыі. У гэты перыяд адбылося пераасэнсаванне мінулага і яго сувязі з сучаснасцю; змяніўся гістарычны ландшафт горада (назвы вуліц, помнікаў, музеяў), з’явіўся праспект Ф. Скарыны, плошча Незалежнасці і інш.; змянілася сімволіка і лозунгі, фарміравалася новая нацыянальная ідэнтычнасць. У выніку паўстаў своеасаблівы альянс улады і памяці. Пры гэтым палітычнае свята стала часткай высілкаў, накіраваных на тое, каб легітымізаваць дзейную ўладу, пераасэнсаваць і замацаваць у грамадскай свядомасці новыя вобразы гісторыі, стварыць пачуццё яднання нацыі, звязаць мінулае і сучаснасць. На першы план выходзіць праект беларусізацыі краіны, аднаўленне гістарычнай памяці, выцесненай савецкай версіяй гісторыі, у святочным календары з’яўляюцца новыя палітычныя святы: 27 ліпеня Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, звязаны з днём абвяшчэння Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце, і 25 сакавіка Дзень Волі, звязаны з абвяшчэннем у 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі.

**1994-1996 гг**. пераходны перыяд, паступовае згортванне палітыкі беларусізацыі, звязаны з выбарамі першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Адбыліся значныя змены ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якія датычацца заканадаўчай і выканаўчай улады, а таксама пашырэння паўнамоцтваў прэзідэнта; была зменена сімволіка Рэспублікі Беларусь (вяртанне да савецкай сімволікі), пазней быў зменены і гімн, перанесена свята Дня Незалежнасці на 3 ліпеня і адменена святкаванне Дня Волі.

**1996-2014 гг.** праўленне А.Г. Лукашэнкі, усталяванне і паступовая кансалідацыя

аўтарытарнага палітычнага рэжыму, стварэнне комплексаў уяўленняў пра нацыю, заснаваных на пазітыўнай інтэрпрэтацыі савецкага мінулага і кульце перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Наша даследаванне дазволіла выявіць некаторыя тэндэнцыі фарміравання і замацавання калектыўных уяўленняў пра нацыю і дзяржаву ў палітычных святах Дня Незалежнасці і Дня Волі. Намі было зроблена параўнанне комплексаў уяўленняў шляхам аналізу дыскурсу і кантэнт-аналіз публікацый перыядычных выданняў “Рэспубліка”, “Савецкая Беларусь” за ліпень 1996-2014 гг., “Наша Ніва”, “Народная Воля” за сакавік 1996-2014 гг.. У рамках сацыялагічнага даследавання было праведзена пісьмовае апытанне на базе сярэдняй школы г. Мінска сярод вучняў 10,11 класаў, настаўнікаў і некаторых членаў настаўніцкіх сямей. У апытанні прынялі ўдзел 43 чалавекі ва ўзросце ад 15 да 58 гадоў. Гэтае апытанне было дапоўнена вуснымі інтэрв’ю з 18 рэспандэнтамі ва ўзросце ад 20 да 50 гадоў. Рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанні, якія тычацца двух святаў — Дня Незалежнасці і Дня Волі. Інтэрв’ю дазволіла звязаць калектыўныя ўяўленні пра палітычныя святы з непасрэдным удзелам рэспандэнтаў альбо іхным няўдзелам у святах, а таксама вывучыць індывідуальнае стаўленне да Дня Незалежнасці і Дня Волі.

## НАРОД “НАРОДЖАНЫ” ВАЙНОЙ ЦІ АДРАДЖЭННЕ НАЦЫІ?

На працягу дваццацітрохгадовага існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь савецкае мінулае і памяць пра вайну спрыялі легітымацыі аўтарытарнай улады на тэрыторыі краіны. Сапраўды, на працягу гэтага часу ў публічнай сферы быў сфарміраваны вобраз прэзідэнта, як гаранта памяці подзвігу беларускага народа над фашызмам, а таксама важных каштоўнасцяў, якія асацыююцца ў публічным дыскурсе з савецкай эпохай.

Фарміраванне традыцыі шанавання беларускага народа як нацыі, што абараніла незалежнасць у гады Вялікай Айчыннай вайны, упершыню афіцыйна была закладзена ў 1996 годзе ў прамове прэзідэнта А.Г. Лукашэнкі, прысвечанай Дню Незалежнасці 27 ліпеня. У сваёй прамове “Мы не склоним головы перед испытаниями и трудностями, поскольку мы - белорусы” А.Г. Лукашенка падкрэсліў: “Нелегким и непростым был путь Беларуси к своей государственной независимости, что через века шел белорусский народ к этой светлой цели, борясь за свободу и независимость с оружием в руках” (Лазарь 1996: 193). Перанос даты святкавання Дня Незалежнасці з 27 ліпеня на 3 ліпеня ажыццявіўся ў 1997 годзе і карэнным чынам змяніў сэнс свята: ад суверэнай незалежнасці да вызвалення Мінска (Беларусі) ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У аснову афіцыйнай гістарычнай памяці пра беларускую нацыю і дзяржаўнасць закладаюцца падзеі 1941-1945 гг., гэта значыць перыяду Вялікай Айчыннай вайны, а загінулае пакаленне становіцца сімвалам нацыі. Пры гэтым удакладняецца, што суверэннасць нацыі і дзяржавы сыходзіць сваімі каранямі да Кастрычніцкай рэвалюцыі: “Что бы ни говорили об Октябрьской революции […] именно в ней – истоки современной белорусской государственности” (Лукашенко. 1997: 140), кажа ў сваёй прамове А.Г. Лукашэнка. Ствараецца вобраз мужнай, патрыятычнай нацыі, што адстойвае справядлівасць сумесна з братэрскім рускім народам.

Гістарычная сувязь нацыі з Вялікім Княствам Літоўскім, Францыскам Скарынам, з БНР не адмаўляецца, але ўяўляецца, што яна мае значна меншае значэнне для беларускага народа ў параўнанні з Кастрычніцкай рэвалюцыяй 1917 года і Вялікай Айчыннай вайной.

Адраджэнне нацыі звязваецца з падзеямі 25 сакавіка 1918 года, калі была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка. Асноўнае гістарычнае значэнне дадзенага акту было ў тым, што абвяшчалася фарміраванне незалежнай ад Расеі беларускай дзяржавы. Сімваламі гэтай дзяржавы сталі бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня".

За тры гады афіцыйнага існавання свята Дня Волі (1993–1996 гг.) стварыць устойлівую традыцыю святкавання, якая актуалізуе памяць пра Беларускую Народную Рэспубліку як выток беларускай дзяржаўнасці і незалежнасці нацыі, не ўдалося. Ідэі беларускай незалежнасці ад савецкага мінулага нацыі былі ўспрыняты і падтрыманы часткай беларускага грамадства, але трывалая сувязь паміж комплексамі ўяўленняў пра беларускую нацыю і дасавецкае мінулае не была ўсталявана. Арганізатары Дня Волі мелі досыць абмежаваныя каналы распаўсюджвання гістарычнай інфармацыі і магчымасці звязаць мінулае з сучаснасцю на працягу апошніх дваццаці год. Памяць пра БНР як пра аснову незалежнасці апынулася ў галіне выцяснення ў афіцыйным дыскурсе пасля згортвання палітыкі беларусізацыі.

Неабходна зазначыць, што пэўны ўплыў на фармат святкавання Дня Волі аказалі палітычныя ўмовы ў Рэспубліцы Беларусь. У першыя гады ідэя незалежнасці выкарыстоўваецца лідарамі апазіцыйнага руху як аснова для супрацьстаяння існаму рэжыму і інтэграцыі з Расіяй. У апазіцыйнай прэсе фарміруецца вобраз ворага ў асобе дзяржавы і аўтарытарнага палітычнага рэжыму, з'яўляецца ідэя незалежнай Беларусі як еўрапейскай краіны, якая магла б існаваць, абапіраючыся на вопыт БНР. Так, аўтар аднаго з артыкулаў, прысвечаных БНР, робіць наступную выснову: "Беларусь становилась на путь европейской страны, вставала на путь цивилизованного развития. Даже теперь мы не имеем того, что было объявлено тогда […] Неудивительно, что они не будут праздновать 25 марта" (Петрусевич 1996: 45). Нягледзячы на тое, што ў апазіцыйнай прэсе з'яўляюцца артыкулы, прысвечаныя гістарычнай памяці пра БНР і яго лідараў, арганізатары Дня Волі накіроўваюць усе сілы на пратэстны характар акцый, што не спрыяе замацаванню калектыўных уяўленняў на аснове агульнай гістарычнай памяці.

Такім чынам, у рамках святкавання Дня Незалежнасці афіцыйны дыскурс стварае (або ўзнаўляе) наступныя традыцыі, закліканыя замацаваць комплексы ўяўленняў пра беларускую нацыю: урачыстыя прамовы, прымеркаваныя да Дня Незалежнасці, ваенны парад, парад спартсменаў і моладзі, парад дасягненняў айчыннай прамысловасці, адкрыццё помнікаў і мемарыялаў, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной і сімваламі незалежнасці, ушанаванне памяці загінулых герояў у Вялікай Айчыннай вайне, традыцыя сямейнасці, канцэртныя і забаўляльныя праграмы, масавыя гулянні і феерверк. Канфлікт з уладай і абмежаваныя магчымасці не дазваляюць апазіцыі выкарыстоўваць гістарычны ландшафт горада ў час правядзення Дня Волі. Фармат правядзення – пратэстная акцыя, мітынг-шэсце, выступленне лідараў апазіцыйнага руху з крытыкай існага рэжыму і з заклікамі да барацьбы супраць яго, затрыманні ўдзельнікаў, адсутнасць адзінага погляду на адраджэнне нацыі, што разам не спрыяе прыцягненню новых прыхільнікаў і распаўсюджанню альтэрнатыўных уяўленняў.

## ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ КОМПЛЕКСАЎ УЯЎЛЕННЯЎ ПА МАТЭРЫЯЛАХ СРОДКАЎ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

Параўнальны аналіз комплексаў уяўленняў праводзіўся намі паводле наступных

крытэрыяў: колькасць удзельнікаў мерапрыемстваў, выкарыстанне гарадскога ландшафту (Ластовский 2009) і часавыя характарыстыкі; аналіз сімвалаў і лозунгаў, захаваных на фотадакументах; моўныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца для апісання нацыі і дзяржавы ў прамовах лідараў і ў газетных артыкулах. Былі таксама праанілізаваны механізмы забыцця і прыгадвання мінулага (Assman 2008: 97-108; Assman 2008: 109-118) як элементаў сфарміраваных уяўленняў пра беларускую нацыю ў рамках афіцыйнага і апазіцыйнага дыскурсу беларускай нацыі і дзяржавы.

## КОЛЬКАСЦЬ УДЗЕЛЬНІКАЎ

Як адзначалася вышэй, Дзень Незалежнасці з'яўляецца афіцыйным дзяржаўным святам, па змаўчанні ўдзельнікі – усе беларусы. У першае дзесяцігоддзе нацыянальнай незалежнасці Дні Волі былі дастаткова масавыя, у акцыях прымалі ўдзел у розныя гады да 10 тысяч чалавек, як правіла, у сталіцы.

## ЧАСАВЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ

Не спрыяла замацаванню ўстойлівых часавых сувязяў у калектыўнай памяці залежнасць правядзення Дня Волі ад дазволу ўлады: у першыя гады мерапрыемствы праводзіліся ў бліжэйшыя выхадныя дні (каб сабраць больш удзельнікаў), прынамсі, у дзённы час, у працоўныя дні правядзенне мерапрыемстваў у вячэрні час абмяжоўвалася кароткім светавым перыядам.

## ВЫКАРЫСТАННЕ ГАРАДСКОГА ЛАНДШАФТУ

Значнае месца ў фарміраванні гістарычнай сувязі з цяперашнім часам займае гарадская прастора (Казакевіч 2011). Беларуская апазіцыя, абмежаваная ў магчымасці выбару месца правядзення мітынгаў, шэсцяў, была вымушана ісці часам на парушэнні дзеючага заканадаўства, у выніку ўдзельнікі аказваліся парушальнікамі і гублялі сілы ў барацьбе з дзяржаўнай бюракратыяй, ператвараючы гістарычную памяць пра незалежную беларускую нацыю ў барацьбу за гарадскую прастору сталіцы. Былі вымушаны адмовіцца ад правядзення мітынгаў на цэнтральных плошчах і шэсцяў па цэнтральным праспекце сталіцы, пагадзіўшыся з "ускраінай" сталіцы – кінатэатрам "Кастрычнік", вуліцай Сурганава і паркам Дружбы Наро-даў. Кіруючая эліта мела магчымасці пераўтварэння гарадской прасторы сталіцы. Па цэнтральным праспекце сталіцы ваенны парад праходзіў да 2000 г., затым ён быў перанесены да абеліска "Мінск – горад-герой". Паступова адбываліся змяненні назваў вуліц: пр. Машэрава перайменаваны ў пр. Пераможцаў (2005 г.), пр. Францыска Скарыны – у пр. Незалежнасці (2005 г.) і г.д. У Дзень Незалежнасці дзяржаўныя структуры маюць магчымасць задзейнічаць усе цэнтральныя плошчы, паркі і праспекты гарадоў Беларусі і сталіцы, а таксама раённыя пляцоўкі.

## СІМВАЛЫ І ЛОЗУНГІ

Займаюць асаблівае месца ў палітычных святах. Яны з'яўляюцца адпраўнымі пунктамі для актуалізацыі ўспамінаў пра гістарычныя падзеі, месцы і час, звязваюць мінулае з сучаснасцю. 1997-1998 гг. для афіцыйнага гістарычнага дыскурсу сталі пераходнымі ад Дня Незалежнасці 27 ліпеня да 3 ліпеня, таму ў газетах выкарыстоўваюцца сімвалы свету, якія носяць нейтральны характар: голуб, дзеці, маці. Пачынаючы з 1999 года ўводзіцца новая дзяржаўная сімволіка: герб і сцяг. Уладная палітычная эліта мае магчымасці ствараць або абнаўляць сімвалы і месцы памяці, звязаныя з Днём Незалежнасці: абноўлены Курган Славы, Лінія Сталіна, плошча Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, Музей Вялікай Айчыннай вайны – замацоўваюць афіцыйныя калектыўныя ўяўленні пра нацыю.

Апазіцыйнае свята, у сілу палітычных абставінаў і выкарыстання Дня Волі як магчымасці выказаць пратэст, мае іншы сімвалічны шэраг: барацьба і кроў; бел-чырвона-белы сцяг і герб “Пагоня” становяцца афіцыйнымі сімваламі апазіцыйнага руху. Як ужо адзначалася вышэй, памяць пра Вялікую Айчынную вайну спрыяла замацаванню рэжыму А.Г. Лукашэнкі. Чым аўтарытарнейшы станавіўся рэжым, чым больш жорстка праходзіла падаўленне апазіцыйных акцый у Дзень Волі, тым часцей з'яўляліся ў выглядзе сімвалаў Дня Незалежнасці ваенная тэхніка, салдаты, прэзідэнт з сынам у вайсковай форме. З 2006 года, калі прайшлі адносна шматлікія апазіцыйныя пратэсты супраць вынікаў прэзідэнцкіх выбараў, у сімвалічным шэрагу апазіцыйнага свята ўсё часцей з'яўляецца звон як сімвал заклiку ўвагі да жыцця, а ў сімволіцы афіцыйнага свята з'яўляецца салдат са зброяй у руках на фоне зенітнай устаноўкі. Лозунгамі Дня Волі становяцца не толькі заклікі да барацьбы за свабоду, веры ў перамогу, але і агучваецца раскол, які адбываецца ў апазіцыйных шэрагах пасля 2005 года, калі ўсё часцей пачынаюць гучаць абвінавачванні апазіцыйных палітыкаў у адрас адзін аднаго. На фоне апазіцыйных заклікаў да барацьбы, афіцыйныя лозунгі аб неабходнасці захавання памяці, пра прыгажосць Радзімы не нясуць негатыўнай сэнсавай нагрузкі, ствараюць вобраз лёгкасці, бяздзейнасці і менавіта дзякуючы гэтаму пераважаюць у масавай свядомасці: барацьба патрабуе намаганняў і ахвяр, а лёгкасць і бяздзейнасць не загружаюць.

## МОЎНЫЯ СРОДКІ

Асаблівае месца ў стварэнні і замацаванні пэўных уяўленняў пра мінулае займаюць апісальныя моўныя сродкі, якія становяцца складовай часткай культурнай памяці. Апісваючы свабодную, незалежную, прававую і дэмакратычную нацыянальную дзяржаву, абодва бакі выкарыстоўваюць падобныя тэрміны. Але ў выніку сэнсавы кантэкст атрымліваецца розным: калі дзеючая ўлада, пачынаючы з 1996 г. будуе незалежную, суверэнную дзяржаву, з кожным годам надзяляючы яе новымі эпітэтамі – моцная, квітнеючая, маладая, стабільная; ствараe вобраз і карцінку ў выглядзе святочнага дабрабыту ў краіне, моцнай і эфектыўнай улады, апісвае нацыю як мудрую, шматпакутную; то апазіцыйныя сілы выкарыстоўваюць дадзеныя словы ў кантэксце антонімаў да існага рэжыму і ў якасці каштоўнасцяў, за якія неабходна

змагацца. Афіцыйныя характарыстыкі нацыі накіраваны на фарміраванне ўстойлівай сувязі з гістарычнымі падзеямі савецкага мінулага, уяўленняў аб беларускай нацыі, якая жыве ў адзінай сям'і з рускім народам. Альтэрнатыўны погляд ва ўмовах супраціву існаму рэжыму прыводзіць да разумення беларускай нацыі як нацыі "змагароў" за свабоду.

## ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ

Аналізуючы гістарычныя факты, якія фарміруюць нацыянальную памяць пра мінулае, трэба зазначыць, што палітычныя святы Дзень Незалежнасці і Дзень Волі не толькі выкарыстоўваюць розныя гістарычныя перыяды, але і абгрунтоўваюць сваё бачанне нацыі і дзяржавы на ўзаемнай крытыцы і супрацьпастаўленні двух прапанаваных нацыянальных праектаў. Пры гэтым у абодвух дыскурсах прысутнічаюць элементы забыцця і выцяснення. У афіцыйным гістарычным дыскурсе Вялікая Айчынная вайна становіцца барацьбой выключна беларускага народа супраць фашызму, якая набывае форму масавага вызваленчага руху, вобраз савецкага народа блякне ў параўнанні з вобразам беларусаў-пераможцаў. Выцясняюцца такія гістарычныя факты, як прыняцце Дэкларацыі аб Незалежнасці Беларусі, акцэнт з 3 ліпеня – як дня вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў – пераносіцца на дзень вызвалення Беларусі ў ходзе аперацыі "Баграціён". Уяўленні пра нацыю і дзяржаву ў рамках Дня Волі з'яўляюцца ўвасабленнем гістарычнай памяці аб стварэнні Беларускай Народнай Рэспублікі, яны актыўна падтрымліваюцца апазіцыйна настроенай сацыяльнай групай, але не могуць пашырыцца ў сувязі з абмежаванасцю камунікацыі. Неабходна адзначыць, што праз засяроджанне на канкрэтных ідэях уяўлення беларускай нацыі знікае агульнае бачанне гісторыі беларускага народа. Афіцыйны дыскурс ахоплівае перыяд Вялікай Айчыннай вайны і постсавецкі перыяд, а апазіцыйны засяродзіўся на стварэнні БНР, у выніку барацьбы губляецца важнасць усёй гісторыі Беларусі і ўрокаў, якія беларуская нацыя павінна з яе выняць.

## АНАЛІЗ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ СТРАТЭГІЙ ПАЛІТЫЧНЫХ ЭЛІТ ПРЫ ФАРМІРАВАННІ ПЭЎНЫХ УЯЎЛЕННЯЎ ПРА НАЦЫЮ І ДЗЯРЖАВУ

Намі быў праведзены аналіз эфектыўнасці фарміравання пэўных уяўленняў пра нацыю і дзяржаву шляхам апытання і інтэрв'ю. Апытальнік прад'яўляўся вучням і настаўнікам школы, складаўся з наступных пытанняў:

1) Якія святы, на Ваш погляд, з'яўляюцца самымі важнымі святамі беларускай дзяржавы? 2) Ці ведаеце вы пра неафіцыйныя палітычныя святы? 3) Калі адказ станоўчы, то пералічыце вядомыя Вам святы (памятныя даты). 4) Якія святы, на ваш погляд, маюць палітычнае значэнне? (Новы год, Дзень Перамогі, Раство Хрыстова, Дзяды, Вялікдзень, Чарнобыльскі шлях, Дзень Незалежнасці, Купалле, Дзень Волі). 5) Калі адзначаюць Дзень Незалежнасці ў Рэспубліцы Беларусь? 6) Што ўспамінаюць у Дзень Незалежнасці? 7) Якой падзеі ён прысвечаны? 8) Чым Дзень Незалежнасці адрозніваецца ад іншых святаў? 9) Якія памятныя мясціны нагадваюць Вам пра гэтае свята? 10) Ці былі ў гісторыі Беларусі іншыя даты, звязаныя

з Днём Незалежнасці? 11) Калі ў Беларусі адзначаюць Дзень Волі? 12) Якой падзеі прысвечаны Дзень Волі? 13) Ці ведаеце вы культурна-гістарычныя помнікі, звязаныя з падзеямі 25 сакавіка? 14) З якім месцамі ў горадзе (сталіцы) ў Вас асацыюецца гэтае свята?
Інтэрв'ю падзялялася на дзве часткі – пра Дзень Незалежнасці і Дзень Волі.

***Пра Дзень Волі:*** 1) Колькі год вы ўжо наведваеце Дзень Волі? Што для Вас значыць гэты дзень і як вы рыхтуецеся да гэтага дня? 2) Што вы адчуваеце ў гэты дзень? 3) З чым асацыюецца ў вас гэтае сьвята? 4) У які год Дзень Волі для Вас быў асабліва запамінальным? Чаму? 5) Ці адзначаеце вы яшчэ неяк гэты дзень (акрамя выхаду на акцыю)? 6) Як праходзіць гэтае свята? 7) Ці з'явіліся ўжо нейкія традыцыі правядзення? 8) Ці было няўдалае святкаванне "Дня Воля"? Чаму? 9) Ці змяніўся фармат свята за апошні час? 10) Якія сімвалы свята? 11) Калі б вы давалі вызначэнне Дзень Волі – гэта .... 12) Што вы можаце сказаць пра людзей, што прыходзяць на гэты гэта свята? 13) Што Вас аб'ядноўвае? 14) Што вы змянілі бы б святкаванні ў наступным годзе? 15) Без чаго вы не ўяўляеце Дня Волі? 16) З якімі месцамі ў горадзе ў вас асацыюецца Дзень Волі? 17) Як Дзень Волі, на ваш погляд, гістарычна звязаны з сённяшнім днём? 18) Калі б у вас была магчымасць публічнага выступу ў гэты дзень, для ўсяго беларускага народа, то што б вы сказалі?

***Пра Дзень Незалежнасці:*** 1) Ці наведваеце вы святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню Незалежнасці? Якія? 2) Што вы адчуваеце ў гэты дзень? 3) Які Дзень Незалежнасці стаў для вас найбольш запамінальным? Чаму? 4) Ці змянілася святкаванне Дня Незалежнасці за ўсе гады незалежнасці Беларускай дзяржавы? 5) Без чаго вы не ўяўляеце святкаванне Дня Незалежнасці? 6) Ці было няўдалае святкаванне Дня Незалежнасці? Чаму? 7) Што вы можаце сказаць пра людзей, што прыходзяць на свята? 8) Што выклікае ў вас радасць, шчаслівыя перажыванні ў гэты дзень? 9) Што негатыўна ўплывае на вас у гэты дзень? 10) Як, на Ваш погляд, святкаванне Дня Незалежнасці гістарычна звязана з сённяшнім днём? 11) З якімі месцамі ў горадзе асацыюецца ў вас гэты дзень? 12) Калі б вы давалі вызначэнне: "Дзень Незалежнасці" – гэта ... 13) Чым сімвалічны гэты дзень? 14) Калі б у вас была магчымасць публічнага выступу ў гэты дзень, для ўсяго беларускага народа, то што б вы сказалі? 15) Чым для Вас адрозніваецца Дзень Незалежнасці ад Дня Перамогі? 16) Што самае важнае ў Дні Незалежнасці, на ваш погляд?

Інтэрв'юяванне праходзіла ў даволі складаных абставінах, ва ўмовах, калі гаварыць пра палітыку ў дзяржаўнай установе не прынята. У працэсе інтэрв'юявання была выяўлена наступная тэндэнцыя: рэспандэнты, якія не адносяць сябе да апазіцыйна настроеных, імкнуліся адказаць не так, як яны думаюць, а так, як, на іх думку, ад іх чакаюць, у адпаведнасці з афіцыйным пунктам гледжання. Тым не менш, прадстаўленыя вынікі дазваляюць разгледзець некаторыя аспекты эфектыўнасці стратэгій палітычнай эліты, арганізатараў святаў і сродкаў масавай інфармацыі, накіраваныя на замацаванне пэўных уяўленняў пра нацыю і дзяржаву.

У першую чаргу, варта зазначыць, што ўдзельнікі апытання не зусім арыентуюцца ў палітычнай прасторы, не адрозніваюць палітычныя плыні і партыі. Найбольш ім вядомыя Камуністычная партыя Беларусі і БНФ, што ў дастатковай ступені суадносіцца з існымі комплексамі ўяўленняў. Нізкі ўзровень арыентацыі ў палітычнай прасторы прыводзіць да таго, што рэспандэнты не адрозніваюць святы, якія маюць палітычнае значэнне, выбар

ажыццяўляюць спантанна, кіруючыся ўласнымі перавагамі, таму Дзень Незалежнасці ў калектыўных уяўленнях, як важнае свята беларускай дзяржавы, займае другую пазіцыю пасля Дня Перамогі. Такім чынам, дыскурс Вялікай Айчыннай вайны, на які абапіраецца рэжым, адціскае калектыўныя ўяўленні пра нацыю як пра суверэнны незалежны народ. Пры гэтым многія рэспандэнты адзначаюць, што, на іх думку, Дзень Незалежнасці па сутнасці павінен быць звязаны з непасрэднай незалежнасцю Рэспублікі Беларусь пасля распаду СССР, а не з днём вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Акрамя таго, у афіцыйным дыскурсе паступова выцясняецца памяць аб 3 ліпеня як дні вызвалення горада Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, ён становіцца днём вызвалення ўсёй Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, што прыводзіць да яшчэ большай размытасці сувязі паміж Днём Незалежнасці і днём вызвалення. 84% рэспандэнтаў-навучэнцаў не могуць звязаць ніякую гістарычную падзею з Днём Незалежнасці. У другую чаргу, можна адзначыць, што 60% рэспандэнтаў не праводзяць адрозненне паміж афіцыйнымі і неафіцыйнымі палітычнымі святамі і лічаць, што свята можа быць замацавана толькі ў афіцыйным календары святочных дзён. Толькі траціна рэспандэнтаў вызначылі Дзень Волі як неафіцыйнае палітычнае свята. Пры гэтым Дзень Волі асацыюецца з прыняццем 3 устаўной граматы і стварэннем Беларускай Народнай Рэспублікі толькі ў 40% рэспандэнтаў. Размыты ўяўленні пра акцыі, якія праходзяць у Дзень Волі. Амаль ніхто не ведае пра гістарычныя месцы ў горадзе Мінску, звязаныя з падзеямі пачатку XX стагоддзя, абвяшчэння БНР. Гістарычная прастора Дня Волі звязваецца з кінатэатрам “Кастрычнік”, пл. Бангалор і аўтазакамі ў дзясятай часткі рэспандэнтаў.

Удзельнікаў інтэрв’ю можна падзяліць на дзве групы: якія наведваюць Дзень Волі (35%) і не наведваюць Дзень Волі (65%). Сярод апытаных няма рэспандэнтаў, якія б наведвалі абодва святы. Большасць рэспандэнтаў не ўдзельнічаюць у мерапрыемствах, звязаных з Днём Незалежнасці.

Рэспандэнты, якія ўдзельнічаюць у акцыях Дня Волі, лічаць, што Дзень Волі – гэта беларускі дзень незалежнасці, свята першага абвяшчэння суверэннай незалежнай беларускай дзяржаўнасці, дзень свабоды і гонару за народ, вельмі сімвалічны дзень; для іх гэта свята, у якое можна адчуць хваляванне, радасць, яднанне з мінулымі пакаленнямі стогадовай даўніны, гонар за тое, што беларусы – нацыя, гонар за краіну. Пры гэтым удзельнікі адзначаюць расчараванне, звязанае з арганізацыяй акцый. Хочуць бачыць іншых арганізатараў, больш творчых людзей, не толькі палітыкаў. Дадзенае свята, адзначаюць яны, мае патрэбу ў далучэнні “непартыйных” людзей, бо ў большасці сваёй людзі, якія прыходзяць на свята – гэта людзі, звязаныя з якім-небудзь палітычным рухам або партыяй.

У рэспандэнтаў, якія не наведваюць мерапрыемства, прымеркаванае да Дня Волі, але якія сочаць за гэтай падзеяй і пагадзіліся адказаць на пытанні (27% рэспандэнтаў), сфарміраваныя наступныя ўяўленні: гэта свята свабоды, незалежнасці, самастойнасці, магчымасці азірнуцца назад. Гэты дзень адзначаюць людзі, якім не ўсё роўна, патрыёты і сумленне нацыі, якія ведаюць і шануюць гісторыю сваёй краіны. Гэтых людзей аб’ядноўваюць агульнасць поглядаў, ідэя, вера, гісторыя Рэспублікі Беларусь і тое, што мы – беларусы.

У якасці традыцыйных сімвалаў Дня Волі рэспандэнты адзначаюць бел-чырвона-белы сцяг і герб “Пагоня”, а Дня Незалежнасці – А.Г. Лукашэнка, Коля, сцягі і гулянні. Значнасць Дня Незалежнасці для рэспандэнтаў вельмі размытая: гэта не толькі магчымасць з’ехаць з Мінска

ў выхадны дзень, але і дадатковы дзень да водпуску; для рэспандэнтаў, якія спрабуюць праявіць сваю грамадзянскую пазіцыю – гэта дзень, калі людзі павінны ўспомніць пра краіну, у якой жывуць, пры гэтым дадзеныя рэспандэнты не пазначаюць асабістае стаўленне да дадзенага дня.

Негатыўна ўспрымаецца рэспандэнтамі, якія наведваюць афіцыйныя мерапрыемствы, пампезнасць дадзенага свята. Гэтыя рэспандэнты адзначаюць, што гістарычна дадзенае свята не звязана з сённяшнім днём і нацыяй, а існуе выключна па волі аднаго чалавека. Рэспандэнтаў раздражняе пастаяннае мусіраванне тэмы Вялікай Айчыннай вайны, бо Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь – гэта не толькі вызваленне нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Рэспандэнты стаміліся і ад "савецкіх перажыткаў" у правядзенні афіцыйных мерапрыемстваў. Рэспандэнты адзначалі, што Дзень Незалежнасці практычна нічым не адрозніваецца ад Дня Перамогі.

Неабходна адзначыць, што тыя, хто ходзіць на Дзень Волі, сцвярджаюць, што не стануць наведваць Дзень Незалежнасці па некалькіх прычынах:

• 3 ліпеня важная дата для горада, але не для ўсёй краіны, бо гэта вызваленне Мінска, а не ўсёй краіны. За ўсю гісторыю Беларусі Мінск вызвалялі некалькі разоў, дадзенае вызваленне было проста апошнім.

• Дзень вызвалення – не такое маштабнае свята, якім павінен быць Дзень Незалежнасці. Гэта павінен быць дзень, калі нацыя атрымала свой суверэнітэт ці незалежнасць, звязаную з гісторыяй менавіта гэтых паняццяў.

• Тэма Вялікай Айчыннай вайны не павінна быць наўпрост звязана з незалежнасцю краіны і перакрываць усю гісторыю дзяржавы.

Рэспандэнты, якія не наведваюць Дзень Волі, тлумачаць гэта тым, што не бачаць у гэтым сэнсу. Да гэтай групы адносяцца тыя, хто баіцца затрыманняў і быць ідэнтыфікаванымі з апазіцыянерамі ці тымі, хто не зусім згодны з палітычным рэжымам, але яны хочуць убачыць іншую магчымасць выказвання нязгоды з існуючай палітыкай улады. Ёсць і такія, якія кажуць пра арганізатараў як пра псеўдапалітыкаў, г.зн. тых, якія існуюць за кошт рэжыму і самі імкнуцца дасягнуць выгод для сябе, а нацыя іх на самай справе не вельмі цікавіць.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Фрагментацыя агульнанацыянальнай культурнай гістарычнай памяці. Існыя святы не аб'ядноўваюць беларусаў вакол агульных уяўленняў пра мінулае і спрыяюць расколу беларускага грамадства, падзяляючы на "сваіх" і "чужых".

Сімвалы і візуальныя вобразы часта з'яўляюцца важнымі, не заўсёды ўсвядомленымі элементамі ўяўленняў і аказваюць уплыў на працэсы прыгадвання. Так, бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня" звязваюцца не толькі з гістарычным момантам незалежнасці Беларусі, але і з апазіцыйным палітычным рухам супраць дзейнай улады. У той жа час, узмацненне жорсткасці палітычнага рэжыму ў Беларусі наглядным чынам адлюстроўваецца ў з'яўленні новых сімвалаў падчас святкавання Дня Незалежнасці (якія пры гэтым не з'яўляюцца новымі для іншых святаў – напрыклад, Дня Перамогі). Прыкладам можа служыць з'яўленне ваенізаваных сімвалаў падчас святаў – сімвалаў, закліканых увасабляць моцную

нацыю і дзяржаву, але дысануючых з вобразам талерантнай, памяркоўнай, добрай і мудрай беларускай нацыі.

Перавага афіцыйнага свята, з пункту гледжання яго замацавання ў часе, складаецца ў выразнай сувязі з пэўнай святочнай датай календара. Зыходзячы з большасці адказаў рэспандэнтаў, апазіцыйнае свята суадносіцца з датай 25 сакавіка, але не з самім гістарычным мінулым Беларусі (фактам стварэння БНР). Дзень Волі паступова губляе сувязь сучаснасці з гістарычнай датай, што не спрыяе прыцягненню новых удзельнікаў акцый. Гарадскі ландшафт адыгрывае важную ролю ў замацаванні калектыўных уяўленняў пра нацыю і дзяржаву, звязваючы гісторыю з сучаснасцю, ператвараючы свята ў памятныя гістарычныя месцы. Рэспандэнты ўсталёўваюць асацыятыўныя сувязі паміж Днём Незалежнасці і мемарыяльнымі комплексамі, прысвечанымі, у першую чаргу, Вялікай Айчыннай вайне - з Лініяй Сталіна, Музеем Вялікай Айчыннай вайны, Курганам Славы.

Канфлікт з уладай удзельнікаў і арганізатараў Дня Волі абумоўлівае няўстойлівасць сувязі паміж месцам правядзення і самім палітычным святам. Замацоўваюцца ўяўленні аб ўзаемасувязі шэсця, прызначаных вуліц, пл. Бангалор (для шматлікіх удзельнікаў шэсце заканчваецца затрыманнямі), пры гэтым неназіраецца сувязі са зместам самога свята, з абвяшчэннем незалежнасці БНР у 1918 годзе, з удзельнікамі тых памятных падзей і з гістарычнымі памятнымі месцамі сталіцы. Акрамя таго, увага сродкаў масавай інфармацыі ў апошнія гады засяроджваецца на колькасці і размаху мерапрыемства, але не на фарміраваных калектыўных уяўленнях і іх прасторавых і часавых рамках.

Аналіз дыскурсу дазволіў зразумець, што існыя палітычныя святы і рытуалы спрыяюць размыванню ўяўленняў аб нацыі і дзяржаве. Афіцыйнае свята Дзень Незалежнасці практычна не імкнецца замацаваць калектыўныя ўяўленні пра дзяржаву і нацыю, непасрэдна звязаныя з дзяржаўнасцю, незалежнасцю і суверэнітэтам. Створаны дыскурс нацыі, “народжанай” у Вялікай Айчыннай вайне, не аб’ядноўвае прыхільнікаў уладнай і апазіцыйнай элітаў, але, у той жа час, існуе, не ў апошнюю чаргу, за кошт крытыкі дыскурсу апанента.

Акрамя таго, афіцыйнае святкаванне Дня Незалежнасці 3 ліпеня ўносіць няяснасць і ў калектыўныя ўяўленні пра Вялікую Айчынную вайну, прадстаўляючы дзень вызвалення Мінска як дзень вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У апазіцыйных святах акцэнт ссоўваецца з нацыянальнага гістарычнага складніка на палітычныя акцыі, звязаныя непасрэдна з пратэстам супраць рэжыму А.Г. Лукашэнкі. У выніку агульнанацыянальная культурная памяць распадаецца, становіцца здабыткам пакаленняў, і кожнае пакаленне памятае толькі тую гісторыю, якая вывучалася ва ўстанове адукацыі, і тое даволі цьмяна. Для палітычных элітаў гістарычная памяць, як і калектыўныя ўяўленні пра нацыю і дзяржаву, становяцца другаснымі, асноўная ўвага надаецца прыцягненню ўдзельнікаў да мерапрыемстваў. У выніку беларускі народ не мае адзінага праекту беларускай ідэнтычнасці і вобразу нацыі. Дадзеныя тэндэнцыі ў цэлым аказваюцца выгадныя існаму палітычнаму рэжыму Беларусі, для якога размытыя калектыўныя ўяўленні пра гісторыю нацыі і дзяржавы даюць магчымасць пастаяннай інструменталізацыі мінулага для дыскрэдытацыі і маргіналізацыі альтэрнатыўных праектаў палітычнай будучыні.

# КРЫНІЦЫ

*1. Андерсон Б. (2001) Воображаемые сообщества. Размышления об истоках и распространении национализма. Москва: "Канон-Пресс-Ц", "Кучково Поле". 288 с.*

*2. Ассман Я. (2004) Культурная память. Письмо, память о прошлом и политическая идентичность в высоких культурах древности. Москва: Языки славянской культуры.*

*3. Выступление А.Г. Лукашенко. (1997) У Беларуси есть все, чтобы уверенно и энергично двигаться вперед – к благополучию и процветанию. Рэспубліка, 140: 2.*

*4. Казакевич А. (2011) Символика места: забывание и фрагментация "советского" в ландшафте Минска. Неприкосновенный запас, 80(6).*

*5. Лазарь Л. (1996) А.Г. Лукашенко "Мы не склоним головы перед испытаниями и трудностями, поскольку мы - белорусы". Рэспубліка, 193: 1.*

*6. Ластовский А. (2009) Городской ландшафт как место памяти и идентичности. Палітычная сфера, 12: Sage: 17 – 28.*

*7. Ластовский А. (2009) Специфика исторической памяти в Беларуси: между советским прошлым и национальной перспективой. Вестник общественного мнения, 4.*

*8. Малахов В. (2004) Иноходец. Отечественные записки. Журнал для медленного чтения, 3 (18).*

*9. Народная Воля. Сакавік – красавік. 1996 – 2014.*

*10. Наша Ніва. Сакавік – красавік. 1996 – 2014.*

*11. Нора П. (2009) Франция-память. Санкт-Петербург: Издательство С.-Петербургского университета.*

*12. Петрусевич А. (1996) Што для нас, беларусаў, значыць 25 сакавіка? Народная Воля, 45.*

*13. Рэспубліка. Чэрвень. 1996 – 2014.*

*14. Хальбвакс М. (2005) Коллективная и историческая память. Неприкосновенный запас, 2 – 3.*

*15. Хальбвакс М. (2007) Социальные рамки памяти. Москва: Новое издательство.*

*16. Assman A. (2008) Canon and Archive. In: Erll A. Cultural Memory Studies. Berlin. New York: Walter de Gruyter: Sage: 97 – 108.*

*17. Assman J. (2008) Memory: Individual, Social, and Cultural. In: Erll A. Cultural Memory Studies. Berlin. New York: Walter de Gruyter: Sage: 109 – 118.*

*18. Goujon A. (2010) Memorial Narratives of WWII Partisans and Genocide in Belarus. East European Politics and Societies, 1 (24): 6 – 25.*

*19. Hobsbawm E. (1983) The Invention of Tradition. Introduction: Inventing Traditions. London, New York: Cambridge University Press.*

*20. Hobsbawm E. (1983) The Invention of Tradition. Mass-Producing Traditions: Europe, 1870 - 1914 . London, New York: Cambridge University Press.*

*21. Lukes S. (1975) Political Ritual and Social Integration. Sociology. Available at: http://soc.sagepub.com/content/9/2/289 (Accessed 02 May 2015).*

# ГРАМАДЗЯНСКАЯ І ПАЛІТЫЧНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ СТУДЭНТАЎ: АНАЛІЗ НА ПРЫКЛАДЗЕ СТУДЭНТАЎ ЕГУ

***Масланава Дар'я*** бакалаўр палітычных навук (ЕГУ), магістрантка праграмы "Публічная палітыка" (ЕГУ).

***Анатацыя.*** Дадзены артыкул прысвечаны аналізу ўплыву ўніверсітэта на грамадзянска-палітычную актыўнасць беларускіх студэнтаў на прыкладзе даследавання, праведзенага ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце (тут і далей ЕГУ). Выбар аб'екта даследавання звязаны з цікавасцю да аналізу ролі дадзенага ўніверсітэта ў палітычнай сацыялізацыі беларускіх студэнтаў. Асноўнае пытанне даследавання палягала ў тым, ці сапраўды ўніверсітэт (у дадзеным выпадку – ЕГУ), які лічыцца адным з асноўных агентаў палітычнай сацыялізацыі, праз адукацыйны працэс уплывае на палітычную актыўнасць і грамадзянска-палітычныя ўстаноўкі студэнтаў. Аб'ектам даследавання з'яўляюцца арыентацыі, устаноўкі і актыўнасці студэнтаў ЕГУ, якія можна аднесці да сферы палітычнага і грамадзянскага ўдзелу ў перыяд з 2012 па 2015 гг.

Тэарэтычнай асновай даследавання сталі працы Г. Алманда (G. Almond), З. Верба (S. Verba), Г. Паўэла (G. Powell), Т. Лукмана (T. Luckmann) і інш., якія прысвечаны разгляду паняццяў і структуры палітычнай сацыялізацыі, палітычнай актыўнасці і палітычнай культуры.

У аснову рэпрэзентатыўнага даследавання быў пакладзены метад анкетнага апытання з мэтай вывучэння ўплыву ўніверсітэта на грамадзянска-палітычныя ўстаноўкі і палітычную актыўнасць. На падставе атрыманых вынікаў былі зроблены наступныя высновы: універсітэт (ЕГУ) уплывае на грамадзянска-палітычныя ўстаноўкі беларускіх студэнтаў праз працэс адукацыі і прафесійную дзейнасць выкладчыкаў, хоць пры гэтым і не з'яўляецца галоўным / першым па значнасці агентам палітычнай сацыялізацыі. Паводле думкі студэнтаў, такія інстытуты, як СМІ і сям'я, аказваюць большы ўплыў на іх грамадзянска-палітычныя ўстаноўкі і актыўнасць. Разам з тым, як паказала даследаванне, узровень удзелу студэнтаў у жыцці ўніверсітэта па-за навучальным працэсам часткова адпавядае ўзроўню іх палітычнай і грамадзянскай актыўнасці.

Дадзены артыкул можа быць карысным для даследнікаў палітычнай сацыялізацыі, палітычнай і грамадзянскай актыўнасці грамадзянаў Беларусі, сучаснай вышэйшай адукацыі.

***Ключавыя словы:*** *беларускія студэнты, вышэйшая адукацыя ў Беларусі, палітычная / грамадзянская актыўнасць, палітычная сацыялізацыя, грамадзянска-палітычныя ўстаноўкі, універсітэт.*

## УВОДЗІНЫ

Аналіз агентаў палітычнай сацыялізацыі, палітычных установак, арыентацый і мадэляў палітычнай актыўнасці ўяўляецца важным у кантэксце недэмакратычнага рэжыму, у нашым выпадку – у сітуацыі Беларусі. Гэта абумоўлена тым, што паспяховасць і якасць пераходу да дэмакратычнага палітычнага рэжыму непасрэдна звязана з адпаведнымі палітычнымі каштоўнасцямі, арыентацыямі і формамі палітычнай актыўнасці грамадзян.

Паводле прац вядучых тэарэтыкаў у вывучэнні палітычнай культуры і сацыялізацыі, палітычная культура ўключае ў сябе палітычныя каштоўнасці, арыентацыі грамадзян да палітычнай сістэмы і засвойваецца менавіта праз палітычную сацыялізацыю. У сваю чаргу, палітычная сацыялізацыя з’яўляецца ўсёахопным працэсам перадачы і засваення кагнітыўных складнікаў палітычнай культуры. Паводле пэўнага тыпу палітычнай культуры адбываецца пабудова адпаведнай мадэлі палітычнай актыўнасці. Такім чынам, палітычная актыўнасць уяўляецца складаным працэсам, звязаным з палітычнай сацыялізацыяй і палітычнай культурай.

Полем для даследавання палітычнай актыўнасці выступаў адзін з найважнейшых агентаў палітычнай сацыялізацыі – універсітэт. Ва ўніверсітэце ствараюцца ўмовы для таго, каб студэнты маглі атрымаць пэўныя веды пра грамадзянскую і палітычную сферы, ролю актыўнасці грамадзянаў у гэтым і г.д. У прыватнасці, даследаванне прысвечана ролі ўніверсітэта (на прыкладзе ЕГУ) у выбары беларускімі студэнтамі пэўных мадэляў палітычнай актыўнасці. ЕГУ быў выбраны для аналізу менавіта таму, што ён пазіцыянуецца як адзіны беларускі ўніверсітэт, які не толькі з’яўляецца адукацыйнай пляцоўкай, але і дзейнічае на прынцыпах дэмакратычнага самакіравання (Статут ЕГУ 2014:3), што прадугледжвае актыўную пазіцыю студэнтаў, іх удзел ва ўнутрыўніверсітэцкіх працэсах. ЕГУ павінен спрыяць пашырэнню ўдзелу студэнтаў у грамадскай, навуковай дзейнасці, а таксама фарміраванню такіх каштоўнасцяў, як павага і кампетэнтнасць, ініцыятыўнасць, пачуццё абавязку і адказнасці (Статут ЕГУ 2014:3). Такім чынам, можна меркаваць, што навучанне ва ўніверсітэце можа паўплываць на грамадзянскае выхаванне і выбар студэнтамі пэўнай мадэлі палітычнай актыўнасці.

Грунтуючыся на ўсіх пералічаных тэарэтычных і практычных установўках, мы вырашылі ацэньваць палітычную актыўнасць студэнтаў праз наступныя параметры:

- досвед палітычнага ўдзелу ўнутры ўніверсітэта і за яго межамі;
- цікавасць да бягучых сацыяльна-палітычных працэсаў у Беларусі і ў свеце;
- цікавасць да ўнутрыўніверсітэцкіх працэсаў кіравання;
- удзел у грамадзянскіх ініцыятывах, палітычных партыях і / ці арганізацыях грамадзянскай супольнасці.

## МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ

У якасці аб’екта даследавання выступалі грамадзянскія і палітычныя актыўнасці, а таксама адпаведныя ўстаноўкі ў студэнтаў ЕГУ з першага па трэці курс усіх бакалаўрскіх праграм вочнай формы навучання[1] ў перыяд з 2011 па 2015 гг. Паколькі інфармацыю пра грамадзянска-палітычную актыўнасць студэнтаў ЕГУ могуць даць толькі самі студэнты,

асноўным метадам збору дадзеных стала анкетнае апытанне. Анкетаванне з'яўлялася пераважна індывідуальным. Кожная група студэнтаў атрымоўвала анкету, адказы на пытанні якой студэнты фіксавалі ў пісьмовай форме.

Аб'ём генеральнай сукупнасці склаў 340 студэнтаў. Аб'ём выбарнай сукупнасці – 182 рэспандэнты пры давернай вераемнасці 95%. Выбарная сукупнасць з'яўлялася кластарнай, бо кожны кластар меў адносна аднолькавую колькасць рэспандэнтаў. Кластары падзяляліся ў залежнасці ад праграмы, формы і курса навучання.

У якасці першай гіпотэзы было меркаванне аб тым, што ўніверсітэт (ЕГУ) як агент палітычнай сацыялізацыі праз адукацыйны працэс уплывае на палітычную актыўнасць і адпаведныя арыентацыі, устаноўкі і актыўнасці студэнтаў, што выяўляецца ў змяненні:

- практык іх палітычнага ўдзелу ўнутры ўніверсітэта і за яго межамі;
- ступені цікавасці да бягучых сацыяльна-палітычных працэсаў у Беларусі і свеце;
- ступені ўдзелу ў розных палітычных і/ці грамадзянскіх ініцыятывах.

Другая гіпотэза засноўвалася на меркаванні, што ўзровень студэнцкага ўдзелу ў жыцці ўніверсітэта па-за навучальным працэсам можа адпавядаць узроўню актыўнасці студэнтаў у грамадзянска-палітычнай сферы.

Паколькі ў абедзвюх гіпотэзах прысутнічаюць такія паняткі, як "студэнцкая актыўнасць" і "грамадзянска-палітычная актыўнасць", якія несумненна з'яўляюцца досыць расплывістымі для вывучэння паняткамі, важна пазначыць індыкатары, якія б дазволілі эмпірычна даследаваць актыўнасць.

У якасці эмпірычных індыкатараў палітычнай і грамадзянскай актыўнасці, на падставе даследаванняў грамадзянска-палітычнай актыўнасці Г. Алманда (G. Almond), Г. Паўэла (G. Powell), былі вылучаны наступныя:

• Удзел (канвенцыйны і неканвенцыйны) у палітычных мерапрыемствах як у Беларусі, так і за яе межамі. Як правіла, канвенцыйны ўдзел – гэта ўдзел у выбарах, а таксама сяброўства ў палітычных партыях/рухах. Адпаведна, неканвенцыйны ўдзел – гэта ўдзел уакцыях пратэсту, мітынгах і г.д.

• Удзел у грамадзянска-палітычных ініцыятывах/аб'яднаннях. Гэта дазваляе вызначыць палітычную ідэнтыфікацыю.

• Выяўленне цікавасці да сацыяльна-палітычных працэсаў.

У сваю чаргу, асноўныя індыкатары вызначэння студэнцкай актыўнасціў ЕГУ былі звязаны з удзелам у студэнцкім жыцці ўніверсітэта па-за навучальным працэсам:

• Удзел у актыўнасцях, якія былі арганізаваныя студэнтамі.

• Удзел у публічных актыўнасцях і працы органаў кіравання і самакіравання ЕГУ.

У залежнасці ад ступені студэнцкай актыўнасці былі сфарміраваны тры мадэлі ўдзелу: актыўны, традыцыйны і пасіўны ўдзел. Актыўная мадэль характарызавалася прыняццем удзелу ў жыцці ўніверсітэта з максімальнай ступенню праявы ў параўнанні з традыцыйнай і пасіўнай

*[1] - Падчас правядзення даследавання (2015 г.) у ЕГУ дзейнічалі наступныя навучальныя праграмы: "Культурная спадчына і турызм", "Міжнароднае права і права Еўрапейскага саюза", "Візуальны дызайн і медыя", "Медыя і камунікацыя" і "Візуальная культура і крэатыўныя індустрыі".*
*У анкетным апытанні ўдзельнічалі студэнты з першага па трэці курс вочнай формы навучання ўсіх праграм. У апытанне не былі ўключаны студэнты чацвёртага курса, паколькі на момант правядзення даследавання яны былі на пераддыпломнай практыцы.*

групамі. Адпаведна, прадстаўнікі традыцыйнай мадэлі ўдзельнічалі ў жыцці ўніверсітэта, але з сярэдняй ступенню праявы дадзенай актыўнасці. Пасіўная мадэль характарызавалася няўдзелам у жыцці ўніверсітэта і нізкай ступенню ўдзелу.

## ВЫЯЎЛЕННЕ ЎЗРОЎНЮ АКТЫЎНАСЦІ СТУДЭНТАЎ ЕГУ

Згодна з праведзеным даследаваннем, актыўную мадэль удзелу прадэманстравалі 28 студэнтаў (15%). Яны характарызаваліся найбольш актыўным удзелам у студэнцкіх і публічных актыўнасцях, у працы органаў кіравання і самакіравання ўніверсітэтам.

Мадэль традыцыйнага ўдзелу паказалі 93 студэнты (51%), якія радзей прымалі ўдзел у публічных, студэнцкіх мерапрыемствах, а таксама ў кіраванні і самакіраванні ўніверсітэтам. Актыўнасць дадзеных студэнтаў мела эпізадычны характар.

Пасіўную мадэль удзелу паказаў 61 студэнт (34%). Дадзеная група, у параўнанні з дзвюма іншымі групамі, дэманстравала мінімальную ступень студэнцкай актыўнасці, як і чакалася.

## АНАЛІЗ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ АКТЫЎНАСЦІ СТУДЭНТАЎ ЕГУ

### УДЗЕЛ У ПАЛІТЫЧНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАХ

Адным з важных крытэрыяў, які дазваляе ацаніць узровень палітычнай актыўнасці студэнтаў, з'яўляецца іх удзел у палітычных мерапрыемствах у Беларусі і за яе межамі (выбары, мітынгі, флэшмобы і інш.) у перыяд з 2012 па 2015 гг.

Неканвенцыйны грамадзянска-палітычны ўдзел у акрэсленых групах студэнтаў размеркаваны наступным чынам (гл. Графік 1).




**Графік 1: Неканвенцыйны грамадзянска-палітычны ўдзел трох груп студэнтаў**

50% студэнтаў актыўнай мадэлі прымалі ўдзел у грамадзянска-палітычных мерапрыемствах і тым самым часцей удзельнічалі ў падобных мерапрыемствах, чым прадстаўнікі іншых груп, бо праяўлялі такую актыўнасць 33% студэнтаў традыцыйнай мадэлі ўдзелу і 26% прадстаўнікоў пасіўнай мадэлі ўдзелу.

Для студэнтаў актыўнай і традыцыйнай мадэляў часцей грамадзянска-палітычная актыўнасць выяўлялася ў неканвенцыйным удзеле. У сваю чаргу, студэнты актыўнай мадэлі ўдзелу мелі больш высокі ўзровень праявы дадзенай актыўнасці. Студэнты традыцыйнага ўдзелу мелі сярэдні ўзровень актыўнасці, а група студэнтаў пасіўнага ўдзелу была найменш актыўнай у параўнанні з дзвюма папярэднімі групамі. Таксама тры групы студэнтаў часцей прымалі ўдзел у мітынгах і / ці шэсцях, чым у флэшмобах.

Адносна канвенцыйнага ўдзелу студэнтаў варта заўважыць, што студэнты пасіўнай мадэлі часцей казалі пра сваю неканвенцыйную дзейнасць (гл. Графік 2).




**Графік 2: Канвенцыйны палітычны ўдзел трох груп студэнтаў**

У адпаведнасці з дадзенымі, студэнты пасіўнай і традыцыйнай мадэлі прымалі больш актыўны ўдзел у прэзідэнцкіх выбарах, чым студэнты актыўнай мадэлі. Аднак “актывісты” часцей прымалі ўдзел у мясцовых выбарах, дзе, у сваю чаргу, ніводзін з рэспандэнтаў традыцыйнай мадэлі не прымаў удзелу. Таксама варта адзначыць, што студэнты традыцыйнай мадэлі прымалі ўдзел у галасаванні на парламенцкіх выбарах крыху актыўней, чым дзве іншыя групы. Па 2% студэнтаў з групаў традыцыйнага і пасіўнага ўдзелу адзначылі, што планавалі ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах 2015 года.

У дачыненні да агульнага размеркавання адказаў сярод усіх апытаных студэнтаў ЕГУ трэба адзначыць, што ступень іх удзелу ў палітычных мерапрыемствах характарызуецца як невысокая, бо толькі 34% студэнтаў праяўлялі палітычную актыўнасць (гл. Дыяграму 1).




**Дыяграма 1: Удзел студэнтаў ЕГУ ў палітычных мерапрыемствах**

УДЗЕЛ У ГРАМАДЗЯНСКІХ / ГРАМАДСКІХ ІНІЦЫЯТЫВАХ АЛЬБО АБ'ЯДНАННЯХ

Іншым важным крытэрыем, які дазваляе вызначыць узровень грамадзянска-палітычнай актыўнасці, з'яўляецца ўдзел у грамадзянскіх / грамадскіх аб'яднаннях і / ці ініцыятывах.

Паводле дадзеных, 29% студэнтаў групы актыўнай мадэлі прымалі ўдзел у грамадзянскіх / грамадскіх аб'яднаннях. Несумненна, дадзены паказнік не з'яўляецца высокім, аднак ён перавышае аналагічныя паказнікі груп традыцыйнай (6%) і пасіўнай (0%) мадэляў удзелу. Студэнты прымалі ўдзел у наступных ініцыятывах / аб'яднаннях: ЮНЭСКА, "Еўрапейская Беларусь", БХК, "Мова Нанова", удзельнічалі ў мясцовым самакіраванні, валанцёрстве і ў розных праектах НДА Беларусі і Літвы. Цікава, што большасць студэнтаў, якія заяўлялі, што прымалі падобны ўдзел, адмовіліся адзначыць, у якіх менавіта мерапрыемствах.

## ВЫКАЗВАННЕ ЦІКАВАСЦІ ДА БЯГУЧЫХ САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНЫХ ПАДЗЕЙ У БЕЛАРУСІ І Ў СВЕЦЕ

У цэлым, усе тры групы выяўляюць досыць высокі ўзровень цікавасці да інфармацыі прасацыяльна-палітычныя падзеі ў свеце і/ці ў Беларусі. Так, 68% студэнтаў актыўнай мадэлі ўдзелу цікавяцца інфармацыяй пра сацыяльна-палітычныя падзеі ў нашай краіне і ў свеце. Адметным падаецца тое, што пра зацікаўленасць у палітычных падзеях заявіла 64% студэнтаў пасіўнай мадэлі ўдзелу. У параўнанні з папярэднімі групамі, выказалі найменшую цікавасць студэнты традыцыйнага ўдзелу – 51%. Аднак зацікаўленасць у актуальнай інфармацыі пра падзеі ў Беларусі і ў свеце, галоўным чынам, мела высокі ўзровень ва ўсіх студэнцкіх групах.

Падсумоўваючы, важна адзначыць, што меркаванне пра тое, што ўзровень студэнцкай актыўнасці можа адпавядаць грамадзянска-палітычнай, пацвердзілася часткова, паколькі студэнты мадэляў традыцыйнага і пасіўнага ўдзелу ў рамках прыняцця ўдзелу ў палітычных

мерапрыемствах і ў праяве цікавасці да грамадзянска-палітычнай сферы не адпавядалі сваім базавым характарыстыкам і паказалі больш высокі ўзровень удзелу, чым гэта меркавалася раней.

## ГРАМАДЗЯНСКІЯ І ПАЛІТЫЧНЫЯ ЎСТАНОЎКІ СТУДЭНТАЎ

У рамках анкетнага апытання студэнтам было прапанавана адзначыць інстытуты, якія, на іх думку, уплываюць на грамадзянскую / палітычную актыўнасць. У анкеце прадугледжвалася магчымасць адзначыць некалькі варыянтаў адказаў альбо прапанаваць свой. Паводле меркаванняў студэнтаў, найбольшы ўплыў на іх палітычную і грамадзянскую актыўнасць аказваюць: СМІ (52%), сям'я (50%), універсітэт (41%), а таксама блізкае асяроддзе – сябры (35%) (гл. Дыяграму 2). Найменшы ўплыў на грамадзянска-палітычную актыўнасць студэнтаў аказваюць царква (7,1%) і школа (6%). Падаецца цікавым размеркаванне адказаў студэнтаў у дачыненні да школы. Перадусім, гэта звязана з тым, што ў тэорыі, менавіта ў рамках школы праз адукацыйны досвед дзеці пачынаюць сваё першае за межамі інстытута сям'і азнаямленне з грамадзянска-палітычнымі каштоўнасцямі і прынцыпамі палітычнага працэсу. Аднак, згодна з атрыманымі дадзенымі, школа мела найменшы ўплыў на грамадзянскую і палітычную актыўнасць беларускіх студэнтаў.




**Дыяграма 2: Адказы студэнтаў пра агентаў палітычнай сацыялізацыі, якія ўплываюць на грамадзянскія / палітычныя ўстаноўкі**

### УПЛЫЎ ЕГУ НА ГРАМАДЗЯНСКІЯ / ПАЛІТЫЧНЫЯ ЎСТАНОЎКІ СТУДЭНТАЎ

У рамках праведзенага даследавання было важна выявіць ролю ўніверсітэта ў фарміраванні грамадзянска-палітычнай актыўнасці і, у прыватнасці, адпаведных установак. Адказы студэнтаў на пытанне пра тое, ці аказаў ЕГУ ўплыў на іх грамадзянска-палітычныя ўстаноўкі, падзяліліся 50% на 50%. Падобнае размеркаванне дазваляе зрабіць выснову, што, на думку беларускіх студэнтаў, універсітэт (ЕГУ) аказвае сярэднюю ступень уплыву на грамадзянскія

і палітычныя ўстаноўкі, бо гэты ўплыў не перавышае 50%.

Таксама студэнты ацэньвалі і тое, праз якія складнікі навучальнай і пазанавучальнай дзейнасці ўніверсітэт уплывае на іх грамадзянска-палітычныя ўстаноўкі. Найбольшы ўплыў на іх грамадзянска-палітычныя ўстаноўкі, паводле дадзеных, аказваюць: агульнаўніверсітэцкія курсы (49,5%), выкладчыкі і іх прафесійная дзейнасць (48,9%), а таксама курсы ў рамках праграм навучання (45,6%) (гл. Дыяграму 3).




**Дыяграма 3: Ацэньванне студэнтамі кампанентаў акадэмічнай і пазаакадэмічнай дзейнасці, якія ўплываюць на іх грамадзянскія / палітычныя ўстаноўкі**

ВЫВУЧЭННЕ ПАЛІТЫЧНАЙ САЦЫЯЛІЗАЦЫІ БЕЛАРУСКІХ СТУДЭНТАЎ

Палітычная сацыялізацыя з’яўляецца дастаткова складаным і бесперапынным працэсам, у якім бярэ ўдзел мноства агентаў, такіх, як сям’я, адукацыйныя інстытуты, блізкае асяроддзе, палітычныя партыі і г.д. Аналіз грамадзянска-палітычнай актыўнасці моладзі ў кантэксце сацыяльна-палітычнай сферы Беларусі з’яўляецца асабліва актуальным. Гэта, перадусім, абумоўлена праблемамі палітычнай сацыялізацыі беларускай моладзі, якая пераважна прадстаўлена студэнтамі. Разам з тым, даследаванняў дадзенай праблемы амаль не праводзіцца. Аднымі з нешматлікіх прац у дадзеным кірунку былі сацыялагічныя даследаванні, праведзеныя ў БДПУ ім. М. Танка і БДУ ў 2003 г. і 2006 г.

У іх былі выяўлены наступныя праблемы палітычнай сацыялізацыі студэнтаў дадзеных універсітэтаў: 1) студэнты выказваюць нізкую ступень даверу да такіх дзяржаўных інстытутаў, як Нацыянальны сход і Савет Міністраў, а таксама не выказваюць цікавасці да дзейнасці мясцовых і вышэйшых органаў улады (Канапацкі 2004: 34); 2) больш за палову студэнтаў не валодаюць ведамі пра палітычную сферу Беларусі. Так, большасць апытаных студэнтаў БДУ

не змаглі назваць ніводнай палітычнай партыі (Козыренко 2008: 205). Вынікам адсутнасці цікавасці да палітычнай сферы Беларусі і адсутнасці даверу да палітычных інстытутаў улады з'яўляецца нявызначанасць палітычных поглядаў беларускай моладзі і адсутнасць палітычных арыентацый. У сваю чаргу, у дачыненні да агентаў палітычнай сацыялізацыі адзначалася, што шмат у чым прычынай такога ўзроўню палітычнай актыўнасці беларускіх студэнтаў з'яўляецца "нестабільнасць інстытута сям'і, камерцыялізацыя ўсіх звёнаў сістэмы адукацыі, якая робіцца сэрвісна арыентаванай сферай дзейнасці, а не галоўнай формай трансляцыі культуры падрастаючым пакаленням" (Козыренко 2008: 205).

Улічваючы ўсё вышэйадзначанае, можна зрабіць выснову, што беларускае студэнцтва, якое навучаецца ва ўніверсітэтах Беларусі, з'яўляецца пераважна пасіўна арыентаваным у дачыненні да грамадзянска-палітычнай сферы. Важна адзначыць, што ў гэтых даследаваннях не вызначаецца важная роля вышэйшых адукацыйных інстытутаў, якія маглі б забяспечыць базавыя веды пра палітычную сістэму Беларусі, пра дзейнасць і ролю палітычных партый, пра патрэбныя арыентацыі і ўстаноўкі і г.д. Відавочна, што праблема вывучэння грамадзянска-палітчыных установак студэнтаў беларускіх ВНУ патрабуе большай увагі.

У сваю чаргу, аналіз ЕГУ – як альтэрнатыўнага дзяржаўным у палітычнай сацыялізацыі агента – падаецца важным, бо яго дзейнасць перадусім накіравана на беларускую моладзь. На падставе атрыманых дадзеных, можна адзначыць, што ўніверсітэт (ЕГУ) не з'яўляецца галоўным агентам палітычнай сацыялізацыі, які аказвае ўплыў на грамадзянска-палітычную актыўнасць студэнтаў. У адпаведным ранжаванні ён быў названы трэцім пасля СМІ і сям'і. Разам з тым, універсітэт быў адзначаны важнейшым за блізкае асяроддзе, царкву і школу. Уплыў ЕГУ на грамадзянска-палітычныя ўстаноўкі студэнтаў мае сярэднюю ступень, аднак такі ўплыў мае месца, што адзначылі 50% апытаных студэнтаў. Дадзены ўплыў ажыццяўляецца пераважна праз адукацыйны працэс, што выражаецца ў прафесійнай дзейнасці выкладчыкаў універсітэта, а таксама навучальных курсах у рамках праграм навучання студэнтаў.

## ВЫСНОВЫ

Адзін з важных момантаў уплыву ЕГУ на палітычную актыўнасць студэнтаў выражаецца ў прапанове патрэбных ведаў пра палітычную сферу. Так, згодна з меркаваннем большасці студэнтаў (60%), універсітэт дае патрэбныя веды для разумення сацыяльна-палітычных працэсаў у Беларусі і ў свеце.

Аналіз уплыву ўнутрыўніверсітэцкага асяроддзя на грамадзянска-палітычную актыўнасць студэнтаў быў заснаваны на меркаванні, што ўзровень студэнцкай актыўнасці ўнутры ўніверсітэта можа патэнцыйна супадаць з узроўнем грамадзянска-палітычнай актыўнасці. У сувязі з гэтым важна адзначыць, што фактычна ўзроўні студэнцкай і грамадзянска-палітычнай актыўнасці супадалі. Так, у цэлым студэнты ЕГУ маюць сярэдні ўзровень грамадзянска-палітычнай актыўнасці. З атрыманых дадзеных вынікае, што ў найбольшай ступені палітычная актыўнасць у студэнтаў ЕГУ выяўляецца ў выглядзе зацікаўленасці інфармацыяй пра сацыяльна-палітычную сферу (74%). У сваю чаргу, у сярэдняй ступені грамадзянска-палітычная актыўнасць выяўляецца ва ўдзеле ў палітычных мерапрыемствах

(34%). Пераважна такі ўдзел з'яўляецца неканвенцыйным і выражаецца ва ўдзеле ў мітынгах і шэсцях (20%). І максімальна нізкая праява актыўнасці зафіксавана па такіх паказніках, як прынятце ўдзелу ў грамадскіх і / ці палітычных ініцыятывах / аб'яднаннях (14%).

## КРЫНІЦЫ


*1. Европейский гуманитарный университет (2014) Статут общественного учреждения "Европейский гуманитарный университет". Даступна па спасылцы: http://www.ehu.lt/files/Ru_EHU%20Statutes_Final%202014%2009%2023%20v1.pdf (Дата звароту: 7 снежня 2015 г.).*

*2. Канапацкий М., Красюк В., Шумило Н. (2004) Политическое сознание студенческой молодежи и роль молодежной субкультуры в его формировании, Минск: БГПУ им. М. Танка.*

*3. Козыренко Н. (2008) Специфика политической социализации студенческой молодежи Республики Беларусь. Даступна па спасылцы: http://www.pac.by/dfiles/001326_808743_1.pdf (Дата звароту: 10 мая 2015 г.).*

*4. Almond G., Verba S. (eds.) (1980) The Civic Culture Revisited. Boston: Little, Brown & Co.*

*5. Almond G., Powell B., Russell Jr (2007) Comparative Politics Today. A World View. London: Longman.*

# ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ УЗРОЎНЮ ГЕНДАРНАЙ РОЎНАСЦІ ФРАНЦЫІ, ЛІТВЫ І БЕЛАРУСІ

***Марціновіч Ганна*** бакалаўр палітычных навук (ЕГУ).

***Анатацыя.*** Аб’ектам даследавання з’яўляецца гендарная роўнасць у сферы палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага жыцця Францыі, Літвы і Беларусі.

Мэта – прааналізаваць узровень фактычнай гендарнай роўнасці ў даследаваных дзяржавах, выкарыстоўваючы камбінаваныя гендарна-адчувальныя індыкатары; вызначыць, адлюстроўвае сапраўдную сітуацыю прадстаўленая індэксам дынаміка ці не.
У працэсе аналізу выкарыстоўваецца камбінацыя метадаў, сукупнасць якіх можна вызначыць як ацэначнае даследаванне (evaluation research). Такая метадалогія часта выкарыстоўваецца ў аналізе палітыкі (policy), дзе неабходна правесці параўнальнае ацэньванне.

Пасля аналізу кожнага індыкатара, прадстаўленага ў індэксе Сусветнага эканамічнага форума, а таксама невытлумачальнай дынамікі ўнутры яго, становіцца зразумела, што колькасных дадзеных з даследаваных СЭФ галін не дастаткова для ацэнкі фактычнага ўзроўню гендарнай роўнасці ў пэўнай дзяржаве. Для ліквідацыі прабелаў уводзіцца шэраг гендарна-адчувальных індыкатараў і праз іх прызму аналізуецца палітыка гендарнай роўнасці Францыі, Літвы і Беларусі.

Вынікі даследавання паказалі, што Францыя знаходзіцца на мноства прыступак вышэй за Літву і Беларусь у пытаннях гендарнай роўнасці, як у 2013 годзе, так і на сённяшні дзень. Гэта значыць, што індэкс гендарнай роўнасці не з’яўляецца валідным і яго дадзеныя не адлюстроўваюць рэчаіснасці. Беларусь, хоць і мае шэраг падобных рысаў з сітуацыяй у Літоўскай Рэспубліцы, усё ж адстае ад апошняй па некаторых пытаннях. У якасці найбольш праблемных галін вылучаюцца рэпрадуктыўная праца і пытанні прастытуцыі.

Артыкул можа быць карысны як даследчыкам, якія займаюцца пытаннямі гендарнай роўнасці, так і ўдзельнікам працэсу прыняцця палітычных рашэнняў. Таксама будзе цікавы для тых, хто лічыць неабходным укараненне гендарнага падыходу ва ўсіх сферах сацыяльнага жыцця.

***Ключавыя словы:*** *гендарная роўнасць, гендарная палітыка, дзяржаўнае рэгуляванне, працэсы грамадскіх трансфармацый, дыскрымінацыйныя практыкі.*

# УВОДЗІНЫ

Штогод шматлікія даследчыя цэнтры публікуюць рэйтынг дзяржаў, пабудаваны ў адпаведнасці з індэксам гендарнай роўнасці. Рэйтынг Сусветнага эканамічнага форуму ўключае 136 дзяржаў. Беларусь, у сваю чаргу, яшчэ ні разу не індэксавалася па пытанні гендарнай роўнасці. Аднак ці дае індэксаванне паўнавартаснае ўяўленне пра тое, наколькі дзяржава набліжана да фактычнай гендарнай роўнасці?

Першы графік, які адлюстроўвае значны рост індэксаваных паказчыкаў для Францыі і спад для Літвы, створаны на падставе рэйтынгу СЭФ за 2010 – 2014 год і дэманструе вельмі моцную дынаміку. Такія моцныя скокі, у тэорыі, могуць адбывацца толькі па прычыне прыняцця якіх-небудзь эфектыўных дзяржаўных мер у галіне гендарнай палітыкі, аднак ні ў Літве, якая страціла за год 16 пазіцый, ні ў Францыі, якая набрала амаль удвая больш, гендарнай палітыцы не надавалася нейкай асаблівa істотнай увагі ў прадстаўлены перыяд, і заканадаўства не змянялася таксама.

Падрабязны аналіз індэксаваных індыкатараў, а таксама аналіз самой гендарнай палітыкі дазволіць адказаць на пытанне, ці можна выкарыстоўваць індэкс гендарнай роўнасці для ацэнкі фактычнай сітуацыі гендарнай роўнасці ў даследаванай дзяржаве, і якія дадатковыя індыкатары варта выкарыстоўваць для даследаванняў.




**Малюнак 1. Параўнальны графік па індэксе гендарнай роўнасці (СЭФ)**

Трэба адзначыць, што пры разліку індэкса пад паняццем “гендарная роўнасць” разумеецца “гендарна-бінарная грамадская мадэль”. Было б памылкай разумець пад гендарнай роўнасцю роўнасць толькі мужчын і жанчын, аднак у дадзеным кантэксце, колькасна аналізуючы глабальныя праблемы, даводзіцца дзяліць соцыум на дзве гамагенныя групы.

Пры разліку індэкса гендарнай роўнасці вывучаюцца чатыры галіны сацыяльнага жыцця, кожная з якіх падзяляецца на некалькі паказчыкаў. Больш падрабязныя дадзеныя па паказчыках выкарыстаны для складання рэйтынгу, прыведзенага ніжэй.

**Табліца 1. Паказчыкі, якія выкарыстоўваюцца пры складанні індэкса гендарнай роўнасці.**

| Галіна | Паказчык |
|---|---|
| Эканамічная актыўнасць | Суадносіны ўзроўню занятасці мужчын і жанчын; |
| | Суадносіны выплат мужчынам і жанчынам за аднолькавую працу; |
| | Суадносіны заробку мужчын і жанчын; |
| | Суадносіны мужчын і жанчын у складзе заканадаўцаў, чыноўнікаў і менеджараў вышэйшага звяна; |
| Адукацыя | Суадносіны ўзроўню пісьменнасці мужчын і жанчын; |
| | Суадносіны ахопу мужчын і жанчын пачатковай адукацыяй; |
| | Суадносіны ахопу мужчын і жанчын сярэдняй адукацыяй; |
| | Суадносіны ахопу мужчын і жанчын вышэйшай адукацыяй; |
| Здароўе і працягласць жыцця | Суадносіны працягласці здаровага жыцця мужчын і жанчын; |
| | Суадносіны мужчын і жанчын пры нараджэнні; |
| Удзел у палітыцы | Суадносіны мужчын і жанчын у парламенце; |
| | Суадносіны мужчын і жанчын на міністэрскіх пасадах; |
| | Колькасць гадоў знаходжання жанчын на чале дзяржавы (за апошнія 50 гадоў) |

Праблема выкарыстаных паказчыкаў заключаецца ў тым, што колькасныя дадзеныя не могуць ахапіць і індэксаваць мноства інфармацыі, важнай пры ацэнцы сапраўднага ўзроўню гендарнай роўнасці ў асобна ўзятай дзяржаве. Напрыклад, галіна адукацыі, даследаваная выключна колькаснымі метадамі, толькі ў невялікай ступені здольна адлюстраваць рэальнае становішча рэчаў. Нават калі агульная тэндэнцыя ахопу жанчын вышэйшай адукацыяй будзе станоўчай, можа захоўвацца моцная дыскрымінацыя ў дыферэнцыяцыі сфер адукацыі, падзел іх на мужчынскія і жаночыя. У Беларусі, напрыклад, Акадэмія МУС для мужчын і жанчын праводзіць розныя конкурсы, пры якіх уводзяцца нормы балаў для паступлення. Так, у 2015 годзе, каб стаць курсантам/курсанткай крымінальна-выканаўчага факультэта па спецыяльнасці “правазнаўства”, юнакам дастаткова было набраць 175 балаў, а дзяўчатам 336 (Саламаціна 2016). Асобна трэба разглядаць праблемы працэсу навучання ў вышэйшых навучальных установах, дзе студэнткі сутыкаюцца з шэрагам дыскрымінацыйных практык – ад недаацэньвання сваёй дзейнасці да сэксуальных дамаганняў.

Галіна “здароўе і працягласць жыцця” пры разліку індэкса прадстаўлена ўсяго двума паказчыкамі – суадносінамі працягласці здаровага жыцця мужчын і жанчын і суадносінамі палоў пры нараджэнні. Вывучэнне сітуацыі, што тычыцца жаночага здароўя і працягласці жыцця, могуць істотна паўплываць на павышэнне якасці жыцця жанчын, аднак статыстычных дадзеных усяго па дзвюх катэгорыях відавочна не дастаткова для паўнавартаснага даследавання ў дадзенай галіне. Так, пры разліку індэкса не ўлічваецца спецыфіка медыцынскіх установаў, з якімі сутыкаюцца жанчыны на працягу жыцця. Гаворка ідзе пра ўстановы, якія займаюцца рэпрадуктыўным здароўем жанчын. Гэта азначае, што такое важнае пытанне, як дзетараджэнне не займае ніякага месца пры разліку індэкса, негледзячы

на тое, што для многіх дзяржаў застаецца сур’ёзнай праблемай смерць жанчын падчас родаў ці роды ў самым пачатку дзетароднага ўзросту (12-14 гадоў) як наступства ранніх гвалтоўных шлюбаў, распаўсюджаных у такіх дзяржавах, як Індыя, Ірак, Сірыя, Афганістан, Йемен і іншыя.

Эканамічная галіна, у сваю чаргу, не закранае праблемаў “другой змены”, якая заключаецца ў бясплатнай хатняй працы, што традыцыйна выконваецца жанчынамі. А адна з самых важных галін – удзел у палітыцы, уключае ў сябе такі неадназначны паказчык, як “колькасць гадоў знаходжання жанчын на чале дзяржавы”. Ён мае адлюстраваць ролю жанчын у кіраванні дзяржавай, аднак гэты паказчык нават з высокім балам не паляпшае фактычнага становішча жанчын у краіне. Калі дзяржава мае не прэзідэнцкую форму кіравання, то прэзідэнт мае слабы ўплыў на рэалізуемы палітычны курс. Дый нават калі форма прэзідэнцкая, гэта не значыць, што пытанням гендарнай палітыкі будзе надавацца больш увагі, чым надавалася раней. Такім чынам, факт, што прэзідэнцкі пост займае жанчына, мае сімвалічнае значэнне і вельмі ўскосна здольны паўплываць на патрыярхальныя культурныя ўстаноўкі, дзе жанчынам па-ранейшаму зачынены доступ да высокіх кіраўнічых пасад. У Літоўскай Рэспубліцы Даля Грыбаўскайтэ займае пасаду прэзідэнткі ўжо другі электаральны перыяд, аднак істотных змен або ўзмацнення гендарнай палітыкі за гэты перыяд не адбылося. А прадстаўніцтва жанчын у парламенце захоўваецца на ўзроўні 28-32%.

Такім чынам, паказчыкі, якія выкарыстоўваюцца для разліку індэкса, не могуць адлюстраваць фактычны ўзровень гендарнай роўнасці, і для складання паўнавартаснай карціны ў любой даследаванай дзяржаве неабходна выкарыстоўваць шэраг дадатковых паказчыкаў і ўводзіць якасныя характарыстыкі.

Для паглыбленага аналізу былі адабраны такія гендарна-адчувальныя індыкатары, як шлюб і шлюбнае заканадаўства, рэпрадуктыўная праца і догляд за дзецьмі, дзяржаўнае рэгуляванне пытанняў прастытуцыі.

## УСТУПЛЕННЕ Ў ШЛЮБ І ШЛЮБНАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА

Традыцыйны патрыярхальны ўклад мяркуе такое размеркаванне роляў у сям’і, пры якім заключэнне шлюбу спрыяе кар’ернаму росту мужчын, але ўскладае дадатковыя абавязкі на жанчын. Абавязкі заключаюцца ў вядзенні хатняй гаспадаркі і абслугоўванні мужчыны. Дадзеная сфера занятасці называецца “ружовым сектарам” эканомікі і вырабляе ў сярэднім больш за 30% ВУП. “Ружовы сектар” не аплачваецца і перашкаджае кар’ернаму прасоўванню праз істотнае скарачэнне часу, адведзенага на прафесійнае развіццё. Акрамя таго, неабходна памятаць пра падзел сфераў на мужчынскія і жаночыя, існаванне “шкляной” столі і розніцы ў аплаце працы, заснаванай толькі на палавым адрозненні.

Усе гэтыя абставіны ствараюць становішча, пры якім уступленне ў шлюб ужо паўналетніх, але эканамічна несамастойных, правакуе сітуацыі эканамічнага гвалту ў сямейных адносінах. Паралельна мноства абавязкаў па вядзенні хатняй гаспадаркі і выхаванні дзяцей у спалучэнні з прафесійнай занятасцю істотна звужаюць сферу сацыяльных зносін жанчын. Новыя сацыяльныя даследаванні пацвярджаюць гіпотэзы аб моцнай карэляцыі паміж узростам уступлення ў шлюб і хатнім эканамічным і псіхалагічным гвалтам, пад які падпадаюць пераважна жанчыны. Даследчыкі адзначаюць, што заканадаўчая база ў цэлым менш спрыяе абароне правоў жанчын у шлюбе.

Усё вышэйзгаданае разам са слабым рэгуляваннем гендарных праблем дзяржавай ствараюць “жаночы твар” беднасці. Другасны аналіз даследаванняў дэманструе, што жанчыны пенсійнага ўзросту – самая ўразлівая катэгорыя насельніцтва ў Літве.

Асобнае і вельмі вострае пытанне, звязанае з сямейным заканадаўствам, тычыцца праблем хатняга фізічнага гвалту. Заканадаўчая база па гэтым пытанні на даволі высокім узроўні ўрэгулявана як Францыяй, так і Літвой яшчэ да даследаванага перыяду.

Так, у Літоўскай Рэспубліцы, у адпаведнасці з законам аб хатнім гвалце, любы грамадзянін можа паведаміць аб магчымым выпадку гвалту ў сям’і, следства можа быць пачата па заяве сведак, а не толькі патэнцыйнай ахвяры. Дадзеныя папраўкі абараняюць жанчын, што знаходзяцца ў шлюбе або пражываюць са сваім партнёрам, больш, чым папярэдняе заканадаўства. На дадзены момант вядуцца следствы па справах, заведзеных без удзелу пацярпелых ад гвалту ў сям’і. Гэта ставарае рэальнае поле для вырашэння праблемы, бо ахвяры часта запалоханыя, акрамя фізічнага яны зазнаюць гэтак жа эмацыйны і эканамічны гвалт і гадамі перабываюць ў стане “стакгольмскага сіндрому”.

У Беларусі заканадаўчая база, звязаная з хатнім гвалтам, істотна слабейшая, а дзеючы цяпер закон з’явіўся толькі ў 2014 годзе. Да прыняцця новага законапраекта дзейнічала старая версія, прынятая ў 2008, аднак яна з’яўлялася вельмі неэфектыўнай. І нават пасля ўвядзення паправак толькі сама пацярпелая / -ы можа вылучыць абвінавачанне крыўдзіцелю, што, на мой погляд, з’яўляецца слабым бокам па ўжо згаданых вышэй прычынах. Да моцнага боку адносяцца пункты, якія з’явіліся ў заканадаўчай базе дзякуючы кансультацыям з UNFPA (United Nations Population Fund – бел.: Фонд ААН у галіне народанасельніцтва). Яны ўключаюць у сябе некалькі забаронаў, прадпісаных агрэсару:

• прадпрымаць спробы высветліць месцазнаходжанне пацярпелай / -ага ад гвалту ў сям’і;

• наведваць месцы знаходжання пацярпелай / -ага ад гвалту ў сям’і;

• мець зносіны з пацярпелай / -ым, у тым ліку праз тэлефон і інтэрнэт.

На дадзены момант практычна немагчыма прааналізаваць эфектыўнасць палепшанага заканадаўства, бо даступныя дадзеныя, напрыклад, колькасць заяў аб хатнім гвалце, колькасць распачатых крымінальных спраў і іншае, не адлюстроўваюць рэчаіснасці. У першую чаргу, гэта звязана з моцнай розніцай паміж агульнай колькасцю выпадкаў хатняга гвалту і выпадкаў, пра якія было заяўлена. Жанчына можа не звярнуцца ў праваахоўныя органы па дапамогу па мностве прычын. Асноўнай перашкодай з’яўляецца сацыякультурны асяродак: патрыярхальныя традыцыі прымушаюць частку насельніцтва лічыць, што хатні гвалт з’яўляецца нормай. Не менш важнае месца займае апісаны раней эканамічны гвалт, бо, разарваўшы адносіны з агрэсарам, жанчына часта губляе сродкі для існавання. Аднак сітуацыя ў Беларусі адрозніваецца станоўчай тэндэнцыяй у дачыненні да росту сярэдняга веку ўступлення ў шлюб. У пачатку 2000-х гэтыя лічбы складалі 23 гады, а да 2014 года ўзрост уступлення жанчынаў у шлюб дасягнуў 25,3 гадоў.

## РЭПРАДУКТЫЎНАЯ ПРАЦА І АДПАЧЫНАК ПА ДОГЛЯДЗЕ ЗА ДЗІЦЕМ

На сённяшні дзень працэс выношвання эмбрыёна і дзетараджэнне па-ранейшаму не

ўспрымаецца як праца, а хутчэй як абавязак жанчыны. Што тычыцца першаснага сыходу ў адпачынак і выхавання дзіцяці, то асноўная частка абавязкаў зноў перакладаецца на жанчын. У Еўрапейскім Саюзе дадзенае пытанне рэгулюецца ўжо і наднацыянальнымі органамі, а таму як у Літве, так і ў Францыі дзейнічаюць законы, якія прыцягваюць мужчын да выхавання дзяцей і якія імкнуцца палепшыць умовы знаходжання ў дэкрэтным адпачынку аднаго з бацькоў. Ужо некалькі гадоў у Францыі дзейнічае асаблівы від страхавання для мацярынскага / бацькоўскага адпачынку. Калі адзін з бацькоў вырашыць узяць адпачынак па доглядзе за дзіцем на два гады, дзяржава абавязана выплачваць 70% ад заробку ў першы год і 40% у другі год. Калі маці ці бацька бярэ адзін год адпачынку па доглядзе за дзіцем, то дзяржава выплаціць 100% ад заробку. Страхаванне бацькоўскага адпачынку не можа перавышаць сярэдняга заробку маці ці бацькі за папярэднія чатыры гады. Дадзены від страхавання і закон па прыцягненні бацькоў да выхавання дзяцей стварыў сітуацыю амаль што раўнамернага размеркавання бацькоўскага адпачынку паміж мужчынамі і жанчынамі.

У Літве ж размеркаванне адпачынку застаецца вельмі нераўнамерным – у суадносінах 93% жанчын да 7% мужчын, нягледзячы на тое, што ў Літве дзейнічае заканадаўства, аналагічнае французскаму: у першы год выплачваецца 70 адсоткаў ад заробку, а ў другі 40.У Беларусі сітуацыя з адпачынкам па доглядзе за дзіцем падобная да літоўскай, што тычыцца адсоткавых суадносін мужчын і жанчын, якія сыходзяць у дэкрэтны адпачынак. Статыстычныя дадзеныя за 2014 год адлюстроўваюць суадносіны 98% да 2%. Але ў Беларусі на працягу дэкрэтнага адпачынку аднаму з бацькоў выплачваецца стандартная грашовая дапамога, а працягласць адпачынку складае да 3-х гадоў. І паколькі сярэдні ўзровень заробку мужчын вышэйшы, чым у жанчын, нежаданне губляць асноўную фінансавую крыніцу сям'і часткова стварае такі моцны перакос. У сваю чаргу, жанчыны, якія сышлі ў дэкрэтны адпачынак, амаль што цалкам застаюцца без прыбыткаў, што асабліва моцна ўплывае на такую з'яву, як эканамічны гвалт. У 2014 годзе дапамога на першае дзіця склала менш за 210 даляраў (на другое на 20 даляраў больш), у той час як сярэдні заробак па краіне за гэты ж год складаў 595.

Яшчэ адным вельмі важным момантам з'яўляецца тое, што ў два адсоткі мужчын, якія тэарэтычна даглядаюць дзяцей, уваходзяць таксама і дзядулі, на якіх афармляецца дэкрэтны адпачынак. Але на практыцы гэта амаль заўсёды не так: абодва бацькі працягваюць працаваць, і да ўжо згаданай жаночай "другой змены" дадаецца яшчэ і догляд за дзіцем, што толькі пагаршае становішча жанчын.

## ДЗЯРЖАЎНЫ ЎДЗЕЛ У ВЫРАШЭННІ ПРАБЛЕМ ПРАСТЫТУЦЫІ

Для вырашэння праблемы прастытуцыі патрэбны эфектыўны механізм дзяржаўнага рэгулявання, звязаны з заканадаўчай абаронай жанчын, што займаюцца прастытуцыяй. Відавочна, што выключна дзяржаўным рэгуляваннем гэтая праблема не вырашаецца, аднак ўсталяванне высокага ўзроўню дзяржаўнай адказнасці за прастытуцыйныя практыкі з'яўляецца важным крокам на шляху яе рашэння.

На дадзены момант многія дзяржавы выкарыстоўваюць такі неэфектыўны і спараджаючы яшчэ большую залежнасць жанчын спосаб рэгулявання, як крыміналізацыя прастытуцыі.

Жанчыны, што займаюцца прастытуцыяй, прыцягваюцца да адказнасьці за тое, што вымушаныя такім чынам здабываць сродкі для існавання. Іншая мадэль умоўнага вырашэння праблемы заключаецца ў дэкрыміналізацыі прастытуцыі. Дэкрыміналізацыя без прызнання прастытуцыі формай гендарнага гвалту і ўкаранення метадаў шматузроўневага процідзеяння дзяржавы жанчынам, што займаюцца прастытуцыяй, толькі палягчае працу арганізацыям, якія займаюцца задавальненнем попыту на прастытуцыю. Можа таксама выкарыстоўвацца пераходная форма ад дэкрыміналізацыі да легалізацыі.

Некаторыя дзяржавы Еўрапейскага Саюза прайшлі праз такую форму дзяржаўнага рэгулявання, як легалізацыя прастытуцыі, і частка з іх адмовілася ад яе з-за адсутнасці механізмаў рэгулявання дадзенай галіны і магчымасці паўнавартаснай абароны людзей, працуючых у ёй. Легалізацыя прастытуцыі выклікае працэс пашырэння сэкс-індустрыі, прычым наколькі добраахвотным з’яўляецца гэты працэс, прасачыць амаль што немагчыма. Так, за 10 гадоў легалізацыі прастытуцыі сэкс-індустрыя ў Нідэрландах вырасла на 25%. Пры легалізацыі прастытуцыі пашыраюцца таксама і сумежныя галіны, такія, як парнаграфія, стрыптыз-клубы, сэкс па тэлефоне і іншае. Ужываючы такі спосаб рэгулявання, дзяржава выкарыстоўвае частку свайго насельніцтва як тавар, а сутэнёры становіцца прадпрымальнікамі. Легалізацыя прастытуцыі выключае магчымасць дасягнення гендарнай роўнасці якраз праз успрыманне паловы грамадства ў якасці тавару. Акрамя таго, абвяшчаючы прастытуцыю “працай”, дзяржава маскіруе прыгнечанае эканамічнае становішча жанчын у краіне і не імкнецца да выпрацоўкі альтэрнатыў для іх эканамічнага дабрабыту.

Апошняй формай дзяржаўнага рэгулявання праблем прастытуцыі з’яўляецца дзяржаўная палітыка, якая крыміналізуе кліента. Гэта адзіная мадэль, якая разглядае прастытуцыю як адну з формаў гвалту і якая працуе з першапрычынай – попытам. Законы аб крыміналізацыі кліента на дадзены момант дзейнічаюць у Швецыі, Нарвегіі, Ісландыі і з 2013 года ў Францыі.

Жанчыны, зацягнутыя ў прастытуцыю, пры такім падыходзе карыстаюцца шэрагам спе-цыяльных ахоўных мер і атрымліваюць дапамогу ў рэабілітацыі. Крыміналізацыя кліентаў уключае ў сябе штрафы і турэмныя тэрміны, прадугледжаныя за спробу скарыстацца сэксуальнымі паслугамі. Такія меры абмяжоўваюць пакупніцкія магчымасці, зніжаюць матывацыю кліентаў і робяць максімальна праблемнай дзейнасць сутэнёраў. Як і ў пытанні ўступлення ў шлюб, сітуацыя Беларусі максімальна падобная да Літвы: у абедзвюх дзяржавах спосабам дзяржаўнага рэгулявання праблем прастытуцыі з’яўляецца яе крыміналізацыя. У дадзеным выпадку жанчыны, што займаюцца прастытуцыяй, цалкам не абароненыя нават ад фізічнага і сэксуальнага гвалту, з якім рэгулярна сутыкаюцца і нясуць адміністрацыйную адказнасць за спосаб заробку, да якога былі вымушаныя звярнуцца.

**Табліца 2. Тыпы дзяржаўнага рэгулявання прастытуцыі**

| | Крыміналізацыя | Дэкры-міналізацыя | Пераходная форма | Легалізацыя | Крыміналізацыя кліента |
|---|---|---|---|---|---|
| Францыя | - | - | - | + (да 2013) | + (на дадзены момант) |
| Літва | + - | + - | - | - | - |
| Беларусь | + | - | - | - | - |

## ВЫНІКІ

Аналіз паказчыкаў, якія выкарыстоўваюцца пры пабудове індэкса гендарнай роўнасці, выявіў шэраг сур'ёзных недахопаў, з-за якіх вынік індэксавання не можа лічыцца валідным. Для даследавання фактычнага ўзроўню гендарнай роўнасці нельга абмяжоўвацца толькі колькаснымі дадзенымі, інакш робіцца вельмі верагодным узнікненне такой дынамікі, што назіраецца ў параўнальным аналізе Францыі і Літвы, але не адпавядае рэчаіснасці. Аналіз дадатковых гендарна-адчувальных індыкатараў дэманструе, колькі важных галін застаецца не закранутымі і наколькі неабходнае выкарыстанне якасных метадаў даследавання.

Вынікі даследавання паказалі, што Францыя знаходзіцца на мноства прыступак вышэй за Літву і Беларусь у пытаннях гендарнай роўнасці, як у 2013 годзе, так і на сённяшні дзень. Гэта значыць, што разгледжаныя дадатковыя гендарна-адчувальныя індыкатары пацвердзілі гіпотэзу аб невалíднасці індэксу. Беларусь хоць і мае шэраг падобных рысаў з сітуацыяй у Літоўскай Рэспубліцы, усё ж адстае ад апошняй па мностве пытанняў.

У адрозненне ад Літвы і Францыі, Беларусь не мае асобнага ведамства, якое б займалася пытаннямі, што традыцыйна ўваходзяць у спіс напрамкаў гендарнай палітыкі. Гэта стварае сітуацыю мінімальнага маніторынгу становішча жанчын з боку дзяржавы. І хоць дзякуючы такім арганізацыям, як ЮНФПА, заканадаўства паступова змяняецца, у Беларусі па-ранейшаму афіцыйна існуе спіс забароненых для жанчын прафесій, абмежаванні пры паступленні на "мужчынскія" спецыяльнасці, пакаранні для жанчын, што займаюцца прастытуцыяй, "другая" і "трэцяя" змены ды яшчэ дзясяткі складаных пытанняў, якія маюць быць прааналізаваны.

## КРЫНІЦЫ:


*1. Брайсон В. (2001) Политическая теория феминизма. Введение. Москва: Идея-Пресс.*

*2. Горшкова И., Шурыгина И. (2003) Экономическое насилие. Насилие над женами в российских семьях. Даступна па спасылцы: http://www.owl.ru/rights/no_violence/p23-35.pdf (Дата звароту: 2 сакавіка 2015 г.)*

*3. ООН (2014) Индекс гендерного равенства в Европейском союзе: надежный инструмент для формирования политики. Даступна па спасылцы: http://www.unece.org/fileadmin/DAM/stats/documents/ece/ces/ge.30/2014/mtg_1/12_EIGE_R_full.pdf (Дата звароту: 28 сакавіка 2015 г.)*

*4. ООН (2013) Институциональные аспекты гендерной политики ЕС. Даступна па спасылцы: http://cyberleninka.ru/article/n/gendernaya-politika-v-evropeyskom-soyuzeinstitutsionalnyy-aspekt-1952-2002-gody (Дата звароту: 5 красавіка 2015 г.)*

*5. Статинфо (2014) Инфографика: средний возраст матери. Даступна па спасылцы: http://statinfo.biz/Geomap.aspx?region=world&act=2024&lang=1 (Дата звароту: 25 лютага 2015 г.)*

*6. Калабихина И. (2011) Почему важно развивать институты гендерного равенства в России. Научные исследования экономического факультета, 1: 149-176.*

*7. Гардинер Ф. (2000) Обеспечение равенства полов: политика стран Западной Европы, Москва: Идея-Пресс.*

*8. Рэймон Дж. (2011) Проблема продажи людей и проституция. Даступна па спасылцы: http://www.womencw.ru/traffic/chapter02.html (Дата звароту: 9 сакавіка 2015 г.)*

*9. Демоскоп (2014) Средний возраст женщин при вступлении в первый брак, 1960-2012. Даступна па спасылцы: http://demoscope.ru/weekly/app/app4019.php (Дата звароту: 2 сакавіка 2015 г.).*

10. Лизард М. (2014) Феминистская перспектива в подходе к проблеме проституции и ответственность государства за проституирующие практики в отношении женщин и детей. Даступна па спасылцы: http://womenation.org/feminist-perspective-on-prostitution/ (Дата звароту: 10 сакавіка 2015 г.)

11. OWL (2001) Руководство по гендерно-чувствительным индикаторам. Что такое гендерно-чувствительные индикаторы и почему они полезны? Даступна па спасылцы: http://www.owl.ru/canadian/gender_indicators/3.htm (Дата звароту: 10 лютага 2015 г.)

12. Bundule M. (2008) The gender challenge in research funding - assessing the European national scenes. Lithuania. Даступна па спасылцы: http://ec.europa.eu/research/science-society/document_library/pdf_06/lithuania-research-funding_en.pdf (Дата звароту: 28 сакавіка 2015 г.)

13. COE (2014) Council of Europe gender equality strategy 2014-2017. Даступна па спасылцы: http://www.coe.int/t/dghl/standardsetting/convention-violence/docs/council_of_europe_gender_equality_strategy_2014-2017.pdf (Дата звароту: 24 лютага 2015 г.).

14. COE (2010) Directorate General of Human Rights and Legal Affairs. National machinery, actions plans and gender mainstreaming in the Council of Europe member states since the 4th World Conference on Women. Даступна па спасылцы: http://www.coe.int/t/dghl/standardsetting/equality/03themes/standards-mechanisms/EG(2009)2_en.pdf (Дата звароту: 27 лютага 2015 г.).

15. Samuel H. (2013) France proposes gender equality law. Даступна па спасылцы: http://www.womenlobby.org/news/european-international-news/article/france-proposes-gender-equality?lang=en (Дата звароту: 20 сакавіка 2015 г.).

Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт з'яўляецца недзяржаўным універсітэтам у галіне "вольных навук і мастацтваў" (artes liberales) і быў заснаваны ў 1992 годзе ў Мінску. У выніку ціску на акадэмічныя свабоды ўніверсітэт быў вымушаны спыніць сваю дзейнасць у Мінску ў 2004 годзе і аднавіў працу ў Вільні (Літва). ЕГУ з'яўляецца адзіным беларускім універсітэтам, які працуе ў атмасферы сапраўдных акадэмічных свабодаў. Прыкладна 1000 беларускіх студэнтаў ЕГУ вывучаюць гуманітарныя і сацыяльныя навукі на бакалаўрскіх, магістарскіх ды доктарскіх праграмах.

Амаль 3000 чалавек скончылі ЕГУ з моманту заснавання ўніверсітэта ў 1992 годзе ў Мінску. З іх дзве траціны сталі выпускнікамі ў віленскі перыяд. Згодна з апошнім апытаннем, 62,2% выпускнікоў пастаянна жывуць у Беларусі, куды яны вярнуліся пасля завяршэння навучання ў ЕГУ. 83,3% маюць сталую працу, якая цалкам альбо часткова звязаная з кірункам навучання ва ўніверсітэце. Большасць выпускнікоў універсітэта працаўладкаваныя ў прыватным сектары (64,6%), недзяржаўных арганізацыях (17,4%), а таксама дзяржаўных установах Беларусі (10,1%).

Дэпартамент сацыяльных і палітычных навук існуе ў ЕГУ з 2009 года, калі па ініцыятыве адміністрацыі ўніверсітэта былі аб'яднаныя дэпартаменты філасофіі і палітычных навук. Дэпартамент з'яўляецца пераемнікам дзеючага ў перыяд "мінскага ЕГУ" франка-беларускага факультэта, дзе вывучаліся палітычныя навукі. Пасля пераезду ў Вільню ў працы дэпартамента (у сферы палітычных навук) у розны час прымалі ўдзел, узначальвалі і курыравалі паліталагічныя праграмы Святлана Навумава, Анатоль Круглашоў, Андрэй Казакевіч і Віктар Марціновіч.

У цяперашні час на дэпартаменце адкрытыя адна бакалаўрская і дзве магістарскія праграмы. На бакалаўрскім узроўні мы прапануем дзённую і завочную праграму "Сусветная палітыка і эканоміка" (якая стала пераемніцай ранейшай праграмы "Паліталогія і еўрапейскія даследаванні"). Гэта праграма міждысцыплінарнай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне палітычных і эканамічных навук. Праграма была створана і ажыццяўляецца ў супрацоўніцтве з Універсітэтам Вітаўта Вялікага ў Коўне (Літва). Яна рыхтуе палітолагаў, эканамістаў і прафесійных аналітыкаў, здольных кампетэнтна тлумачыць і аналізаваць, параўноўваць і ацэньваць, тэарэтычна апісваць і мадэляваць эканамічныя і палітычныя працэсы ў міжнародным і рэгіянальным кантэкстах. Выпускнікі праграмы "Сусветная палітыка і эканоміка" атрымліваюць ступень бакалаўра палітычных навук з дадатковай ступенню бакалаўра эканамічных навук. Навучальны працэс на праграме сбалансаваны паміж паліталагічнымі і эканамічнымі дысцыплінамі.

На магістарскім узроўні мы прапануем паліталагічную праграму "Публічная палітыка". Мэта магістарскай праграмы – падрыхтоўка спецыялістаў у галіне дзяржаўнага кіравання, менеджменту ў сферы грамадзянскай супольнасці, а таксама для прафесійнай дзейнасці ў міжнародных і рэгіянальных грамадскіх арганізацыях. Праграма была распрацавана сумесна з факультэтам публічнага адміністравання Лейдэнскага ўніверсітэта (Нідэрланды) і Нідэрландскім інстытутам дзяржаўнага кіравання ROI. Выпускнікі праграмы атрымліваюць ступень магістра палітычных навук.

У сферы філасофскіх і псіхалагічных даследаванняў дэпартамент прапануе

праграму “Экзістэнцыяльная псіхалогія”. Праграма ЕГУ “Экзістэнцыяльная псіхалогія” прапануе ўнікальную магчымасць атрымаць глыбокія спецыялізаваныя веды і практычныя навыкі, неабходныя для працы ў якасці экзістэнцыяльнага псіхолага. У рамках праграмы ажыццяўляецца плённае навуковае супрацоўніцтва беларускіх філосафаў і псіхолагаў з літоўскімі калегамі, аб’яднанымі вакол Інстытута гуманістычнай і экзістэнцыяльнай псіхалогіі (Бірштанас, Літва) і Цэнтра экзістэнцыяльнай тэрапіі (Вільня), а таксама Усходнееўрапейскай асацыяцыі экзістэнцыяльнай тэрапіі (Літва). Выпускнікі праграмы атрымліваюць ступень магістра псіхалогіі.

Акрамя таго на дэпартаменце дзейнічае доктарская праграма “Філасофія”.

Навучанне на бакалаўрскай пастаяннай (дзённай) форме складае 4 гады, на бакалаўрскай працяглай (завочнай) форме – 5 гадоў. Тэрмін навучання на магістарскіх праграмах складае 1,5 гады. Тэрмін навучання на доктарскай праграме складае 4 гады на пастаяннай (дзённай) форме і 1 год, калі навучанне запланаванае экстэрнам.

У асноўны педагагічны склад дэпартамента ўваходзяць: кіраўнік дэпартамента, дацэнт, PhD Андрэй Сцяпанаў, прафесарка Таццяна Шчытцова (акадэмічная кіраўніца праграмы “Экзістэнцыяльная філасофія”), дацэнт, PhD Віктар Марціновіч, лектарка, PhD Таццяна Чуліцкая, прафесар-эмерыт, кандыдат філасофскіх навук Рыгор Мінянкоў, дацэнтка, кандыдатка сацыялагічных навук Вольга Брэская, акадэмік, доктар філасофіі Анатоль Міхайлаў, PhD-кандыдат, лектар Уладзіслаў Іваноў. Сярод запрошаных выкладнікаў дэпартамента прафесар Вячаслаў Пазняк, прафесар Анатоль Круглашоў, дацэнт, кандыдат эканамічных навук Аляксандр Кавалёў, магістарка, акадэмічная кіраўніца SYMPA/BIPART Іна Рамашэўская.

За дзейнасцю і навінамі дэпартамента сацыяльных і палітычных навук можна сачыць у Інтэрнэце:

- http://www.ehu.lt/be/
- https://www.facebook.com/socpolehu/

# ФОНД КОНРАДА АДЭНАЎЭРА, ПРАДСТАЎНІЦТВА ПА БЕЛАРУСІ

Свабода, справядлівасць і салідарнасць з'яўляюцца галоўнымі прынцыпамі, якія ляжаць у аснове працы Фонда Конрада Адэнаўэра (ФКА). ФКА – гэта палітычны фонд, набліжаны да Хрысціянска-дэмакратычнага саюзу Германіі (ХДС).

У межах еўрапейскага і міжнароднага супрацоўніцтва мы прыкладаем усе намаганні, каб людзі атрымалі магчымасць жыць і развівацца ва ўмовах свабоды і годнасці. Арыентуючыся на гэтыя каштоўнасці, мы робім свой унёсак у тое, каб Германія адпавядала сваёй адказнай ролі ў свеце.

Мы заахвочваем людзей фарміраваць будучыню, абапіраючыся на гэтыя каштоўнасці. Праз больш як 80 офісаў за мяжой і праекты ў больш як 100 краінах мы робім унікальны ўнёсак у развіццё дэмакратыі, прававой дзяржавы і сацыяльнай рынкавай эканомікі. Для таго, каб садзейнічаць умацаванню міру і свабоды мы падтрымліваем пастаянны дыялог на нацыянальным і міжнародным узроўнях, а таксама абмен паміж культурамі і рэлігіямі.

Самым галоўным для нас у нашай працы з'яўляецца асоба чалавека, са сваімі адметнымі вартасцямі, са сваімі правамі і абавязкамі. Развіваючы ўстойлівую эканамічную дзейнасць, мы кіруемся перакананнем, што менавіта чалавек з'яўляецца пунктам адліку ў намаганнях па забеспячэнні сацыяльнай справядлівасці і дэмакратычнай волі. Аб'ядноўваючы людзей, якія прымаюць на сябе адказнасць у грамадстве, мы развіваем актыўныя сеткі кантактаў у палітычнай і эканамічнай сферах, а таксама ў самім грамадстве. Дзякуючы нашым палітычным ведам і ноу-хау мы дапамагаем фарміраваць працэс глабалізацыі ў больш сацыяльна справядлівым, экалагічна ўстойлівым і эканамічна эфектыўным кірунку.

Мы супрацоўнічаем з дзяржаўнымі ўстановамі, палітычнымі партыямі, грамадскімі арганізацыямі і выбранымі элітамі, ствараем трывалыя партнёрскія сувязі. У прыватнасці, мы імкнемся актывізаваць палітычнае супрацоўніцтва на нацыянальным і міжнародным узроўнях на аснове нашых каштоўнасцяў і мэтаў. Разам з нашымі партнёрамі мы робім унёсак у стварэнне міжнароднага парадку, які дазваляе кожнай краіне развівацца ва ўмовах свабоды і несці за гэта адказнасць. У цяперашні час Беларускае Прадстаўніцтва Фонда Конрада Адэнаўэра знаходзіцца ў Вільні (Літва).

Асноўнай задачай дзейнасці ФКА ў дачыненні да Беларусі з'яўляецца падтрымка тых сілаў, якія працуюць дзеля стварэння свабоднай, дэмакратычнай і прававой краіны, якая зойме сваё месца ў еўрапейскай супольнасці дзяржаў. З гэтай мэтай фонд арганізуе адукацыйныя мерапрыемствы і кансультацыі, дыялогі і інфармацыйныя праграмы ў суседніх краінах, у Германіі і ў Брусэлі.

Прадстаўніцтва ФКА па Беларусі ў Інтэрнэце:

http://kas.de/belarus

http://www.facebook.com/kasbelarus

https://twitter.com/KAS_Belarus

https://www.youtube.com/channel/UCf8Yo5qRs0DbhjmiPaQHjNQ

# ПАЛІТЫКА І ГРАМАДСТВА Ў БЕЛАРУСІ

ЗБОРНІК ПРАЦ
ВЫПУСКНІКОЎ-ПАЛІТОЛАГАЎ ЕГУ
год 2016
(выпуск 1)


Герасіменка Аляксандр
ПАЛІТЫЧНЫ ЎДЗЕЛ І ІНТЭРНЭТ-ПЛАТФОРМЫ: ЯК НОВЫЯ КАМУНІКАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ДАПАМАГАЮЦЬ БЕЛАРУСКІМ ГРАМАДСКІМ АКТЫВІСТАМ

Шапуцька Таццяна
ПАЛІТЫЧНАЯ МІФАТВОРЧАСЦЬ У БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД 1994-2010 ГГ.: ДЫСКУРС КІРУЮЧАЙ ЭЛІТЫ

Гайдук Вольга
ПАЛІТЫЧНЫЯ СВЯТЫ ЯК СПОСАБ ФАРМІРАВАННЯ ЎЯЎЛЕННЯЎ АБ НАЦЫІ І ДЗЯРЖАВЕ Ў БЕЛАРУСІ, 1996-2014 ГГ.

Масланава Дар’я
ГРАМАДЗЯНСКАЯ І ПАЛІТЫЧНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ СТУДЭНТАЎ: АНАЛІЗ НА ПРЫКЛАДЗЕ СТУДЭНТАЎ ЕГУ

Марціновіч Ганна
ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ УЗРОЎНЮ ГЕНДАРНАЙ РОЎНАСЦІ ФРАНЦЫІ, ЛІТВЫ І БЕЛАРУСІ



ЄHU
Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт

Konrad Adenauer Stiftung